Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 44 (4539) 20 лістапада 2009 г.

У нумары:

Гандлюем беларускім!
На форуме сабраліся выдаўцы, паліграфісты, распаўсюджвальнікі друку…

Стар. 3

Вызнаваць сваю веру на роднай мове

Айцец Сергій Гардун: яго пропаведзі ў храмах гучаць толькі па-беларуску.

Стар. 5

Подзвіг творцы

Алег Лойка па-свойму глянуў на постаць Уладзіміра Караткевіча.

Стар. 7

Пакуты ўзнясення

Народны артыст Беларусі Тадэвуш Кокштыс распавядае…

Стар. 10

“Даруй, што варушу твой боль”

Яўгенія Янішчыц – паэт сваёй краіны ў самым высокім сэнсе.

Стар. 15

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА Ў IV КВАРТАЛЕ 2009 г.

Для індывідуальных падпісчыкаў:
1 месяц — 7760 руб.
Падпісны індэкс — 63856

Ведамасная падпіска:
1 месяц — 10060 руб.
Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: на 1 месяц — 5200 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска для ўстаноў культуры і адукацыі:
1 месяц — 7870 руб. Падпісны індэкс — 63880

Каб год для вас быў неблагім — падпішыцеся на «ЛіМ»!

Тыдзень таму ў сталічнай мастацкай галерэі “Універсітэт культуры” адкрылася ўжо адзінаццатая па ліку Рэспубліканская выстаўка работ лаўрэатаў, дыпламантаў і стыпендыятаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі, якія атрымалі заахвочванні ў 2008 і 2009 гадах. Тут прадстаўлена 70 твораў, выкананых у самых розных тэхніках. Аўтарам — ад 10 да 24 гадоў: гэта выхаванцы дзіцячых мастацкіх школ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў розных рэгіёнаў краіны, студэнты Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.

Прагноз на заўтра

Традыцыйны, штогадовы праект, у якім удзельнічае даравітая і перспектыўная творчая моладзь з усёй Беларусі, заахвочаная спецыяльным фондам, — яшчэ адно пацвярджэнне клопату дзяржавы пра будучыню нашай айчыннай культуры. На гэта арганізатары выстаўкі — Міністэрства культуры краіны, спецыяльны фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, аддзел па рабоце з таленавітай моладдзю Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў — звяртаюць асаблівую ўвагу.

Падчас урачыстага адкрыцця экспазіцыі міністр культуры Беларусі Павел Латушка падкрэсліў, што выстаўка ладзіцца ў галерэі, размешчанай у Палацы Рэспублікі — знакавым месцы, дзе адбываюцца многія важныя падзеі. Так, агледзейнічаюць 522 школы мастацтваў, 21 сярэдняя спецыяльная навучальная ўстанова і тры ВНУ ў галіне культуры і мастацтва, а шматлікія конкурсы і фестывалі даюць дадатковыя магчымасці для выяўлення і развіцця адораных маладых людзей.

Старшыня савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі Ніна Мазай вызначыла гэтую выстаўку як плённы

дзіны дасягненняў нашых юных талентаў — падзея таксама надзвычай важная і сведчыць пра тое вялікае значэнне, якое Прэзідэнт краіны надае працы з творчай моладдзю, бо яна будуе дарогу ў заўтра. Міністр падкрэсліў, што сёння ў Беларусі вынік працы і творчасці не толькі саміх аўтараў цудоўных работ, але і ўсіх тых, хто забяспечвае падтрымку талентаў — перадусім, іх педагогаў, бацькоў. Прамоўца выказала агульнае пажаданне: каб юныя творцы дасягнулі новых поспехаў і хутчэй знайшлі сваё месца ў вялікай сям'і беларускага мастацтва.

Творчасць самых яркіх прадстаўнікоў нашай моладзі ўжо зрабілася заўважнай з'явай на абсягу мастацтва. З Алесяй Скорабагатай, пераможцай Дэльфійскіх гульняў, неаднаразова адзначанай прэзідэнцкім фондам, мы ўжо знаёмілі чытачоў “ЛіМа”. Гэтым разам імя 21-гадовай, не па гадах удумлівай і мудрай мастачкі, студэнткі трэцяга курса БДАМ, звярнула на сябе ўвагу шматлікіх наведнікаў вернісажа. І не таму, што ёй была дадзена магчымасць выступіць перад мікрафонам — ад імя ўдзельнікаў выстаўкі. А таму, што Алеся Скорабагатая прадставіла новыя выдатныя работы. Тут і жывое, уражлівае, “салодка” выпісанае алеем, палатно “Мёд” (добра помніцца яго першы публічны паказ на пачатку лета, падчас музычнага свята “Мірскі замак-2009”), і выкананы ў змяшанай тэхніцы густоўны аўтапартрэт, і жывапісныя сланечнікі (“Восень”, ДВП, ляўкас, яечная тэмпера)…

Талент абавязвае да асаблівай адказнасці не толькі таго, каму ён падараваны звыш, але і таго, хто знаходзіцца побач з маладым даравітым творцам: яго бацькоў, педагогаў. Як гэта важна: угледзець талент, захапіцца ім і падтрымаць, заахвоціць, памагчы раскрыцца, каб яго ўбачылі і адкрылі для сябе іншыя, а з часам — убачыў бы і захапіўся вялікі мастацкі свет.

Наогул жа, наватарства, свежы погляд, прагрэсіўнае слова ў свеце колеру і формы — адзнака лепшых работ, прадстаўленых у разнастайных жанрах выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, дызайну, фатаграфіі. Гледачы з цікавасцю аглядаюць жывапіс і графічную акварэль, кераміку і мастацкія фота. Затрымліваюцца ля “Партрэта вялікага дзядзькі Сярожы” (папера, аловак) Кацярыны Бяляўскай, чарапашкі-шкатулкі Наталлі Калягаевай (мастацкае саломапляценне), рэльефнага пано Антона Нічыпарука “Дадаць крыху” (сілумін), “Адзінарогаў” Вікторыі Голікавай (халодны батык), дызайн-праекта лёгкага рэльсавага транспарту для прыгарадных маршрутаў Алеся Фаменкі, калекцыі дасціпных сумак Аліны Грыгарэнкі для падлеткаў — з натуральнага лёну...

“Сёння педагогі ды мастацтвазнаўцы з цікавасцю сочаць за творчымі пошукамі маладых. У стасунках майстроў выяўленчага мастацтва з прадстаўнікамі маладога пакалення, якія ўжо заўтра будуць вызначаць стан айчыннай культуры, фарміруюцца не толькі прафесійныя веды, але і стаўленне да сэнсу творчай дзейнасці, да навакольнага свету, сваёй зямлі, адказнасць за ўсё, што з ёй было, ёсць і будзе...” — адзначае прарэктар па навуковай рабоце Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Міхал Баразна ў прывітальным слове, змешчаным у маляўнічым каталогу выстаўкі. Дарэчы, паглядзець яе варта кожнаму, неабыякаваму да прыгожага. Паблукаўшы па лабірынтах галерэі, можна паразважаць пра будучыню нашых юных талентаў і нават скласці прагноз на заўтрашні дзень айчыннага выяўленчага мастацтва. Чаму б і не? Выстаўка працуе да 19 снежня...

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

На здымках: міністр культуры Беларусі Павел Латушка, старшыня савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі Ніна Мазай, рэктар БДУКіМ Барыс Святлоў адкрываюць выстаўку; на вернісажы — моладзь.

Фота Кастуся Дробава

Пункцірам

• Афіцыйнае адкрыццё Года культуры Беларусі ў Расіі адбудзецца ў сакавіку 2010 года. Такую заяву ў Маскве падпісалі міністр культуры Беларусі Павел Латушка і міністр культуры Расіі Аляксандр Аўдзееў. Праграма ўключае ў сябе выступленні беларускіх калектываў, арганізацыю выстаў, дэманстрацыю фільмаў. Распачнецца Год культуры Беларусі з выступлення Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета ў расійскай сталіцы. У Санкт-Пецярбургу адкрыюць мемарыяльную дошку Яну Баршчэўскаму. У Яраслаўлі будзе экспаніравацца тэматычная выстава Літаратурнага музея Максіма Багдановіча.

• Выдавецтва Беларускага Экзархата па благаслаўленні Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта плануе факсімільнае аднаўленне некаторых старажытных пісьмовых помнікаў: "Полацкага Евангелля" (XII ст.), "Супраслеўскіх Ірмалогій", "Лаўрышаўскага Евангелля" (XII — XIII стст.). Дадзены праект з'яўляецца працягам супрацоўніцтва з дзяржаўнымі структурамі па вяртанні гістарычных, духоўных, культурных каштоўнасцяў. Факсімільнае выданне "Полацкага Евангелля" плануецца здзейсніць да святкавання 1150-годдзя Полацка, якое горад адзначыць у 2012 годзе.

• 26 лістапада ў мінскім палацы культуры МАЗа пройдзе этна-фэст "Ад неба на паўметра-2009". Мэта фестывалю — папулярызацыя беларускіх музычных традыцый, падтрымка маладых калектываў і выканаўцаў, якія працуюць у жанры народнай музыкі. На працягу пяці гадзін на сцэне выступяць дзіцячы фальклорны ансамбль "Святкі", ансамбль народнай музыкі і песні "Мінскія Музыкі", Алег Хаменка, Guda, Rokash, Unia, "Гаротніца", "Нагуаль", "Князь Мышкін" і іншыя. Падчас фэсту ў фае палаца пройдзе выстава народных рамёстваў.

• Свет пабачыла кніга выбраных твораў грамадскага дзеяча Антона Луцкевіча (1884 — 1942) "Барацьба за вызваленне". Гэта кніга публіцыстыкі вядомага адраджэнца, якая датуецца 1906 — 1938 гадамі. Калі ў артыкулах, напісаных да 1917 года, для Луцкевіча была адна з галоўных задач палепшыць долю селяніна, стварэнне беларускага школьніцтва, то пасля падзення Расійскай імперыі грамадскі дзеяч выступае за самавызначэнне беларусаў, стварэнне нацыянальнай дзяржавы. У кнізе друкуюцца яго беларускамоўныя тэксты, пераклады з польскай мовы і дзённікі. "Барацьбу за вызваленне" ўклаў Анатоль Сідарэвіч.

• У лістападзе ў Мінску працягвае дзейнічаць акцыя "Вечар у музеі". Яна разлічана на тых, хто не любіць па вечарах сядзець дома. Спецыяльна ў рамках акцыі гістарычныя скарбніцы працуюць да 21-й гадзіны. Вечаровая праграма адрозніваецца ад дзённай. У мінулым месяцы ўвазе наведвальнікаў былі прапанаваны канцэрты беларускіх песень і танцаў Сярэднявечча, заняткі па творах Янкі Купалы "Эстэтыка кахання". Праграма на бягучы месяц будзе не менш насычанай.

• 17 снежня ў Вялікай зале Белдзяржфілармоніі пройдзе канцэрт шведскага струннага квартэта "Флэш-квартэт". Музычны стыль гурта вар'іруецца ад класічнай струннай музыкі да эксперыментальнага року. "Флэш-квартэт" стварае музыку да фільмаў і піша для некаторых буйных тэатраў і танцавальных гуртоў. Сярод яго твораў былі мюзікл Матса Экса "Appartement", а таксама "Fluke" для Кульберг-балета. Канцэрт арганізоўваецца Пасольствам Швецыі ў Мінску, Шведскім інстытутам і Міністэрствам культуры Беларусі.

Падрыхтаваў Павел РАДЫНА

У Саюзе пісьменнікаў Беларусі

Прыярытэтны кірунак — пераклады

Пра мэты і задачы Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, устаноўчы з'езд якога пройдзе ў снежні ў Мінску, разважае расійскі літаратар, член СПБ Іван Сабіла.

— Упэўнены, што настала пара творчага аб'яднання пісьменнікаў нашых краін, як гэта было ў нядаўнім мінулым. Калі кнігі беларускіх пісьменнікаў выдаваліся шырока ў Расіі, а расійскіх — у вашай краіне. Не выключаю, што пасля стварэння пісьменніцкай арганізацыі, будуць створаны і падобныя аб'яднанні кампазітараў, мастакоў.

Першым вялікім праектам новай арганізацыі магло б стаць выданне 50-томнай беларускарасійскай бібліятэкі па 25 тамоў з кожнага боку. Такая ідэя была прапанавана яшчэ ў 2006 годзе. Праект падтрымалі Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь і Агенцтва па друку і сувязях з грамадскасцю Расіі. Было б добра, каб стварэнне такой бібліятэкі паслужыла ўмацаванню культурных сувязяў паміж Беларуссю і Расіяй.

Але пакуль існуе пытанне з назвай арганізацыі. Гэта можа быць Саюз пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы. Арганізацыю можна назваць таксама Асацыяцыяй пісьменнікаў альбо Міжнародным аб'яднаннем пісьменнікаў. А можа і Лігай пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы. Пытанне існуе, і над ім трэба падумаць на з'ездзе.

— *Іван Іванавіч, на вашу думку, ці не прывядзе стварэнне падобнай арганізацыі да таго, што больш увагі пачнуць надаваць рускамоўнай літаратуры? Альбо гэта паслужыць толькі адраджэнню перакладчыцкіх сувязяў?*

— Што тычыцца перакладчыцкай дзейнасці, то Беларусь тут знаходзіцца ў больш выгадных умовах. Калі краіна мае дзве дзяржаўныя мовы, то ў Беларусі могуць самастойна перакладаць творы пісьменнікаў з рускай на беларускую і наадварот. Але было б правільна, каб беларускамоўныя пісьменнікі перакладаліся ў Расіі і тут выдаваліся. У савецкія часы актыўна перакладалася беларуская літаратура. Асабліва значнай была праца ленінградскай школы перакладчыкаў. Зараз шматлікія перакладчыцкія школы знаходзяцца ў крызісным стане. І галоўная прычына ў адсутнасці канкрэтнай праграмы развіцця літаратур і наладжвання сувязяў паміж літаратурамі іншых краін. Таму адраджэнне перакладчыцкіх школ магло б быць адным з прыярытэтных накірункаў пісьменніцкага аб'яднання Саюзнай дзяржавы.

— *Што яшчэ можа прынесці стварэнне аб'яднанага Саюза пісьменнікаў кожнай з краін?*

— Найперш гэта арганізацыя і правядзенне дзён беларускай літаратуры ў Расіі і расійскай у Беларусі. Даўно гэтага не было. Адсутнасць такіх сувязяў прыводзіць да парушэння шматвекавых традыцый у адносінах. Неабходна стварэнне друкаванага органа аб'яднання пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы. Калі складана адразу стварыць газету ці часопіс, то можна пачаць з альманаха.

— *Ці паспрыяе гэта прасоўванню беларускай літаратуры на рынкі іншых краін?*

— Безумоўна, паспрыяе. Але пры той умове, што мы пераканаем адпаведныя органы Саюзнай дзяржавы ў садзейнічанні літаратурнаму працэсу ў Беларусі і Расіі. Структуры Саюзнай дзяржавы павінны падыходзіць з разуменнем таго, што літаратура, мастацтва настолькі ж неабходны, як эканоміка, прамысловасць, сельская гаспадарка. Даўно вядома, што чым менш у краіне кніг, тэатраў, тым больш праблем з выхаваннем грамадства.

Дзмітрый БЕРАЖНЫ

Віншуем!

Сябар акадэміі

Загадчык кафедры славянскіх літаратур Беларускага дзяржаўнага універсітэта, доктар філалагічных навук, прафесар, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Іван ЧАРОТА абраны замежным членам Сербскай акадэміі навук і мастацтваў. Пра гэта стала вядома з ліста Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Сербія ў Рэспубліцы Беларусь Срэчка Джукіча да старшыні СПБ Мікалая Чаргінца.

Прафесар І. Чарота як адзін з аўтарытэтнейшых у свеце славістаў сваёй шматгранай працай зрабіў вялікі ўнёсак у паглыбленне і пашырэнне сербска-беларускіх адносін. На працягу многіх гадоў Іван Чарота з'яўляецца актыўным правадніком сербскай культуры — мовы, літаратуры, духоўных каштоўнасцей, нацыянальных традыцый у Рэспубліцы Беларусь, на постсавецкай прасторы і па-за яе межамі.

"Мая прапанова абраць прафесара І.А.Чароту членам Сербскай акадэміі навук і мастацтваў была аднагалосна прынята Аддзяленнем мовы і літаратуры, — гаворыцца ў лісце сп. Срэчка Джукіча. — Пры галасаванні на агульным сходзе акадэміі І.Чарота атрымаў 84 галасы і заняў трэцяе месца сярод іншых кандыдатаў".

Прэзідыум СПБ шчыра віншуе Івана Чароту з ганаровым выбраннем членам Сербскай акадэміі навук і мастацтваў.

"Прасторам любым шапку зняў..."

Юбілеі

У Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адбылася вечарына памяці Максіма Лужаніна "Моваю сэрца", прысвечаная 100-гадоваму юбілею з дня нараджэння паэта.

Сябра легендарных літаратурных аб'яднанняў пачатку мінулага стагоддзя "Маладняк" і "Узвышша", колішні сакратар Якуба Коласа — Аляксандр Амвросьевіч Каратай, які тварыў пад псеўданімам Максім Лужанін, пражыў доўгае і плённае жыццё. На яго век прыпалі ўсе значныя падзеі XX стагоддзя: Кастрычніцкая рэвалюцыя і дзве сусветныя вайны, сталінскія рэпрэсіі, адліга, застой, перабудова... У 1933 годзе ён быў абвінавачаны ў нацдэмаўшчыне і адпраўлены ў ссылку. Падчас Вялікай Айчыннай вайны змагаўся за Радзіму на фронце. Усё гэта паэт адлюстраваў у сваёй творчасці.

Вянкамі дарог маіх не высцілалі,
Затое калючак падсыпаць — як бачыш.

Ён працаваў у газеце «Звязда», часопісе «Вожык», доўгі час з'яўляўся галоўным рэдактарам кінастудыі "Беларусьфільм"... Максім Лужанін быў сапраўдным патрыётам сваёй краіны.

Ушанаваць памяць паэта прыйшлі сябры і калегі. Гучалі вершы Максіма Лужаніна і вершы пра яго.

"Псеўданім Максім Лужанін ён абраў сабе невыпадкова. Аляксандр Амросьевіч з вялікай пашанай ставіўся да Максіма Багдановіча, — расказвае Анатоль Бутэвіч. — Ён заўсёды дзівіў мяне сваёй беларускасцю, сваёй любоўю да Бацькаўшчыны. У яго была вельмі прыгожая і мілагучная беларуская мова. Сёння такую ўжо не пачуеш. Мне здавалася, што ён ніколі не бывае сумным — заўсёды мог развесяліць нават самага сумнага чалавека. Вельмі рад, што мне пашчасціла сябраваць з такім таленавітым і добрым чалавекам. Хочацца, каб у Мінску з'явілася дошка памяці Максіма Лужаніна".

Уладзімір ПАДАЛЯК
Фота аўтара

Паважаныя калегі!

Рэдакцыя штотыднёвіка "Літаратура і мастацтва" абвяшчае творчы праект "Кнігі з аўтографамі пісьменнікаў Беларусі — у бібліятэкі краіны" для цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм Рэспублікі Беларусь. Мэта праекта — вызначыць пераможцаў паводле вынікаў падпіскі на "ЛіМ" на I паўгоддзе 2010 года. Цэнтралізаваныя бібліятэчныя сістэмы, чые падпісныя кампаніі будуць найбольш плённымі (па кожнай вобласці асобна), атрымаюць унікальныя прызы — па 100 асобнікаў кніг з аўтографамі беларускіх пісьменнікаў. Пераможцы будуць вызначаны пасля 12 студзеня 2010 года.

Спадзяёмся на ваш актыўны ўдзел, паважаныя бібліятэкары!

Гістарычны пляц

Мінск пад купалам

Падрыхтаваны праект музея старажытнага Мінска. Плануецца, што ў ім будзе адлюстравана гісторыя горада ад самага яго заснавання.

Археалагічныя раскопкі на вуліцах і плошчах сталіцы ў розныя гады здараліся па розных прычынах. Да прыкладу, нешта было знойдзена нават падчас будаўніцтва першага беларускага метро. Сёлетняй восенню ў сталіцы вяліся мэтанакіраваныя раскопкі ў раёне старога замчышча — каля станцыі метро Няміга.

І, напэўна, назапашаныя знаходкі могуць праліць святло на невядомыя старонкі гісторыі, асабліва датычныя перыяду, які папярэднічаў 1067 году. У летапісе пад 1067 годам гаворыцца, што войскі трох кіеўскіх князёў братоў Яраславічаў выступілі ў паход супраць полацкага князя Усяслава. "И придоша к Меньску, и меняне затворишася въ град"...

Менавіта пра горад тых часоў вядуць размовы дасведчаныя людзі, якія мараць пра стварэнне музея старажытнага Мінска і, чакаюць рашэння аб рэканструкцыі старажытнага цэнтра горада. Так, як, да прыкладу, існуе старажытны горад Бярэсце ў сучасным Брэсце — пад адмысловым купалам. Купал прапануюць устанавіць у горадзе каля станцыі метро Няміга. Крыху вышэй ад Дома фізкультурніка, лічыцца, знаходзілася паўднёва-ўсходняя частка мінскага замчышча. Калісьці тут існавала замкавая гара, на якой і быў заснаваны Менск. Менавіта тут, непадалёк ад плошчы 8 Сакавіка археолагі адкапалі існаваўшыя раней дарогі, выкладзеныя бярвеннем, знайшлі унікальныя рэчы і назапасілі найцікавейшыя звесткі пра горад. Хаткі былых гараджан былі невялікія, іх плошча складала прыкладна 3х4 квадратныя метры, цэнтр быў шчыльна заселены. Знайшлі не толькі вядомы жыхарам сталіцы фундамент царквы, а і майстэрню, дзе абцёсвалі камень, тут жа размяшчаліся ўмацаванні вала.

Між іншым, у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі сталі ўжо традыцыйнымі восеньскія канферэнцыі "Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі". Навуковыя чытанні ахопліваюць увесь перыяд развіцця горада: Мінск археалагічны, Менск павятовы і ваяводскі цэнтр, губернскі Мінск, Мінск падчас рэвалюцыйных зрухаў і ў савецкі час і, бясспрэчна, Мінск на сучасным этапе, як сталіца Беларусі.

Першая такая канферэнцыя праходзіла два гады таму і прысвячалася 940-годдзю Мінска.

Сёлетняя — 510-годдзю атрымання горадам Магдэбургскага права.

Ірына ТУЛУПАВА
Фота Кастуся Дробава

Гандлюем беларускім!

Ракурс

Адбылася II кантактная біржа выдаўцоў, паліграфістаў, распаўсюджвальнікаў друку. Яе галоўны тэзіс — "Гандлюем беларускім!" найлепшым чынам адлюстраваў памкненні і ўдзельнікаў біржы, і аўтараў — усіх, хто спрычынены да выхаду кнігі ў свет.

На біржы разглядаліся магчымасці больш эфектыўнага продажу беларускай кнігі, перыёдыкі і папярова-белавых тавараў на рынку Беларусі.

Як зазначыў ва ўступным слове міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Уладзімір Русакевіч, праведзеныя напярэдадні праверкі дзейнасці прадпрыемстваў, якія ўваходзяць у сістэму міністэрства, далі падставу для прынцыповай размовы. На складах адной з такіх установ, дзе ідзе падрыхтоўка тавараў, у тым ліку і папярова-белавых, да рэалізацыі, не знайшлося ніводнага віду тавараў айчыннай вытворчасці. Ёсць Курск, Пскоў, Масква, Санкт-Пецярбург. Але няма ні Полацка, ні Мінска. Чаму так?

"Некалькі гадоў таму мы распрацавалі дзяржаўную праграму тэхнічнага пераабсталявання паліграфпрадпрыемстваў краіны, прадоўжыў міністр інфармацыі. Нягледзячы на тэхнічнае пераабсталяванне, аб'ём заказаў на паліграфпрадпрыемствах падае. Зніжэнне аб'емаў вытворчасці дасягнула 20 працэнтаў (у той час як па ўсёй краіне — 12 — 15)".

Для рэалізацыі папярова-белавых тавараў, кніг, газет і часопісаў, маецца вялікая сетка гандлю ў сістэме Міністэрства інфармацыі — гэта кіёскі і шапікі "Саюздруку", кнігагандаль. Але ў сваёй жа сістэме ўласнай прадукцыі прадаецца толькі 20 працэнтаў ад агульнай колькасці тавараў. Менавіта гэтыя факты сталі прадметам абмеркавання і падставаю для супрацоўніцтва Саюза выдаўцоў і распаўсюджвальнікаў друку і Міністэрства інфармацыі на II кантактнай біржы.

На форуме сабраліся выдаўцы, паліграфісты, прадстаўнікі гандлёвых арганізацый — каб знайсці агульныя падыходы ў вырашэнні азначаных праблем і яшчэ раз паспрабаваць пераканаць адно аднаго: трэба рэалізоўваць беларускае. Іншымі словамі, вырашалася, што трэба зрабіць, каб наша кніга прысутнічала і ў гіпермаркетах, і ў аддаленых сельскіх крамах. На сустрэчы прысутнічалі прадстаўнікі Белкаапсаюза, Міністэрства гандлю краіны — большасць пытанняў адрасавалася ім. Да прыкладу, ці не варта, нарэшце, пазбавіцца паслуг пасрэднікаў? Прадстаўнікі Міністэрства гандлю, у сваю чаргу прапанавалі дзяржвыдавецтвам удзельнічаць у фарміраванні асартыментнай палітыкі. Цяпер жа ў агульным аб'ёме продаж (паводле статыстыкі Міністэрства гандлю) друкаваных выданняў рэалізуецца 1,1 працэнта. (І гэты паказчык, паводле слоў прадстаўніка міністэрства, лічыцца неблагім: мэбля ў аб'ёме продаж мае 1,7 працэнта). Папярова-белавых тавараў рэалізуецца каля 0,3 працэнта. Праўда, абумовілася прадстаўнік міністэрства, тут улічваюцца і рэалізаваныя памперсы, якія таксама адносяцца да папярова-белавых тавараў. І, дададзім, значна паляпшаюць статыстыку.

Гэта праўда: папярова-белавую прадукцыю (сшыткі, блакноты, фарматныя лісты) мы не экспартуем — трэба насыціць уласны рынак і даць магчымасць спажыўцу карыстацца айчыннай высакаякаснай прадукцыяй. На кантактнай біржы якраз і спрабавалі змадэліраваць сітуацыю на будучае: у якім кірунку стане развівацца сістэма распаўсюджвання і кнігагандлю надалей.

Ірына ТУЛУПАВА
Фота Кастуся Дробава

З-пад пяра

За шматгадовую плённую працу ў сферы навукова-даследчага і метадалагічнага забеспячэння дзяржаўнай палітыкі ў галіне сродкаў масавай інфармацыі нагрудным знакам "Выдатнік друку Беларусі" ўганараваны Давід Генрыхавіч Ротман, дырэктар цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Высокую ўзнагароду навукоўцу ўручыў міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Уладзімір Русакевіч падчас працы II кантактнай біржы выдаўцоў, паліграфістаў і распаўсюджвальнікаў друку.

І. Т.

У рамках дзён беларускай культуры, якія нядаўна ладзіла кафедра беларускай літаратуры і культуры БДУ, адбылася творчая сустрэча студэнтаў і выкладчыкаў філалагічнага факультэта з галоўнымі рэдактарамі выданняў, што ўваходзяць у склад рэдакцыйна-выдавецкай установы "Літаратура і Мастацтва". Цёплым словам усіх прысутных прывітала загадчык кафедры, доктар філалагічных навук, прафесар Таццяна Шамякіна. Прадстаўляла гасцей кандыдат філалагічных навук Лада Алейнік. Раіса Баравікова ў сваім выступленні адзначыла традыцыйна цесныя сувязі часопіса "Маладосць" з філалагічным факультэтам БДУ, падкрэсліла выключную ролю часопіса ў выяўленні і падтрымцы маладых талентаў, распавяла пра набыткі і дасягненні.

Мікола Мятліцкі падзяліўся з аўдыторыяй сваімі поглядамі на стан сучаснай беларускай літаратуры, закрануў праблемы, якія стаяць перад творцамі і рэдакцыяй старэйшага ў рэспубліцы часопіса "Полымя". Алесь Бадак падкрэсліў, што лічыць студэнтаў-філолагаў сваімі калегамі і прапанаваў ім паўдзельнічаць у распрацоўцы рэдакцыйных планаў — правёў сярод іх пісьмовую міні-апытанку, каб даведацца, творы якіх замежных пісьменнікаў яны хацелі б бачыць на старонках часопіса "Нёман". Напрыканцы сустрэчы выступіў загадчык аддзела прозы і паэзіі штотыднёвіка "ЛіМ" Янка Лайкоў.

Ул. інф.

Персанальная выстава станковай графікі Вячкі Целеша з поспехам прайшла нядаўна ў Гродне. У карціннай галерэі "Тызенгаўз" з работамі рыжскага беларуса-творцы ўважліва знаёміліся не толькі жыхары абласнога цэнтра, але і прыхільнікі мастацтва з іншых гарадоў і мястэчак Прынёмання, удзельнікі экскурсій.

Вячка Целеш, ураджэнец Ваўкавыскага раёна, мае багаты творчы набытак. Гэта шматколерныя і прыцягальныя сваёй непаўторнасцю пейзажы, партрэты вядомых людзей, экслібрысы беларускіх і латышскіх пісьменнікаў. У творах мастака з Даўгавы, які па волі лёсу пражыў у Рызе палавіну стагоддзя, адчуваецца подых роднай зямлі аўтара, прысутнасць беларускага характару і духу.

Не толькі ў Латвіі, а і ў суседніх краінах атрымала станоўчы розгалас плённая дзейнасць створанага па ініцыятыве В. Целеша Аб'яднання мастакоў-беларусаў Балтыі "Маю гонар". У гэтай суполцы згуртаваліся і натхнёна працуюць на беларускае мастацтва нашы суайчыннікі, што жывуць у краінах Прыбалтыкі, у Швецыі і Санкт-Пецярбургу.

Алесь ЖАЛКОЎСКІ

Народны вакальны ансамбль эстраднай песні з Мядзела "Правінцыя" на днях вярнуўся са сталіцы Расіі. Артысты з райцэнтра прынялі ўдзел у Днях культуры Мінскай вобласці ў Паўднёва-Усходняй акрузе Масквы. Разам з мядзельчанамі выступілі калектывы з Дзяржынска і Слуцка.

Кіраўнік ансамбля Раман Руткевіч расказаў, што гледачоў было шмат — пераважна старэйшага ўзросту. "Удзельнічалі ў трох канцэртах. Прымалі нашы выступленні вельмі цёпла, — зазначыў ён. — І было прыемна, калі да нас падыходзілі пасля канцэрта, дзякавалі".

Алесь ВЫСОЦКІ

Арт-лінія

Вернісаж адной карціны, які прайшоў у Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы, стаўся нагодай для роздуму пра ролю народнага паэта ў нацыянальным самавызначэнні беларусаў, у станаўленні нашай дзяржаўнасці.

Кім былі б мы без Купалы?

Вядома, што а 19-й гадзіне ўсе музеі зачыняюцца. Ды менавіта на гэткі нязвыклы час была прызначана імпрэза ў Купалавым доме, бо адбывалася яна ў межах эксперыментальнай акцыі "Вечар у музеі". Такі творчы эксперымент, калі раз на тыдзень сталічныя музеі працягваюць працаваць да 21.00, ладзіцца па ініцыятыве Міністэрства культуры Беларусі ўжо другі месяц. За кастрычнік музеі ў вечаровы час наведала каля 700 чалавек, і яны адчулі крэатыўнасць новага "фармату". Вось і нядаўняя вечарына ў купалаўскім музеі, куды прыйшлі прадстаўнікі інтэлігенцыі ды творчая моладзь, сталася яркім дапаўненнем да традыцыйных экскурсій.

Знаёмства з карцінай "Янка Купала ў Вільні. 1913 год", над якой па замове музея працаваў жывапісец Алесь Ксяндзоў, дало магчымасць пагаварыць і пра папаўненне мастацкай купаліяны, і пра віленскі перыяд у творчасці песняра, і пра веліч яго асобы, ды і пра дзейнасць аўтара новай работы.

Дырэктар музея Алена Мацевасян прыгадала, што фарміраванне мастацкай купаліяны ў яго фондах пачалося з 1944 г., калі Уладзіслава Францаўна Луцэвіч, першы дырэктар, замовіла Аляксею Глебаву вялікую скульптуру Янкі Купалы, што цяпер знаходзіцца ў выставачнай зале. Сёння калекцыя, найкаштоўную частку якой складаюць прыжыццёвыя партрэты Купалы, вельмі багатая і працягвае папаўняцца.

Зазначаючы прыцягальнасць асобы нашага нацыянальнага генія для людзей мыслівых і творчых, перашы намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў Рыгор Сітніца падкрэсліў: "Да Купалы можна было яшчэ гадаць, ці ёсць такая нацыя — беларусы. Разам з Купалам наша нацыя сцвердзіла сябе назаўсёды. І найвялікшым творам Купалавага генія, дзякуючы якому з'явіўся ў нас багаты літаратурны набытак, ёсць сама беларуская нацыя. Усвядомім, хто ён для нас: мы без Купалы — не нацыя, не народ... Нам калісьці ўбівалі ў галовы, што Купала — гэта ледзьве не пастушок з дудачкай, у лапцях. Паглядзіце ж, які ён быў: шляхціц, вельмі імпазантны, стылёвы чалавек... Сапраўдны інтэлігент, якіх зараз яшчэ пашукаць трэба!»

Шчыры дух сустрэчы ў Купалавым доме падтрымалі таксама выступленні галоўнага спецыяліста Міністэрства культуры Беларусі Міколы Мішчанкі, мастацтвазнаўцы Галіі Фатыхавай, аповед вядучай вечарыны — старшага навуковага супрацоўніка музея Вольгі Пархімовіч, выкшталцонае гранне гурта сярэднявечнай музыкі "Разалія".

Рэалістычны партрэт маладога Янкі Купалы, чыю задуменнасць, адухоўленасць і прыхаваныя ўнутраныя пакуты падкрэслівае фон — выява нашай старадаўняй святыні, віленскай Вострай Брамы, прысутныя віталі апладысментамі. Апладысментамі ганаравалі Алеся Ксяндзова: дэбютант у купаліяне, ён праз уласны свежы неабыякавы позірк пераканаўча перадаў адчуванне магутнай і трагічнай асобы Паэта-прарока ды таго складанага часу, у якім сталеў наш класік.

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

На здымку: ля карціны "Янка Купала ў Вільні. 1913 год" — яе аўтар Алесь Ксяндзоў і дырэктар музея Алена Мацевасян.
Фота Кастуся Дробава

Повязі

«Вожык» загучаў па-кітайску, а Канстанцін Дробаў уразіў Паднябесную беларускімі фотапейзажамі.

Сябруем культурамі

Падчас падрыхтоўкі беларускага стэнда да Міжнароднага фестывалю культур, які адбыўся ў Пекінскім універсітэце мне давялося перакладаць некаторыя тэксты з беларускай мовы на кітайскую. Сапраўдным лінгвістычным сюрпрызам сталася тое, што ў кітайскай мове ёсць эквіваленты нашым родным словам «прыпечак» і «грубка». Беларусы і кітайцы, і ўвогуле — прадстаўнікі розных краін, маюць значна больш агульных рысаў, чым нам думалася раней.

Сёлета ў вядучым універсітэце Кітая праходзіў ужо шосты Міжнародны фестываль культур. Такі фэст, акрамя Пекінскага універсітэта, яшчэ ладзіўся ў шэрагу іншых ВНУ: Цінхуа, Жэньмінь. Падчас яго праходзілі выставы і конкурсы сярод замежных студэнтаў. За некалькі тыдняў да фэста распачаўся музычны конкурс, удзельнікі якога спаборнічалі ў выкананні песень на кітайскай і роднай мовах. Адбыўся таксама конкурс прамоў на мове краіны-арганізатара.

Пляцоўкай для Міжнароднага фестывалю стала цэнтральная плошча студэнцкага гарадка Пекінскага універсітэта. У гэтым годзе асноўнымі тэмамі былі культура і мова, таму ўдзельнікаў размяшчалі паводле моўнай сям'і і моўнай групы.

Каб зацікавіць наведвальнікаў, арганізатары выдалі кожнаму гледачу так званы «пашпарт мерапрыемства», а прадстаўнікам краін — пячатку са словам «прывітанне» на роднай мове. Тым, каму пашчасціла сабраць пячаткі з прывітаннямі на ўсіх мовах, гэта давала магчымасць атрымаць падарунак ад арганізатараў. Такі тактоўны падыход прыцягнуў увагу да мерапрыемства вялікай колькасці кітайцаў і забяспечыў аншлаг ля кожнага стэнда.

Замежныя студэнты падрыхтавалі разнастайныя плакаты і фотаздымкі, прыгатавалі стравы нацыянальнай кухні. Іспанія, напрыклад, частавала кітайскім варыянтам традыцыйнай іспанскай сангрыі. Бельгійцы знайшлі раставую ляльку Смёрфа — героя аднайменнага знакамітага бельгійскага мультфільма («The Smurfs»). Іранцы запрашалі на кальян. Немцы паставілі вароты, каб наведвальнікі паспрабавалі свае сілы ў футболе. Французы прапаноўвалі сыр і чорны хлеб. Але самым адметным на выставе для мяне аказаўся стэнд Беларусі, таму што менавіта на ім расказвалася пра нашу сінявокую краіну. Беларускія студэнты, улічваючы вялікі інтарэс да коміксаў сярод сучаснай кітайскай моладзі, пераклалі некалькі старонак з беларускага гумарыстычнага часопіса «Вожык» на кітайскую мову і зрабілі беларуска-кітайскія комікс-плакаты з гісторыяй пра тое, як сірата Андрэйка выгнаў дамавіка з Янкавай хаты. У афармленні нашага стэнда таксама былі выкарыстаны арыгінальныя фотапейзажы Канстанціна Дробава, фотакарэспандэнта газеты «Літаратура і мастацтва». Атрымалася, што ў нашага суайчынніка адбылася амаль што персанальная фотавыстава за мяжой. Частавалі беларусы смачнымі дранікамі. Увогуле, прыемна, што нашу краіну ведаюць за мяжой.



Швейцарыі, якая адзначыла, што ўсё ж галоўнае на такім мерапрыемстве — не відовішчныя забавы і смачная ежа, а дыялог, падчас якога ў людзей з розных краін ёсць магчымасць знайсці як мага больш агульных інтарэсаў.

Не магу не пагадзіцца з меркаваннем адной з удзельніц фестывалю, студэнткі Мары са

Вераніка ЛАЗОЎСКАЯ
Пекін

Паміж Дзвіной і Палатою

Нашы продкі ставілі першыя гарады на зліцці рэк. На ўзгорках паміж імі ўзводзілі і храмы. Яны на беларускай зямлі самыя старажытныя. Пра рэстаўрацыю Каложскай царквы, якая ўзвышаецца ў міжрэччы Нёмана і Гараднічанкі, мы ўжо расказвалі. Сёння завітаем у Полацкі Сафійскі сабор — помнік архітэктуры XI — XVIII стст. Даследчыкі маюць неспадзяваную версію наконт даты яго заснавання.

У міжрэччы

На ўзгорак паміж дзвюх палачанскіх рэк — Палатой і Заходняй Дзвіной — вядуць дзве шматступеньчатыя лесвіцы. Драўляная, у якой, здаецца, бясконцая колькасць прыступак — ад правага берага Дзвіны. Жалезная, якая плаўна пераходзіць у мост праз раку — ад Палаты. Дзвіна шырокая, цячэ роўным токам. Бурнымі хвалямі ўздымаецца вада Палаты. Непрадказальная ля Чырвонага моста (таго самага, дзе цярпела паражэнне напалеонаўская армія і пралілося шмат крыві), пры храме храмаў яна суцішвае свой нораў. Нібыта вяртае падарожніка ў часы яшчэ больш далёкія. Глядзіш на плынь, яе маляўнічыя ўзоры, і падаецца, быццам маладзіца Рагнеда пляце касу, перабіраючы паміж пальцаў тры роўныя пасмы. Водныя патокі звіваюцца ў адну вялікую касу — прыток Дзвіны. Тут, пры сустрэчы са сваёй нашмат большай і знанай суродзічкай яна супакойваецца. Як дзіця пры маці. Як грэшнік, пачуўшы покліч звыш. З таго самага ўзгорку, дзе Полацкі князь Усяслаў (Чарадзей) заснаваў Верхні замак і паставіў на самым прыкметным месцы храм у гонар Прамудрасці Гасподняй — Сафійскі сабор.

Загадка Брачыслава

Узнімайся па любой лесвіцы — і ўбачыш перад сабою Сафійскі сабор. Лічыцца, што храм быў пабудаваны паміж 1044 і 1066 гадамі (даты не зусім дакладныя). Таму што ў гэтыя гады Усяслаў (Чарадзей) быў юнаком. А каб пабудаваць сабор такога ўзроўню, чалавек павінен мець вялікія сродкі... Каб за ім пайшлі баярства, гарадскія людзі, — тлумачыць мне версію навукоўцаў загадчык кафедры айчыннай і ўсеагульнай гісторыі Полацкага дзяржаўнага універсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Дзяніс Дук. — Існуе такі гістарычны факт: Усяслаў пайшоў на Ноўгарад, спаліў гэты горад, зняў з храма званы, сабраў царкоўнае начынне і прылады і прывёз у Полацк. Напэўна, для аздаблення Сафійскага сабора. Але якога — драўлянага альбо каменнага? Каменны, зразумела, больш позні. Гісторык Сяргей Тарасаў дапусціў, што сабор быў пабудаваны не Усяславам, а яго бацькам, Брачыславам. За апошнія 20 гадоў свайго валадарання князь знаходзіўся ў росквіце, меў вялікі аўтарытэт. З Яраславам Мудрым яны размежавалі ўладу, кожны княжыў на сваёй тэрыторыі. І Брачыслаў якраз і меў сродкі і магчымасці пабудаваць Сафійскі сабор...

Здагадкі

У ціхі восеньскі дзень 2009 года сярод жоўта-барвовай лістоты вяртацца ў глыбіні стагоддзяў надзіва проста. Тут і смуга бясконцая, і сіла нераможная, і ракавая пяточка лёсу, цвёрдая яго прадвызначанасць, якою можна патлумачыць многае. Але невытлумачальнай застанецца, бадай, незямная прыгажосць Сафійскага сабора. Мяняліся абрысы і знешні выгляд храма, нанова праектавалася размяшчэнне алтара, вышыня ўстаноўкі і колькасць купалаў — а ён яшчэ больш вабіў сваёй таямнічасцю.

Сабор — адзін з асноўных сведкаў нашай гісторыі, адзін з пяці падобных храмаў сусветнага ўзроўню. Полацкую Сафійку згадваюць не інакш, як у звязцы з Сафійкай Кіеўскай і Наўгародскай, будаваных па ўзоры Канстанцінопальскім. Але быў яшчэ храм у гонар Прамудрасці Гасподняй і ў Охрыдзе (Македонія). На які, па меркаваннях даследчыкаў, полацкі найбольш падобны.

Да такіх высноў навукоўцы прыйшлі, у прыватнасці, пасля даследаванняў плінфы, з якой будаваўся сабор. Яна зроблена зусім у іншай тэхніцы, чым кіеўская і наўгародская. Полацкая плінфа была зроблена ў так званай раз'ёмнай форме — цалкам арыгінальная тэхналогія стварэння самой плінфы і будаўнічай кладкі. Такая тэхналогія на Русі з'явілася толькі напрыканцы XI ст.

Атрымліваецца, што плінфу мы маем больш познюю, а Усяслаў прывёз званы для сабора нібыта раней. Дык калі ж на самай справе будаваўся сабор: напрыканцы XI ст. альбо на яго пачатку? Пытанні застаюцца адкрытымі.

Тое меркаванне, нібыта будавала Полацкі і Кіеўскі храмы адна арцель, таксама не пацвярджаецца. Па-першае, у Кіеўскай Сафіі было 13 купалаў. У Полацкай — сем. (У гонар сямі Усяленскіх сабораў, на якіх былі сфармуляваны галоўныя дагматы хрысціянскай царквы). Не супадаюць памеры храмаў. Да таго ж у Полацкай Сафіі шмат рыс базілікальных. Яны сягаюць у часы ўзаемаадносін Полацка з Візантыяй.

Сяргей Тарасаў нездарма звярнуў увагу на падабенства Полацкай Сафіі не з Кіеўскай, а з Охрыдскай. Супрацоўнікі Эрмітажа (Санкт-Пецярбург), дзе добрая база па вывучэнні старажытнасцей, таксама пацвярджаюць такое падабенства. На карысць гэтай версіі і гістарычныя паралелі: Македонскі храм пабудаваны прыкладна ў той жа час, як і Сафія Полацкая. І, напэўна, аднымі і тымі ж майстрамі. Альбо майстрамі, якія вучыліся там.

Беларуская школа дойлідства

Ад Полацкага Сафійскага сабора XI стагоддзя захаваўся цяпер толькі фундамент, які ўключаны ў кампазіцыю новага сабора. Знаёмая для дойлідства XI — XII стст. кладка: у падмурку валуны, якія ўверсе ўсё часцей перамяжаюцца з плінфай — тонкай цэглай. Самі сабою маляваліся адмысловыя ўзоры: чырвоная цэгла, ружовыя прамежкі паміж ёй — быццам майстра-мастак маленькімі штрыхамі прайшоўся па каменным палатне сабора, дадаў яму сонечнага цяпла. І таму нават цёсаны камень зусім не шэры!

Пра гэта мне расказвае загадчыца навукова-асветніцкага аддзела Сафійскага сабора Ірына Шупенька.

Нешта падобнае — у Гродзенскай Каложы (XIIст.). Падабенства наводзіць на роздум пра беларускую школу дойлідства. Пытаюся ў Дзяніса Дука — якія элементы прыўнесла яна ў нашу храмавую культуру?

— Не толькі ў нашу, а і ў сусветную школу дойлідства. У Полацку былі вынайдзены такія архітэктурныя элементы храма, як какошнікі і закамары. Какошнікі — гэта дэкаратыўныя элементы ў выглядзе языкоў полымя. Яны масіўныя, але здалёк выглядаюць вельмі прыгожа. Усталёўваюцца на даху, і за кошт гэтага храм нагадвае свечку, якая гарыць. Каб такія цяжкія элементы размясціць наверсе, неабходны быў прынцыпова новы спосаб будаўніцтва храма. Навукоўцы яго назвалі метадам дойліда Іаана. Неабходны былі вельмі масіўныя сцены, здольныя вытрымаць такі цяжар. Спаса-Прэабражэнская царква, якую будаваў Іаан па замове Еўфрасіннні Полацкай, — яскравы таму ўзор.

І яшчэ: полацкія храмы былі больш высокія. У гэтым горадзе ў XII ст. вакол храмаў з'явіліся так званыя "галерэі". За кошт іх і дасягалася высотнасць — дадатковы геаметрычны аб'ём патрабаваў больш высокай архітэктуры.

Вакол Сафійскага сабора таксама быў комплекс пабудоў! Адмысловыя "прыдзелы" ўтваралі капліцы, званіцы, нават самастойныя невялікія храмы. У адным з прыдзелаў мог размяшчацца знакаміты кніжны збор.

Сафійская бібліятэка

Блукаю паміж калон і спрабую знайсці — дзе ж тут магла размяшчацца адна з першых кніжных скарбніц? Яна па ўяўленнях сённяшніх дзён хоць і невялікая, але найкаштоўнейшая — тут збіраліся насамрэч першыя кнігі. Лічыцца, што заснаваў Сафійскую бібліятэку князь Усяслаў — тады толькі пачыналі асвойваць майстэрства перапісу манускрыптаў. Самы вялікі ўнёсак у гэту бібліятэку зрабіла Еўфрасіння Полацкая, якая не толькі перапісвала сама, а і заснавала цэлы скрыпторый. Лічыцца, што ў гэтай бібліятэцы знаходзіліся і полацкія летапісы. Знікла яна ў XVI ст. (у Лівонскую вайну). Пазней бібліятэчныя фаліянты былі размеркаваны па розных гарадах. Частку іх гісторыкі адшукалі ў Польшчы — і ідэнтыфікавалі як кнігі з Сафійкі.

Пластычная аперацыя

Найбольш значныя змены знешняга выгляду сабора адбыліся ў перыяд, калі ён належаў уніяцкай царкве — з 1596 па 1839 гг.

Але Сафійка XVI — XVIII стст. іншая, зусім не падобная на сабор XI ст. Яна перажыла шмат трагічных падзей. Аднак, у гушчыні жыцця не была, бадай, гадоў дваццаць восем — трыццаць, калі апынулася ў руінах пасля ўзрыву парахавога складу ў смутны для яе час Пятра I.

Між іншым, падчас рускафранцузскай вайны 1812 года ў патаемнай адтуліне сцяны сабора манахі хавалі знакаміты крыж Еўфрасінні Полацкай.

Выглядам, які мае Сафійка цяпер, храм абавязаны уніяцкаму архіепіскапу Фларыяну Грабніцкаму. Менавіта па яго замове вядомы архітэктар з Вільні Я.Глаўбіца і майстар з Варшавы Б. Касінскі аднавілі храм у стылі, які назвалі беларускім барока.

Назад... у будучыню

Даследчыкі даўніны былі тут неаднаразова. Храм даследавалі і расійскія, і беларускія археолагі. Цяпер у Сафійскім саборы чакаецца новы этап даследаванняў. Пакуль жа галоўны кафедральны храм працуе як музей. Сабор — галоўны з 11 аб'ектаў Нацыянальнага полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Толькі за мінулы 2008 год яго наведалі каля 150 тысяч чалавек: прычым, індывідуальных наведванняў прыкладна столькі ж, колькі і ў экскурсіях. Тут праходзяць заняткі па гісторыі і розныя мерапрыемствы, тут адбываецца прысвячэнне ў гімназісты.

У Сафійцы XXI стагоддзя працуе канцэртная зала: дзякуючы выключнай акустыцы тут праходзяць канцэрты і фестывалі арганнай музыкі. І — гэта ўжо схавана ад вока экскурсанта — тут месціцца архіўныя фонды. Яны захоўваюць вялікую колькасць таго, што знойдзена археолагамі на старажытнай полацкай зямлі.

Ірына ТУЛУПАВА

На здымках: Полацкі Сафійскі сабор (фота з буклета); пад зводамі храма; старажытныя фрэскі; захаваныя фрагменты кладкі.

Фота аўтара

Паразважаем

Зводны план — не догма

З Брэста і Брэсцкай вобласці паступіла шмат прапаноў паводле "Зводнага плана (праекта) установак манументальных збудаванняў у Рэспубліцы Беларусь у 2009 — 2012 гг". "Гэта добра, што складаецца такі план, — пацвердзіў галоўны спецыяліст па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Упраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама, сакратар каардынацыйнага савета па ахове матэрыяльнай і духоўнай спадчыны Леанід НЕСЦЯРЧУК. — Але план, які цяпер праходзіць экспертызу — не догма. Гісторыя, жыццё падкажуць, што трэба рабіць найперш. Нешта ў план дадаецца новае, ад нечага — адмаўляемся. І добра, што план убачылі і змаглі абмеркаваць рэгіёны".

За апошнія 5 гадоў па Брэсцкай вобласці ўсталявалі больш як 60 мемарыяльных знакаў, дошак, манументальных кампазіцый. Сярод іх — помнік уладзіміра-валынскаму князю Уладзіміру Васількавічу і княгіні Вользе ў Кобрыне, рэлігійнаму асветніку Афанасію Філіповічу, помнік да 1000-годдзя заснавання Брэста, спаленым вёскам у Пружанах.

У Пружанскім жа раёне плануецца ўстанавіць мемарыяльны знак у гонар Міхаіла Баброўскага, філосафа і рэлігійнага дзеяча XIX ст. Гэта адбудзецца на яго радзіме ў г.п. Шэрашава. Рыхтуецца мемарыяльны знак да 200-годдзя з дня нараджэння Ю. Крашэўскага, знакамітага пісьменніка XIX ст. Мяркуецца, што ён будзе ўстаноўлены ў юбілейны 2012 год.

У вёсцы Скокі Брэсцкага раёна неабходна ўстанавіць мемарыяльны знак да 250-годдзя з дня нараджэння пісьменніка XVIII — XIX стст. Юльяна Нямцэвіча. Юбілейная дата адзначалася нядаўна, але ў сувязі з тым, што палац цяпер знаходзіцца ў стадыі рэстаўрацыі, вырашана зрабіць гэта ў 2010 годзе, калі завершыцца аднаўленне сядзібнага дома. Там жа плануецца размясціць раённы музей гісторыі Прыбужжа.

У 2010 годзе ў вёсцы Ясянец Баранавіцкага раёна павінен з'явіцца мемарыяльны знак у гонар апошняга канцлера ВКЛ Іахіма Храптовіча. А ў самы бліжэйшы час — яшчэ ў 2009 годзе плануецца ўстанавіць мемарыяльную дошку на доме, дзе жыла паэтка Ніна Мацяш...

Ярына РЫТАМІНСКАЯ



Протаіерэй Свята-Духава кафедральнага сабора Сергій ГАРДУН вядомы найперш па каментарыях на беларускай мове падчас прамых тэлетрансляцый святочных богаслужэнняў, па шчырых палемічных выступленнях у радыёэфіры і пропаведзях у храмах, якія прамаўляе толькі па-беларуску.

Вызнаваць сваю веру на роднай мове

Загадчык кафедры біблеістыкі і хрысціянскага веравучэння Інстытута тэалогіі БДУ, кандыдат багаслоўя і дацэнт, айцец Сергій пераклаў на беларускую мову малітвы перад Споведдзю, Божественную Літургію свц. Іаана Залатавуста, Вялікую вячэрню, паследаванне Заручын і Вянчання, інш. Частка іх увайшла ў "Праваслаўны малітваслоў", які быў выдадзены ў 2004 годзе. Айцец Сергій працуе ў складзе Біблейскай камісіі Беларускай Праваслаўнай Царквы ад пачатку і да сённяшніх дзён. Ён з'яўляецца рэдактарам перакладаў.

— Айцец Сергій, як прыйшла ідэя сабрацца энтузіястам, і чаму 1989 год стаўся кропкай адліку?

— Самай галоўнай прычынай была папярэдняя вялікая дата святкавання тысячагоддзя хрышчэння Русі ў 1988 годзе. Быў яшчэ савецкі час. Я памятаю, у Мінскім епархіяльным управленні адбылася навуковая канферэнцыя, і на яе былі запрошаны прадстаўнікі свецкай інтэлігенцыі, філолагі, гісторыкі. І, канечне, багасловы. Я быў тады выкладчыкам Маскоўскай духоўнай семінарыі і зрабіў выступленне. Прычым, я прывык, што на нашых царкоўных пасяджэннях на той час ужывалася толькі руская мова. А паколькі былі нашы беларускія гісторыкі і філолагі, некалькі выступленняў прагучалі па-беларуску. І хаця тэкст майго даклада быў поўнасцю напісаны па-руску, я пачаў па-беларуску яго пераказваць. На гэта звярнулі ўвагу. А пасля і ўзнікла ідэя: нам разам трэба займацца перакладамі, у тым ліку і Свяшчэннага Пісання. Ідэю многія падхапілі. І была створана Біблейская камісія.

— Дзейнасць камісіі прыпала на той час, калі Беларусь будавала сваю незалежнасць і сцвярджала сябе як самастойная дзяржава. Мова як асноўны сродак зносін у краіне, таксама прыцягнула да сябе ўвагу. Як жа фарміраваліся прынцыпы перакладу царкоўных тэкстаў на беларускую мову?

— На першых пасяджэннях мы шмат дыскутавалі. У склад камісіі ўваходзілі вельмі розныя людзі, у тым ліку і сур'ёзныя перакладчыкі — Алесь Разанаў, Васіль Сёмуха. З іншага боку — багасловы. У нас былі трохі іншыя падыходы. Літаратары бачылі перад сабою найперш мастацкі пераклад. А для царквы патрэбны пераклад іншы. Не даслоўны, — пераклад не можа быць падрадкоўнікам. Тым не менш, па магчымасці ён павінен быць вельмі дакладны. Мы звярнуліся да вопыту перакладу Свяшчэннага Пісання на рускую мову ў XIX ст. — ён быў зроблены толькі тады. Скажам, Пушкін і Лермантаў не маглі чытаць Біблію па-руску. Тады былі выпрацаваны правілы перакладу. Канечне, нельга захаваць арыгінальны парадак слоў пры перакладзе з адной мовы на другую. Але Біблія падзелена на раздзелы. А ўнутры раздзелаў сціхі. Дарэчы, у двухтомным руска-беларускім слоўніку, калі гаворка ідзе пра сціхі Біблії, чамусьці паказана слова *сціх*, а не *верш*... Дык вось, тады яшчэ рашылі не пераносіць слова з аднаго сціха ў другі і па магчымасці не рабіць перастановак у фразах.

Дапусцім, самая першая фраза, з чаго пачынаецца Біблія: "Напачатку Бог стварыў Неба і Зямлю". У самым папулярным перакладзе Біблії на англійскую гэты выраз гучыць так: "Напачатку Бог стварыў Сусвет". А каментатары Свяшчэннага Пісання, Васілій Вялікі, Іаан Залатавуст і ранейшыя і пазнейшыя аўтары пішуць свае тлумачэнні, у якіх *Неба* — не фізічнае неба, а духоўны, ангельскі свет. А *Зямля* — свет матэрыяльны. І таму ў нашым царкоўным перакладзе павінна гэта прысутнічаць. Такіх прыкладаў можна прывесці сотні. Таму лічыцца, што розныя пераклады могуць быць для розных катэгорый насельніцтва. Адны — для царкоўных людзей, якія хочуць ведаць дасканала Свяшчэннае Пісанне, а для людзей, якія толькі знаёмяцца са Свяшчэнным Пісаннем — павінны быць пераклады, якія стылёва будуць прачытвацца прасцей.

У нас жа найперш стаяла задача мець дакладны, багаслоўска вывераны тэкст. Гэта не заўсёды ўспрымалася, і, можа быць, было адной з прычын, чаму Васіль Сёмуха выйшаў з камісіі і стаў рабіць свой пераклад. І ён пераклаў Энвангелле ад Матфея. А пазней уся Біблія выйшла ў яго перакладзе.

— Наколькі запатрабаваныя пераклады Евангелляў цяпер? І ўвогуле — як можа сёння царква дапамагчы ў пашырэнні беларускай мовы? Моўная сітуацыя ў наш час вельмі складаная...

— Калі мы пачыналі працаваць, у 1989 годзе, краіна не была яшчэ незалежнай, але былі нейкія прадчуванні. А калі краіна стала самастойнай, пачаўся працэс беларусізацыі, вельмі прадуманы, ён ішоў паступова і разумна. І шкада, што спыніўся. Але беларусы застаюцца беларусамі. І з кожным новым пакаленнем з'яўляюцца энтузіясты, якія хочуць, каб мова жыла, яны жадаюць на беларускай мове чытаць і маліцца. І мець самую галоўную, самую патрэбную і важную кнігу — Біблію — на роднай мове. Таму я ўпэўнены, што нашы пераклады будуць усё больш і больш запатрабаваныя. Нават не толькі ў Беларусі. Калі мы выдалі Богаслужэбнае Евангелле на беларускай мове, то на яго звярнулі ўвагу нашы суайчыннікі, беларусы з Польшчы. Яны запрасілі столькі экземпляраў выдання, што мы не маглі іх забяспечыць. Тады яны ў сябе перавыдалі: беларускае богаслужэбнае Евангелле выйшла ў Польшчы. Цяпер з'яўляюцца нават працы па аналізе мовы перакладу.

Я ўпэўнены, што сітуацыя з мовай павінна мяняцца. Гэта праблема суверэнітэту і нацыянальнай годнасці. І мова будзе жыць! Што да царквы — мне здаецца, тое, што мы робім гэтыя пераклады і паступова ў храмах уводзяцца богаслужэнні на беларускай мове — мы ў нейкай меры спрыяем яе пашырэнню.

— Шмат вядзецца цяпер дыскусій пра выкладанне ў школах курса асноў праваслаўнай культуры. Ён актыўна ўкараняецца ў школах Расіі. Ці будзе такі прадмет у нас? І ці магчымае выданне для яго беларускамоўных падручнікаў?

— Безумоўна, гэта было б вельмі карысна. Гэта дапамагло б вырашыць многія пытанні выхаваўчай працы ў школе з дзецьмі, калі б у школе ўвялі такі прадмет. Натуральна, што павінны быць і падручнікі. Што да мовы выкладання, то я вельмі б хацеў беларускую. Лічу абсалютна нармальным, каб ва ўсіх школах Беларусі ішло выкладанне на беларускай мове. А не на рускай альбо польскай. Чалавек можа ведаць столькі моў, колькі ён хоча, але на першым месцы павінна быць родная.

— Айцец Сергій, калі ў вас пытаюцца дзе вы вывучалі родную мову...

— Адказваю коратка: толькі ў школе, і больш нідзе. І справа нават не ў настаўніках — хутчэй у свядомасці. Яна ўзнікла ў самых малодшых класах. Можа, у выніку той рэальнасці, якая была вакол. Першыя 10 гадоў свайго жыцця я пражыў без тэлевізара, без радыё. Нават без электрычнасці. І не чуў рускай мовы праз сродкі масавай інфармацыі. Мае бацькі і самыя блізкія сваякі не ўмелі размаўляць па-руску. Таму, калі мяне аддавалі ў школу, а яна была руская з першага класа, то бацькі вельмі непакоіліся, што я не буду разумець. Помню, вялікі клас, 42 вучні. Настаўніца каля дошкі ставіць малюнкі з рознымі прадметамі, называе слова, якое на малюнку трэба паказаць. Яна прамаўляе слова "глаз" — і ніводнай паднятай рукі! А калі яна сказала іначай — "око", то тады ўсе зразумелі. Вось гэтыя першыя вясковыя ўражанні паставілі перада мною некалькі пытанняў. Помню, пытаўся ў бацькоў: чаму ж у школе вучаць нас па-руску? Потым, калі беларуская мова паявілася як прадмет у школе, я адчуў цёплае пачуццё. А як сталі чытаць беларускія кніжкі, то адчулі, што гэта бліжэй да таго, як мы гаворым...

Гутарыла Ірына ТУЛУПАВА
Фота Кастуся Дробава

Каб служыць Слову словам

23 снежня 1989 года адбылося першае пасяджэнне Біблейскай камісіі Беларускай Праваслаўнай Царквы па перакладзе Свяшчэннага Пісання на беларускую мову. Камісія налічвала 20 чалавек.

Сабраў і з'яднаў усіх для выканання пачэснай справы Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, Патрыяршы экзарх усяе Беларусі Філарэт. Сабраў, глыбока ўсведамляючы, што беларускае слова павінна стаць словам Пісання. Бо — гэта дар Божы народу гэтай зямлі.

Думаецца, што менавіта гэтая высокая мэта дапамагала на працягу ўсіх мінулых гадоў трываць і нападкі, і папрокі, і абвінавачанні, якія сыпаліся з усіх бакоў і нязмоўкла паўтаралі: беларуская мова ў Царкве — гэта раскол, гэта ерась, гэта "чарговае дакрананне да ран Хрыстовых".

Тым часам, пасаджанае клапатлівай рукой сейбіта, слова беларускае памалу ўзрастала "у дварах дома Бога нашага".

Пасля выдання ў 1991 годзе першага з чатырох Евангелляў — Евангелля паводле Матфея ў перакладзе Біблейскай камісіі, далейшая праца над перакладам на пэўны час прыпынілася.

Але шчодрая царкоўная глеба ўжо давала парасткі з пасеянага на ёй.

На пачатку 1992 года стварылася Брацтва ў гонар Віленскіх мучанікаў пры Свята-Петрапаўлаўскім саборы Мінска. Брацтва аб'яднала беларускую інтэлігенцыю, якая шукала і прагла беларускага царкоўнага слова.

Увосень 1995 года адбылося пашыранае пасяджэнне Біблейскай камісіі, дзе было вырашана абавязкі па арганізацыі работы камісіі ўскласці на Брацтва. Старшынёй камісіі па-ранейшаму застаўся Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт. Намеснікам старшыні быў прызначаны протаіерэй Георгій Латушка, сакратаром камісіі з'яўляецца прафесар Іван Чарота, адказным рэдактарам перакладу — протаіерэй Сергій Гардун. На працягу гэтых гадоў былі перакладзены і выдадзены Святое Евангелле паводле Марка (1999 г.); Святое Евангелле паводле Лукі (2002 г.); Святое Евангелле паводле Іаана (2005 г.);

Апошнім стала леташняе выданне богаслужэбнага Свяшчэннага Евангелля на беларускай мове. Цікавымі для чытачоў сталі і прадмовы да кожнага з чатырох Дабравесцяў.

У наступным, 2010 годзе плануецца выдаць 5-ю кнігу серыі "Новы Запавет Госпада нашага Ісуса Хрыста" — Дзеянні Святых Апосталаў з паралельнымі тэкстамі на грэчаскай, царкоўнаславянскай і рускай мовах. Саборныя Пасланні і Пасланне да рымлянаў святога апостала Паўла складуць кнігу 6-ю вышэйназванай серыі.

Адначасова з перакладам Свяшчэннага Пісання на працягу ўсіх гэтых гадоў вяліся пераклады богаслужэбных тэкстаў на беларускую мову. Яшчэ ў 1993 годзе па просьбе Брацтва пісьменнік Анатоль Клышка пераклаў Акафіст святым Віленскім мучанікам Антонію, Іаану і Яўстафію. Дарэчы, Малебен за беларускі народ з гэтым Акафістам і дагэтуль кожную сераду служаць у Петрапаўлаўскім саборы перад іконай Віленскіх мучанікаў. Крыху пазней Анатоль Клышка зрабіў пераклад Акафіста іконе Божае Маці "Усіх гаротных Радасць". Між іншым, А.Клышка зрабіў свой аўтарскі пераклад чатырох Евангелляў. Гэты пераклад быў надрукаваны ў часопісе "Спадчына". Ведаем, што Анатоль Канстанцінавіч і далей працуе над перакладам Новага Запавету.

Але вернемся да богаслужэбных перакладаў. Іх з'яўленне было прадыктавана патрэбаю часу. У пачатку і сярэдзіне 1990-х гадоў у Царкву пачалі звяртацца людзі з просьбамі павянчаць альбо пахрысціць на беларускай мове.

Паследаванне Заручын і Вянчання папрасілі перакласці Анатоля Клышку. Чын Хрышчэння пераклалі Уладзімір Васілевіч і Анатоль Астапенка. У аснову Малебна і Паніхіды былі пакладзены значна адрэдагаваныя тэксты, выдадзеныя раней у беларускай дыяспары ў Канадзе. Безумоўна, тыя першыя пераклады былі недасканалымі, патрабавалі грунтоўнай рэдакцыі, як моўнай, так і багаслоўскай. Таму, пачынаючы з 1996 года, протаіерэй Сергій Гардун актыўна і паслядоўна заняўся перакладам на беларускую мову богаслужэбных і літургічных тэкстаў.

Пасля завяршэння айцом Сергіем перакладу Божественнай Літургіі святіцеля Іаана Залатавуста, яна загучала ў Свята-Петрапаўлаўскім саборы Мінска.

Літургію па-беларуску. Так "адзінымі вуснамі і адзіным сэрцам" славілі Госпада ўпершыню словамі роднай мовы... Калі цяпер думаеш пра гэта, то душа напаўняецца ціхай радасцю і спадзяваннем, што спагляну Гасподзь і на яе — нашу родную, намі самімі знядбаную, прыгнечаную, адкінутую... Спагляну з любоўю, узняў з долу і ўдзьмухну жыццёвыя сілы: вось так, з малітвай, можа і акрыяе яна...

Пасля першай беларускай Літургіі некаторыя з тых, хто адмовіўся ўдзельнічаць у ёй, падыходзілі і казалі: "Прабачце, мы памыляліся". Але было нямала і такіх людзей, якія перасталі хадзіць у Петрапаўлаўскі сабор з-за таго, што тут служаць Літургію па-беларуску. Тым не менш, традыцыя гэтая ў саборы ўкаранілася, а з 2002 года беларускую Літургію сталі служыць кожную суботу. Большасць святароў сабора не толькі служыць, але і цудоўна прапаведуе па-беларуску.

Запісаны аудыёдыскі з богаслужэннямі на беларускай мове. Такім чынам, дзейнасць па перакладзе на беларускую мову Свяшчэннага Пісання і богаслужэбных тэкстаў — гэта адзін з напрамкаў агульнацаркоўнага жыцця, скіраваны на пашырэнне асветы, на ўмацаванне духоўнай традыцыі беларускага народа.

Таццяна МАТРУНЧЫК,
супрацоўніца выдавецкага аддзела Брацтва ў гонар Віленскіх мучанікаў.

Сумленныя кібаргі: героі нашага часу ў творчасці розных літпакаленняў

Кандыдацкі мінімум

Першаштуршком чарговага "Кандыдацкага мінімуму" сталася праблема даволі... банальная. Літаратура як частка культуры з'яўляецца рэзервуарам і адначасова своеасаблівым "механізмам" трансляцыі разнастайнага вопыту — культурнага, сацыяльнага, духоўна-маральнага, мастацкага і г.д. У сувязі з гэтым відавочна, што паводле літаратурных твораў калісьці будуць меркаваць пра наш час і яго "герояў", якіх, дарэчы, ужо сёння чакае — не дачакаецца грамадства ад пісьменнікаў. Тыя ж, у сваю чаргу, час і натхненне не марнуюць: у кожным літаратурным пакаленні з большай ці меншай пэўнасцю акрэсліваецца нейкі "сукупны" вобраз-персанаж, у якім адбіваецца не толькі сама эпоха, але і стасункі з ёю ўласна літаратараў.

Вядома, абіраючы згаданую тэму для абмеркавання на старонках "ЛіМа", удзельнікі "Кандыдацкага мінімуму" свядома ставяць сябе ў непамыснае становішча, паколькі гутаркі падобнага кшталту па вызначэнні "цяжарныя" фрагментарнасцю і адначасова залішняй абагуленасцю высноў, нематываванай з пункта гледжання старонняга назіральніка "выбіральнасцю" ў дачыненні да фактаў (постацяў, з'яў, твораў і г.д.). Што ж: мы не шукаем простых шляхоў да чытача (і да будучыні таксама)...

Ірына Шаўлякова. Сёння ў беларускай літаратурнай прасторы з большым ці меншым імпэтам працуюць розныя літаратурныя пакаленні. Наколькі кожнае з іх здолела ўжо цяпер "сфармуляваць" (ці "сфарміраваць") умоўнага героя свайго часу? Наколькі гэтыя героі жыццяздольныя, якія з іх найбольш цікавыя сённяшняй чытацкай аўдыторыі?

Лада Алейнік. Калі звяртацца да гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя, становіцца відавочна, што ў першай трэці яго ў творчасці тагачасных пісьменнікаў пэўна акрэсліўся цэлы шэраг вобразаў-тыпаў — герой-селянін, герой-рабочы, герой-салдат і г.д. Адметны герой адпаведнай эпохі сфарміраваўся ў 1920-х у творчасці М. Гарэцкага, Л. Калюгі, А. Мрыя... У нас жа нейкага пэўнага героя сёння не вымалёўваецца. Герой пісьменнікаў-сучаснікаў вызначаецца хіба што ўласнай расчараванасцю ва ўсім, калі згадаць М. Гарэцкага, "ад зямлі адарваны, да неба не дасталы"...

І. Ш. На мой погляд, тып героя "задуменнага", схільнага да рэфлексіі, самаасэнсавання, інтэлігента (часам — інтэлектуала), які лунае паміж небам і зямлёй, найбольш аб'ёмна сёння выяўлены ў творчасці так званага сярэдзіннага пакалення беларускіх празаікаў: згадаю, напрыклад, героя аповесці А. Бадака "Адзінокі васьмікласнік хоча пазнаёміцца" альбо персанажаў А. Казлова, А. Брава, П. Васючэнкі... Яны па-рознаму, але амаль усе "задуменныя", нагадваюць мне чалавека, які з пункта "А" ўжо выйшаў — а да якогасьці іншага яшчэ не дайшоў. Калі дадаць сюды яшчэ вобразы-персанажы, створаныя А. Глобусам і У. Сцяпанам, то можна сцвярджаць, што ў параўнанні з персанажамі іх маладых калег празаікі гэтага пакалення паслядоўна фарміруюць менавіта *я*-героя.

Л. А. Мне падаецца, што героі згаданых празаікаў залішне розныя, каб іх можна было аб'яднаць у нейкі "сукупны" персанаж. Напрыклад, героі А. Федарэнкі перадусім самазаглыбленыя; У. Сцяпан стварае вобразы ўдумлівых, назіральных, пільных да свету людзей. Але ёсць персанажы, якія мне асабіста падаюцца зусім "пустымі" — напрыклад, гераіні твораў А. Брава...

Марыя Шамякіна. Але і гэтыя гераіні ўвасабляюць пэўны чалавечы тып, тып чалавека, які праз усё жыццё пакутуе ад уласных велізарных амбіцый ды комплексаў. І гэтым самым падобныя персанажы выконваюць сваё прызначэнне. Так, за апошні час У. Дамашэвіч напісаў некалькі раманаў з прыблізна аднолькавым героем, галоўная рыса якога заключаецца ў тым, што ён — нацыянальна свядомы. З гэтай рысай губляецца ўсё астатняе. Дык ці можна гаварыць, што пісьменніку ўдалося стварыць вобраз-тып?..

Ігар Запрудскі. Мне здаецца, што трэба было ад пачатку канстатаваць: "герояў нашага часу" як такіх у сусветнай літаратуры можна па пальцах пералічыць. Намаляваць героя свайго часу дадзена далёка не кожнаму, а пра сваё пакаленне і ўвогуле няма чаго гаварыць. З найбліжэйшых прыкладаў — пашанцавала М. Лермантаву. А вось ва ўсёй беларускай літаратуры намаляваў героя свайго часу толькі адзін чалавек, пісьменнік з трагічнай доляй — А. Мрый у рамане "Запіскі Самсона Самасуя". Ён здолеў паказаць новы тып чалавека — савецкага чыноўніка, прадстаўніка наменклатуры 1920-х гадоў так "навацыйна", як больш ніхто не здолеў.

У сувязі з гэтым надзвычай істотным становіцца яшчэ адзін фактар: той часавы адрэзак, пра які ідзе гаворка. А. Мрый маляваў вобразы сваіх сучаснікаў. Калі гаварыць пра наш час, то непасрэдна пра сённяшні дзень пішуць маладыя (можа, з прычыны адсутнасці жыццёвага вопыту?) і...

Л. А. Пра сябе дакладна піша Адам Глобус: ён вымалёўвае найперш сучасніка і сучаснасць.

І. З. Згодны. Пра сучаснасць піша таксама А. Казлоў. А вось у А. Федарэнкі найбольш атрымліваюцца тыя героі, якія ад нашага сёння знаходзяцца на адлегласці 10 — 20 гадоў. У мяне нават складваецца ўражанне, што гэта сярэдзіннае пакаленне, на якім вы акцэнтавалі ўвагу, — разгубленае, яно не ведае сучаснага жыцця; яно на паперы фіксуе сваю разгубленасць. Гэтае пакаленне не можа "вывесці" героя свайго часу, таму што яно незнаёмае з ім. Таму герояў прадстаўнікі гэтага пакалення пішуць з саміх сябе, герояў культурных, інтэлігентных, — словам, нетыповых для часу; згаданыя героі яўныя маргіналы ў сваім часе.

І. Ш. У пэўным сэнсе, на карысць меркавання Ігара сведчаць "неарамантычныя" героі ды гераіні гісторыка-асветніцкіх празаічных твораў Л. Рублеўскай. Разам з тым, найноўшая літаратура, як правіла, суадносіцца з літаратурным працэсам 1990-х — пачатку 2000-х гадоў; таму калі А. Федарэнка апісвае падзеі дзесяцігадовай даўніны і выпісвае ў іх дэкарацыях тых ці іншых персанажаў — ён таксама фарміруе героя нашага часу.

Мне праблема бачыцца крыху ў іншым. Персанажы, якія выштукоўваюцца ў паэзіі і прозе пакалення трыццацігадовых (і дваццацігадовых), якія ў мастацкіх адносінах паўстаюць відавочна менш дасканалымі і больш схематычнымі, чым "разгубленыя" героі сярэдзіннага пакалення, адначасова ёсць больш агрэсіўнымі. Ці не выцясняе за кошт гэтай культурнай агрэсіі персанаж трыццацігадовых на перыферыю чытацкай (і ў цэлым грамадскай) увагі тыя вобразы-тыпы, якія высноўваюцца і ў творах сярэдзіннага, і ў творах старэйшага пісьменніцкага пакаленняў. У дачыненні да апошняга згадаю адносна нядаўнюю прозу В. Казько, А. Жука, В. Карамазава; іх героі таксама ў пэўным сэнсе "разгубленыя", але гэта ўжо разгубленасць прасветленая, мудра-прасветленая. І калі хто-небудзь пачынае патрабаваць ад найноўшай літаратуры героя-"праметэя", за якім можна хоць куды-небудзь пайсці, чамусьці не бярэцца пад увагу тое, што ў кожнай культуры (як і ў кожнай эпосе) — свае праметэі. Мне здаецца, што якраз у лепшых творах нашага старэйшага літаратурнага пакалення (размова перадусім пра тых, хто сёння піша і хаця б зрэдку друкуе свае творы) амаль няма герояў-"праметэяў" трыбуннага тыпу; але своеасаблівым "лірычным праметэізмам" надзелены вельмі многія персанажы. Аднак моладзь, чыю ўвагу ў сілу відавочных прычын прыцягваюць героі больш агрэсіўныя, мяркуе пра героя найноўшага часу па творах маладзейшых літаратараў, "сукупны персанаж" якіх нават з пункта гледжання пакалення бацькоў паўстае гэткім "франкенштэйнам", складзеным з мадэрнізаваных фрагментаў ваганта, бітніка, прайдзісвета, латрыгі ды абібока.

І. З. У тым і справа, што для сённяшняй моладзі спадары Федарэнка, Глобус, Сцяпан, Наварыч, Казлоў выйшлі з 1980-х. Усе яны думалі, што зробяць рэвалюцыю ў літаратуры. Але рэвалюцыю ім не дадзена было здзейсніць па адной простай прычыне: яны выйшлі з *maro*, савецкага часу; яны спрабавалі, як той Анатоль Сыс, адмовіць "старую" традыцыю, але насамрэч зрабіць гэта так і не здолелі.

М. Ш. Культурны канфлікт пакаленняў існаваў заўсёды. Кожнае новае пакаленне творцаў сцвярджала, што да іх прыходу ў мастацтва не было нікога. Аднак не такое адмаўленне нараджае герояў эпохі. Пасля сыходу чарговых "рэвалюцыянераў" агледзішся наўкола: удалося ім стварыць эпахальныя ці хаця б тыповыя вобразы? Як правіла, не.

І. З. Справа ў тым, што калі "героя" няма ў гэтым часе, яго пачынаюць шукаць у часе іншым. Зусім невыпадкова Л. Рублеўская піша пра XIX стагоддзе, Н. Ракіціна ў "Ганнітве" звяртаецца да паўстання 1830 — 1831 гадоў, А. Наварыч у "Літоўскім воўку" — да падзей 1860-х гадоў; згадаем таксама Я. Конева з яго псеўдадакументальнымі творамі пра Т. Касцюшку, — усе гэтыя ды іншыя прыклады сведчаць пра пошук героя ў мінулым. Іншая справа, наколькі гэтыя пошукі перспектыўныя....

Л. А. А сапраўдны герой, відаць, заўсёды выяўляецца з пэўнай адлегласці ў часе і пры той найважнейшай умове, што пісьменніка шчыра хвалюе тое, пра што ён піша. Калі аўтар апісвае тое, што ім насамрэч глыбока перажыта або перажываецца, што вярэдзіць яго душу, гэта — *сумленная* творчасць. Калі ж пісьменнік садзіцца за стол ці камп'ютэр і мае перад сабой мэту, скажам, стварыць скандал з пустаты, — вось гэта несумленна. Для мяне сумленны Федарэнка; для мяне сумленны (хтосьці можа з гэтага парагатаць) Глобус, бо ён шчыры, адкрыты; сумленны той жа У. Сцяпан...

І. Ш. Мы быццам у трох соснах блукаем: Федарэнка — Глобус — Сцяпан...

М. Ш. А гэта цалкам заканамерна. І згаданыя аўтары, і яшчэ некаторыя, што прыйшлі ў літаратуру напрыканцы 1980-х, сапраўды здзейсніліся як пісьменнікі. Я назвала б іх падыход да рэчаіснасці не столькі сумленнасцю, колькі цвярозым розумам: яны апісвалі тое, што бачылі, што іх закранула; яны не палічылі патрэбным штосьці праз сілу вымышляць, прыдумляць, вычварацца. Сёння ж пісьменнік азіраецца наўкола ў пошуках найбольш актуальных праблем і тэм: вось багатыя і бедныя, а вось — адсутнасць нацыянальнай свядомасці ў беларусаў... І з'яўляецца штучны, нацыянальна свядомы чалавек, не больш "жывы", чым нацыянальна свядомы кібарг альбо рабакоп. У такім выпадку не застаецца месца не толькі для жыццёвасці, але і для элементарнай натуральнасці...

І. Ш. Давайце паспрабуем канкрэтызаваць і пашырыць (за кошт паэтычных, напрыклад, твораў) развагі пра герояў нашага часу, што нараджаюцца сёння нашымі пісьменнікамі. У якіх тэкстах альбо кнігах апошняга часу вы сустракалі персанажаў, з якімі, на вашу думку, найбольш поўна ідэнтыфікуе сябе тое ці іншае літаратурнае пакаленне?

М. Ш. Я думаю, што не толькі сёння, але і доўга яшчэ для сярэдняга пакалення гараджан цэнтральным будзе заставацца персанаж, які дзяцінства правёў у вёсцы, а ў горадзе яму ўсё нешта муляе...

Л. А. Мне здаецца, вельмі характэрных герояў стварае А. Казлоў: адны — разгубленыя, самотныя, іншыя — юрлівыя; так, у двух розных творах — у "Горадзе ў нябёсах" і "Юргоне" — два розныя вобразы-тыпы, і абодвух у пэўным сэнсе можна залічыць да герояў нашага часу. І гераіні Л. Рублеўскай, часткова спісаныя з самой аўтаркі, таксама займаюць сваё месца ў сённяшнім пантэоне герояў часу, многіх чытачоў прываблівающь сваёй вечнай закаханасцю, рамантычнасцю і г.д. Таксама нягледзячы на маё крытычнае стаўленне да творчасці Ю. Станкевіча мушу згадаць і яго адметныя "антыутапічныя" вобразы-персанажы. З задавальненнем чытала і дэбютную кнігу Ю. Нератка, які шукае арыгінальныя прыёмы раскрыцця ўнутранага свету сваіх герояў...

А ўвогуле, неяк на дачы я колькі дзён запар чытала выключна творы маладых, як кажуць, надзвычай адораных, аўтараў. Дык каб вы ведалі, з якім задавальненнем я пасля ўсяго гэтага сучаснага ды моднага перачытвала "Вёску" Федарэнкі!..

М. Ш. З не меншым, відаць, задавальненнем ужо некалькі гадоў я перачытваю кнігу Н. Кучмель "Імгненні", нашу яе з сабой, хаця многія вершы на памяць ведаю. Што ў ёй такога незвычайнага — я не разумею, але нешта ў гэтай кнізе мяне бясконца кранае. І ў той жа час мне падабаюцца вершы В. Трэнас, В. Морт, бо я адчуваю ў іх нейкі дзіўны патэнцыял: можна сказаць, што *формай* яны адпавядаюць нашаму часу. Але што ў іх адбываецца са *зместам*: рэальныя праблемы рэальнага жыцця (дзе ўзяць грошай? як атрымаць пакой у інтэрнаце?) у іх вершах ніяк не адбіваюцца.

І. Ш. Магчыма, і адбіваюцца, але ў адмысловай, ускладненай сімвалічнай форме...

М. Ш. Відаць, у настолькі адмысловай, што пазнаць рэчаіснасць ніяк не выпадае. Калі гэта каханне, дык каханне "без адрасата", праўда, абавязкова няшчаснае; калі

размова пра смерць, самазабойства, дык з невядомае прычыны. Вось калі б было напісана: "Настолькі няма грошай, і ніхто не бярэ на працу, што я думаю: парэжу вены, усё адно за кватэру няма чым плаціць", тады б чытач падумаў: "А гэта ж пра мяне!.." Я чамусьці ўвесь час чакаю, што В. Морт менавіта так і напіша: у лоб, пра сапраўдныя праблемы, напрыклад, пра амерыканскі аэрапорт ці пра птушыны грып...

І. З. Давайце ўсё-такі гаварыць пра сапраўдных паэтаў. Гэта не камень у адрас В. Морт ці кагосьці яшчэ. Вось Н. Кучмель — *паэтка*, а гэта сёння вялікая рэдкасць. Адзіную яе кнігу можна чытаць і перачытваць па той прычыне, што яна піша перадусім пра сябе, і яна — сапраўдная. Бо пра тое ж самае сотні іншых людзей пішуць — а чытаць амаль немагчыма. А калі няма пра што пісаць — пачынаецца *непаэзія*.

Дарэчы, Н. Кучмель я параўнаў бы з Сысом — толькі ў жаночым паэтычным ува сабленні. Ёсць у іх штосьці блізкае...

М. Ш. Абсалютная натуральнасць гучання.

І. З. Так: класічнае гучанне, натуральнасць паэтычнага маўлення — і ў той жа час эфект навізны.

М. Ш. У сувязі з гэтым мне здаецца, што і героя, і літаратуру, і перадусім паэзію губіць сцёб.

І. З. Калі згадаць у гэтым кантэксце М. Мартысевіч, то відавочна, што ўся яе паэзія — выключна правакацыйная. Колькі падобных рускіх паэтак было ў пачатку XX стагоддзя — і чым скончылася?.. Зададзімся пытаннем: наколькі хопіць спадарыні Мартысевіч яе правакацыйнасці? Цудоўна разумею, навошта шаноўная аўтарка імкнецца з дапамогай сваёй сексуальна разняволенай лірычнай гераіні эпаціраваць нашу цнатлівую публіку: каб усе заўважылі саму шаноўную Мартысевіч. Бо ўсе літаратары, па вялікім рахунку, думаюць не пра тое, як напісаць сумленную кнігу; кожны, хто піша, хоча, каб яго заўважылі, прачыталі і ацанілі.

І. Ш. А крытык Ігар Запрудскі не хоча, каб яго заўважылі, прачыталі і ацанілі?

І. З. Хачу. Але гутарка не пра мяне... Дарэчы, сёння існуе яшчэ адна тэндэнцыя: пашырэнне ў полі мастацкай літаратуры дакументальнага жанру. Згадаем, напрыклад, дзённікі І. Шамякіна "На апошнім перагоне", дзённікі У. Дамашэвіча, якія з нумара ў нумар друкавала "Маладосць", ці нядаўнюю публікацыю дзённікаў Н. Гілевіча.

Л. А. Так, па дакументальнай ("нявыдуманай") прозе таксама будзе вызначацца вобраз нашага сучасніка.

І. Ш. Крыху раней мы гаварылі пра тое, што пісьменнік, які не можа знайсці героя ў сваім часе, шукае яго ў іншым. Цікава, што пашырэнне дзённікава-мемуарнага жанру таксама можа быць сімптомам творчай незадаволенасці пісьменніка сучаснасцю: калі ён не можа адшукаць героя вакол сябе, ён скіроўвае ўласную ўвагу на сябе самога, робіць героем часу самога сябе, як, напрыклад, сталася ў "Мяжы" А. Федарэнкі...

Л. А. Мініяцюры Глобуса і Сцяпана — таксама ў пэўным сэнсе дакументальная проза.

І. Ш. А хто ёсць героем сённяшняй беларускай літаратурнай крытыкі?

Л. А. Для мяне — Л. Галубовіч. Я люблю яго паэзію, яго "Зацемкі з левай кішэні"; ён бліскуча выявіўся ў крытыцы. Не менш люблю і прозу А. Федарэнкі, які піша магутна, шчыра; яго насамрэч можна назваць класікам сучаснай літаратуры. Вось герой майго часу — творчая асоба, у дачыненні да якой якраз і варта гаварыць пра сумленнасць.

І. З. Калісьці М. Булгакаў пісаў "Запіскі на манжэтах", зараз А. Федарэнка піша "Сечку", Л. Галубовіч — "Зацемкі...". Усё гэта — мадыфікацыі жанру лірычнай мініяцюры, заснавальнікам якога ў беларускай літаратуры быў Зм. Бядуля, а найбольш вядомым рэпрэзентантам — Я. Брыль. Калісьці да іх "карацелек" ставіліся вельмі неадназначна. Напрыклад, некаторыя пісьменнікі папракалі Я. Брыля ў нежаданні працаваць над сюжэтам. Але парадаксальная сітуацыя: прайшло колькі гадоў і аказваецца, што Я. Брыль нібыта прадчуваў сённяшнюю папулярнасць прозы менавіта такога кшталту. Я сам уражаны. Сёння ці не ўсе кінуліся пісаць мініяцюры. Думаю, што яшчэ праз гадоў пяць не будзе ні раманаў, ні паэм, ні балад — будуць адны толькі "зацемкі".

М. Ш. Калі гаварыць пра сваіх "герояў", прызнаюся, што своеасаблівым героем сённяшняга літаратурнага працэсу мне бачыцца В. Іваноў, якога, бадай, усё ж такі загубіць сцёб. А шкада.

Што ж тычыцца прызнання сённяшніх "герояў" будучымі пакаленнямі... Дапусцім, праз 25 гадоў прадстаўнікі чарговага літаратурнага пакалення прыйдуць і скажуць: "Мы не прызнаём Марыю Шамякіну!". Сёння найбольш адэкватным мне бачыцца адказ: "А я вас не прызнаю!".

Калі ж без жартаў, увесь час згадваю адзін з ранніх вершаў Л. Галубовіча: лірычны герой душою рвецца да сонца і зор, філасофствуе, але ў выніку прыходзіць да высновы: "...трэба дбаць, каб давесці свой дом да парадку". Вось гэта герой беларускі — на ўсе часы!

На мой погляд, станоўчага героя, тыповага, аб'ёмнага ў сённяшняй беларускай літаратуры, бадай, няма; затое ёсць выдатна распрацаваныя ў псіхалагічным сэнсе вобразы адмоўных герояў — напрыклад, у аповесці М. Южыка "Горад, які яны засялілі".

І. З. А мне цікавы герой Я. Сіпакова (пісьменніка, бадай, найбольш актыўнага ў сваім пакаленні) — цікавы сваёй разважлівасцю, немітуслівасцю, мэтаскіраванасцю.

І. Ш. Найбольш эмацыйна мне блізкі сёння персанаж А. Бадака з аповесці "Адзінокі васьмікласнік хоча пазнаёміцца", дакладней, яго сталая "інкарнацыя": такое ж адчуванне светла-шчымлівай незваротнасці ўсяго, якое адчувае ён на аўтобусным прыпынку, на скрыжаванні пахаў Горада і Вёскі, апошнім часам вярэдзіць і мяне.

Сярод герояў, якія паўстаюць з твораў літаратараў майго пакалення, да нядаўняга часу найбольш рэльефнымі мне падаваліся персанажы А. Бахарэвіча, хоць часам вусцішна робіцца ад таго, што нашчадкі менавіта па *іх* будуць меркаваць пра *нас*. Аднак пасля з'яўлення кнігі "Душпастарскія спатканні для дачнікаў" П. Касцюкевіча я пачала з большым аптымізмам глядзець на стасункі сучаснасці і будучыні: аказваецца, наша іранічнае літпакаленне здольнае нараджаць не толькі "франкенштэйнаў". Аддегласць паміж іроніяй змрочнай і аптымістычнай — велізарная; можна патраціць цэлае жыццё, каб дайсці ад аднаго полюсу да другога. Галоўнае — ісці.

Падрыхтавала Ірына ШАЎЛЯКОВА

«Уладзімір Караткевіч, або Паэма Гарсія Лойкі» — гэта твор, які быў напісаны моцна хворым Алегам Антонавічам Лойкам у 2008 годзе, у апошнія месяцы яго жыцця. Твор сведчыць пра подзвіг Алега Антонавіча як пісьменніка і навукоўца, пра яго самаахвярнае служэнне мастацкаму слову (упершыню надрукаваны ў часопісе "Полымя", 2009, № 1—2). Сабраўшыся з сіламі, Алег Лойка здзейсніў сваю даўнюю, больш як дваццацігадовую, задуму — асэнсаваў не толькі постаць Уладзіміра Караткевіча, але і выявіў уласную постаць, згадаў шмат цікавага з іх блізкага сяброўства.

Подзвіг творцы

Вызначэнне жанру твора як паэмы было абумоўлена жаданнем аўтара наблізіцца да постаці Уладзіміра Караткевіча як да глыбы чалавечнасці, беларускасці, мастацкасці, глянуць на яго як на лірычнага, гераічнага эпіка, вартага паэмнага ўзвышэння. Добра прыдалася да назвы твора і зыначанне Уладзімірам Караткевічам у лісце за 27 ліпеня 1974 года да Алега Лойкі яго прозвішча як Гарсія Лойка, сугучнае з прозвішчам славутага іспанскага паэта Гарсія Лоркі.

Гэты твор пра Уладзіміра Караткевіча стаў для Алега Лойкі арганічным працягам яго папярэдніх раманаў-эсэ пра Янку Купалу і Францыска Скарыну. У ім, як і ў раманах-эсэ "Як агонь, як вада" і "Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае", натуральна спалучыліся асабістае, лірычнае, паэтычнае і даследчыцкае, праблемна-аналітычнае. У ім Алег Лойка падсумаваў і канцэптуальна выявіў уласны эстэтычны погляд на прыгожае пісьменства і на мастацкія набыткі Уладзіміра Караткевіча.

Красамоўна сведчаць пра шчырае іх сяброўства пададзеныя ў творы надпісы Уладзіміра Караткевіча на зборніках паэзіі "Матчына душа" (1958) і "Вячэрнія ветразі" (1960), зборніку прозы "Блакіт і золата дня" (1961), рамане "Каласы пад сярпом тваім"(1968), што былі падараваныя Алегу Лойку. Шмат было падстаў для сімпатый і братэрскіх пачуццяў, якія ў сэрцы Алега Лойкі будзіў Уладзімір Караткевіч. Алег Лойка напісаў рэцэнзію на яго першы зборнік паэзіі "Матчына душа", якая, аднак не была надрукавана. Уладзімір Караткевіч быў удзячны яму за рэцэнзію "Выхаванне таленту" на другі зборнік паэзіі "Вячэрнія ветразі", што была надрукавана ў часопісе "Маладосць" (1961, № 7). У часопісе "Маладосць" (1963, № 1) быў надрукаваны і артыкул Алега Лойкі "Хваляванне за сучасніка", дзе ён ставіў раман Уладзіміра Караткевіча "Нельга забыць" у адзін рад з раманам Івана Мележа "Людзі на балоце" і аповесцямі Васіля Быкава "Здрада" і "Трэцяя ракета". Алег Лойка сваю любоў да Уладзіміра Караткевіча перадаваў студэнтам БДУ, быў навуковым кіраўніком кандыдацкай дысертацыі Лідзіі Іванаўны Прашковіч "Беларускі гістарычны раман (Станаўленне жанру)" (1977), прысвяціў яму свае вершы, сустракаўся з ім у Слоніме і Мінску, у снежні 1966 г. выступаў з ім у школах на Мядзельшчыне, у сакавіку 1971 г. у складзе групы беларускіх літаратараў наведаў Магнітагорск, у ліпені-жніўні 1981 г. яны з сем'ямі разам адпачывалі ў Доме творчасці ў Дубултах (Латвія). Пра ўсё гэта цікава і змястоўна апавядаецца ў творы.

Алег Лойка па-свойму глянуў на постаць Уладзіміра Караткевіча, паказаў яго як рэальнага, зямнога чалавека і як генія. Уласныя згадкі і развагі пра творчую спадчыну Уладзіміра Караткевіча ўдала падмацаваў вытрымкамі з яго лістоў да Якуба Коласа, Максіма Танка, Янкі Брыля, яго дзённікавымі запісамі, успамінамі пра яго Уладзіміра Калесніка, Фларыяна Няўважнага і іншых асоб. Плённа выкарыстаў і набыткі караткевічазнаўства, напрыклад, кнігі Адама Мальдзіса "Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча: Партрэт пісьменніка і чалавека" (1990).

Апраўдана тое, што Алег Лойка падаў у творы свае рэцэнзіі на першыя паэтычныя зборнікі Караткевіча "Матчына душа" і "Вячэрнія ветразі". Ён слушна сказаў пра своеасаблівае спалучэнне ў яго паэзіі лірычных і эпічных элементаў. Падкрэсліў, што "адметнай і вельмі прыемнай адзнакай творчай індывідуальнасці Караткевіча з'яўляецца яго шырокая эрудыцыя". І сёння заслугоўвае ўхвалы тое, што Алег Лойка зычліва і эмацыянальна, улічваючы спецыфіку рамантычнага таленту паэта і яго светаўспрыманя, на высокім прафесійным узроўні ахарактарызаваў першыя яго паэтычныя зборнікі. Выключную каштоўнасць маюць і асабістыя згадкі Алега Лойкі пра тагачасны літаратурны працэс, пра адносіны паміж сабой літаратараў, пра перыпетыі шляху Караткевіча ў літаратуру.

Алег Лойка па-свойму глянуў на постаць Уладзіміра Караткевіча, паказаў яго як рэальнага, зямнога чалавека і як генія. Уласныя згадкі і развагі пра творчую спадчыну Уладзіміра Караткевіча ўдала падмацаваў вытрымкамі з яго лістоў да Якуба Коласа, Максіма Танка, Янкі Брыля, яго дзённікавымі запісамі, успамінамі пра яго Уладзіміра Калесніка.

Алег Лойка напісаў не хроніку жыцця і творчасці Уладзіміра Караткевіча, а стварыў свой, шматгранны і непаўторны яго вобраз як чалавека і творцы. Пры гэтым плённа спалучыў, напрыклад, згадкі пра яго фарміраванне як асобы ў Оршы, Кіеве, Маскве, Рагачове, Мінску з роздумам пра веліч здзейсненага ім як пісьменнікам. Алег Лойка лічыць Уладзіміра Караткевіча класікам беларускай літаратуры, пісьменнікам сусветнага значэння, геніем. Цікавымі з'яўляюцца развагі пра ролю Уладзіміра Караткевіча для беларускай літаратуры і ролю Джэймса Макферсана з яго "Паэмамі Асіяна, сына Фінгала" для англійскай, пра ролю Вацлава Ганкі з яго краледворскімі рукапісамі для чэшскай. Сапраўды, Уладзімір Караткевіч "у пару савецкай русіфікацыі, калі Беларусь сваёй уласнай гісторыі пазбаўлялася, вяртаў ёй гісторыю, выдумляў ёй міфы".

На думку Алега Лойкі, творчасць Караткевіча была не толькі выявай духу. У ёй яшчэ было ўзвелічэнне беларускай шляхты і беларускага мужыка, "як і выявы самога характару Караткевіча як дзеяча гісторыі, культуры Беларусі, беларускага народа". Слушна сцвярджаецца, што "Уладзімір Караткевіч — беларус да мазга касцей — гэта перш за ўсё".

Алег Лойка дакладна вызначае сутнаснае ў постаці Караткевіча: "Віталізм, аптымізм, жыццярадаснасць да карнавальнасці — толькі ў гэтым ён. Трагізмам увогуле дыхае шмат што ў творчасці Караткевіча, і то вялікім, празмерным надзвычайным трагізмам, але па-над усім у яго жыццё — радаснасць да самага здаровага рогату, да самага нястрымнага рагатання".

Уладзімір Караткевіч быў розны, як яго вочы рознага колеру, як яго выявы на фатаграфіях розных часоў. Адметныя, непаўторныя былі і яго творы. Але, як піша Алег Лойка, "быў і застаецца ў народным нацыянальным успрыманні Караткевіч толькі адзін.<...> Але юнак разам з тым заставаўся ў ім да самага канца дзён ягоных". Сапраўды, ён быў розны і адначасова адзіны, цэласны ў сваім знешнім абліччы, у духоўным воблiку, у эстэтыцы сваёй творчасці.

Для пісьменніка важнай была думка пра повязь часоў. Таму нельга не пагадзіцца з Алегам Лойкам, які піша: "І тут ізноў трэба падкрэсліць, што мінулае, сучаснае, будучае ў Караткевіча — гэта адзінае, гэта яго вялікасць Час, яе вялікасць Прастора. Караткевіч па адчуваннях чалавек усесямных Часу і Прасторы, космасу Дабра і Зла. Толькі Дабро і Зло спрадвечныя пад небам на зямлі, толькі адносіны людзей да гэтых граняў існасці ўвяргаюць іх у стан змагання за Святло супраць Цемры". Ды і герояў сваіх, згадаем хоць бы раман "Каласы пад сярпом тваім", пісьменнік дзяліў не па сацыяльна-класавай прыкмеце, а па тым, добрыя яны ці дрэнныя.

Алег Лойка лічыць, што хоць і цяжка, "але ўсё ж больш-менш выразна можна яго ўспамінаць у трох іпастасях: Караткевіч — парадны, Караткевіч — паўпарадны, Караткевіч — непарадны.

Парадны — куртуазна-рыцарская стыхія, цалаванне жанчынам ручак, паданне перад імі на калені (як перад жонкай Мальдзіса Марыяй Карлаўнай); паўпарадны — у чарнавіках, блакнотах, лістах, у спалучэнні высокага стылю і простанароднага, ледзь не вульгарнага; непарадны — вагантны, анекдатычны, хахмацкі, аматар куплі, тамада застолляў". Так, Уладзімір Караткевіч быў не без пэўнай прыгодніцка-рамантычнай авантурнасці. Таму можна гаварыць таксама пра авантурызм літаратурнага героя Караткевіча і яго абвостраных сюжэтаў, пра авантурнасць тыпажа — гераічнага, рыцарскага, барокавага, закаханых герояў, гратэскава-лотрайскіх персанажаў.

Каштоўнай у сувязі з гэтым з'яўляецца наступная выснова Алега Лойкі: "І што характэрна — гэта пэўная лірызацыя авантурызму, спалучэнне яго з двайной мараллю — свецка-хрысціянскай і хрысціянска-народнай, характэрная Караткевічу ўвогуле рэзкая палярызацыя дабра і зла. Караткевіч не шукаў, як Якуб Колас, нягоднікам станоўчых рысаў, каб ачалавечніць іх, закрэсліваць у іх подласць. Караткевіч ішоў ад Шэкспіра, а не ад Л. М. Талстога, будучы і розным рамантыкам, і розным майстрам паказу жыцця ў яго рэаліях".

Алег Лойка грунтоўна, у кантэксце творчасці Караткевіча, прааналізаваў яго апавяданне "У шалашы". Глыбока прачытаў пралог да рамана "Нельга забыць", адзначыў, што ў ім Караткевіч "як бы адхрышчваючыся ад літаратуршчыны рамантызму, як бы хуліганячы, яўляючы сябе як бы дэкамеронаўцам ці раблезіянцам, а насамрэч спалучаючы супрацьлегласці, палярнасці, стылізуючы іх пад адзіным рамантычным дахам, і тое, і другое робячы характэрнымі рысамі свайго Караткевічавага стылю". Алег Лойка назваў магутнейшым раман Уладзіміра Караткевіча "Хрыстос прызямліўся ў Гародні", адзначыў, што ў гэтым творы пісьменнік інквізіцыю Сярэднявечча асудзіў у беларускай літаратуры, як ніхто да яго, што ў гэтым творы ён блюзнерыў у беларускай літаратуры, як да яго ніхто!..

У першым раздзеле свайго твора аўтар пісаў: «Сапраўды, мой творчы замах быў калісьці надзвычайны, наўрад ці што з яго я цяпер здзейсню". Таму вельмі шкада, што напрыканцы жыцця моцна хворы Алег Лойка не ўсё змог здзейсніць з калісьці надзвычайнай задумы. Аднак і тое, што ён зрабіў, уражвае і захапляе. Ён узвысіў і адкрыў, адметна, глыбока і непаўторна раскрыў постаць Уладзіміра Караткевіча, сам яскрава раскрыўся. І ў гэтым каштоўнасць яго твора.

Анатоль ВЕРАБЕЙ

Святлана БАСУМАТРАВА

Паэзія

Калі парушаць сон
Начныя гукі —
Сабачы брэх
Ці грукат цягнікоў,
У новы верш
Натхнёна,
Без прынукі
Складаецца
Мазаіка радкоў.
Вазьму вучнёўкі сшытак
І аловак,
І час, нібыта знічка,
Прамільгне.
Рэдактар сам
Паставіць загаловак,
Складана
З загалоўкамі ў мяне.
То паміралa я,
То ўваскрасала.
То палыном,
То мёдам я была.
Але пра што б я
Вершы не пісала,
У іх заўжды
Душа мая жыла.
Паэзія,
Усё ў жыцці складана.
Мо здарацца
Турма або сума...
— Адной табе
Належу я аддана.
І ведай —
Без цябе мяне няма.

Птушка фенікс

Птушкай Фенікс
У полымі лёсу згарала,
Адраджалася з попелу,
Як і яна.
Мо не тых я кахала,
Не тым давярала.
Можа ў гэтым бяда мая,
Можа, віна.

Не аднойчы жыццё
Пачынала спачатку.
Ды не бачыў ніхто
Маіх роспачных слёз.
І шпурляла узрушана
Долі пальчатку,
На дуэль выклікаючы
Зманлівы лёс.

Колер восені медны
Хаваю ў паглядзе.
Хоць і шызыя вёсны
Былі на вяку.
Бо на свет нарадзілася
Я ў лістападзе,
Ў лістападзе
Сваю нарадзіла дачку.

Хоць далёка цяпер
Дарагая дачушка,
Непадзельныя мы,
Нібы човен з вяслом.
— Птушка Фенікс,
Агністая мужная птушка,
Ахіні нас абедзвюх
Ахоўным крылом.

* * *

Яму

Усходзіць сонейка з-за леса,
Залоціць роснае лісцё.
Жыла на свеце паэтэса,
Людзей любіла і жыццё.

Ды вось не ўсе яе любілі,
І не заўсёды лашчыў лёс.
Гулі вятры, маланкі білі,
Кусаў па-здрадніцку мароз...

Сваёй усмешкай прывітальнай
Ты сэрца мог маё сагрэць,
Нібы глытком вады світальнай
Не дазваляў душы згарэць.

Ёсць душ высокае свячэнне,
Святым суладна абразам.
Не варта ставіць прысвячэнне —
Усё ты зразумееш сам...

* * *

Памяці паэта-земляка
Алеся Пісьмянкова

Ты маўчаў, і я маўчала —
У маўчанні сэнс увесь.
Ціхай музыкай гучала
Мне імя тваё, Алесь.
Не дзялілі, хто з нас першы
Па дарозе на Парнас.
Проста мы любілі вершы,
А яны любілі нас.
Так, гадамі і вякамі
Вершыць час імклівы бег.
Веру, ў вёсцы Белы Камень
Самы белы ў свеце снег.

* * *

Люблю дарагую старонку
Ў смузе апусцелых палёў.
Рабіны пунсовую гронку,
Журботны адлёт жураўлёў.
Дрымоту ў гародзе і садзе
Працяў паравозны гудок...
Упэўнена я, ў лістападзе
Народзіцца лепшы радок.
Лісцё замятае на ганку
Мужчынскі абачлівы след.
І грукае з самага ранку
Сякераю злосна сусед.

* * *

Памяці самадзейнага кампазітара
Віталя Сілівончыка

Заганы прыкрай не пазбыцца,
Як не імкнуся, ўсё адно
Спазняюся па даўняй звычцы
На працу, ў госці, у кіно.
Мяне спазненні засмучаюць,
Але да гэтае пары
Мне гэту звычку прабачаюць
Мае калегі і сябры.
І толькі тыя, толькі тыя,
Каго замёў завейны снег,
Хоць самі не былі святыя,
Ці мне даруюць гэты грэх...
А мне ж ніколі не забыцца
І вельмі горка адчуваць —
Спазнілася па даўняй звычцы
Ім нешта добрае сказаць.

Я жыць хачу

Да бабак
Не хадзіла варажыць.
Свой лёс сабе
У вершах прадказала.
“Я жыць хачу,
Я доўга буду жыць...”
Сказала,
Як вузельчык завязала.

Равесніцы,
Паплечніцы мае,
Ніколі вы
Не будзеце старыя.
Жывым радкі
Пакінуўшы свае,
Пайшлі заўчасна
Жэня і Марыя.[1]

Глыталі побач
Даўкі смак жыцця
Мы з той, што недарма
Назвалі “горкай”.
З той, што
“Палесся мілае дзіця”,
Мы пад адной
Народжаныя зоркай.

Жыццё паэткі —
Гэта міг адзін.
Міг — вечнасці глыток.
А ўсё ж не лішне
Дажыць да дзён,
Як сталым стане сын
Ці вэлюм апране
Дачушка-вішня.

І ў час бяссоння
Шлю я па начах
Удзячную малітву
Паднябессю
За шчасце жыць
І песціць на руках
Унучачку —
Кірпатую Алесю.

[1] Яўгенія Янішчыц і Марыя Гудкова.

Арцём КАВАЛЕЎСКІ

Кастрычнік

Расцяклося жэле кастрычніка —
Зімы маладога апрычніка...
Беспрычынна дварамі бадзяюся,
Пад нагамі плыве зямля ўся.

У вачах павалока вільготная
Засціць сонна вандроўку ільготную:
Без білета, без мэты, імпэту —
Спаквaля я праходжу планету.

У тралейбусах ветлых, трамваях
Я то сплю, то вачыма шукаю
Блізкіх твараў выразныя рысы,
Згрубных постацей кіпарысы.

Мне на плечы халодны вечар
Пакладзе далонь пры сустрэчы
І ахутае мяккаю коўдрай,
І падорыць тлум сноў-зграй.

І зайграе на твары ўсмешка,
Калі знойдзецца вузкая сцежка
Ад маіх беспрытульных дарогаў
Да тваіх прабачальных парогаў.

* * *

Калі раптам дзень пачынае плакаць
Не дажджом — па-жаночаму,
Па-мужчынску — снегам,
Стомлена-сонным
і шэрым шэрагам
Людзі пад небам знікаюць зрэбным.
Беллю па белым,
імклівa, імпэтна
Б'е завіруха ў вокны і дзверы,
П'е маю скруху і неяк шляхетна
Хутае ў футры дрэвы ў скверах.
Паркаль празрысты і парцаляна
Ўсюды ў парках, у кожным завулку.
Ціхім вандроўнікам,
сціпла і цьмяна,
Ноч беспрытульна
шукае прытулку.

* * *

Я —
допісы
сальерыўскае
п'есы —
Так прагну
слодычы і музыкі
пісьма...
Нямой душы
прапаленыя
крэсы —
Маёй душы
адвечная
зіма.

* * *

Слотна.
Я рады.
Без парасона.
Горад.
Самотна.
Я блытаю словы.
Зноў недарэчны
Ламаецца дзень.
Я ў пустэчы,
Нібы авадзень.

* * *

Дагнаць лістоту немагчыма,
А ты ляціш ёй наўздагон —
Дзяўчына-ветразь,
панна-аблачына —
Знікаеш вэлюмна
ў люстэрку дзён.

І твой гадзіннік, сябра-вораг,
Ужо выконвае прысуд:
Не ахвяруе сквапных, новых,
Нецыферблатных пяць мінут.

* * *

Кастрычніцкага з'есці глогу
І раптам знікнуць уначы,
А ты крычы, крычы, крычы,
Пакліч мяне на дапамогу.

Ад глогу застанецца смак
Саладкаваты, доўгі, снежны,
Ты робіш мне рукою знак...
Цяпер кастрычнік,
раптам — снежань.

І я трымаюся рукі,
Нібы апошняга прыпынку...
Мінаюць дзеўкі, юнакі,
А мы з табой на фотаздымку.

Анёлак

Лістоты жоўтай сорам хісткі
І профіль твой ужо няблізкі...
Блукаю, значыцца, шукаю
Цябе ад зор да небакраю.

Мой абыякавы трыумф
Не ўсвядоміць славы дух
І не засвоіць праўды літар...
Я твой анёлак — baby-sitter.

* * *

Адчаю зазірнуць у вочы,
Ахвочасць прыхаваць на потым,
Употай сустракацца ноччу
І аблівацца сёмым потам.

І апантанасцю суцешыць
Тваё няўсцішнае “бывай”...
Як голасна сабакі брэшуць,
Калі ідзеш за небакрай...

* * *

Мне балела так,
Бо за вакном бялела
І ліхтар па-здрадніцку гарэў,
Месяц грэў снягі нясмела
Пад галлём ракальных дрэў.

Выйсці раптам бы
І раптам заблукацца
У пустэльні гарадскіх кутоў;
Што са мною, зрэшты,
Можа стацца
На мяжы няпэўнай
Сноў і слоў?..

Фота Уладзіслава Баськo

Зацемкі з левай кішэні

Леанід ГАЛУБОВІЧ

* * *

Нарэшце прыехаў дадому. Надвячоркам іду з ганцавіцкага аўтобуса (з суседняй вёскі Драбаўшчына, дзе вучыўся ў сямігодцы), аглядваю знаёмае з дзяцінства наваколле: былую вузкую паласу прылеснага балота, дзе торф капалі, там, пасля высушкі, сенакос быў, а паўз дарогу, жарам дыхаючы, грыміць калгасная зернесушылка, дзе падчас жніва дзяжурыў электрыкам. Даўні, старажытны, п'янкі пах цёплага жыта ўперамежку з потнай маладой дзявочай плоццю ў поўных цесных сусеках хмеліць і забівае дыханне ад аднаго пробліску ўспаміну той маладой пары...

Хваёвы лес, які высаджваў яшчэ школьнікам, агортвае сваім цёмна-зялёным прахалодным крысом, нібы старога сябра-таварыша...

У самой вёсцы — ціш, ні голасу, ні шолаху. Нервова-спуджана адмахваюся ад зумкага камарынага піску (дачакаліся-такі свежай крыві)...

Мама сядзіць у прыцемку на канапе з паніклай галавой, без святла, чакаючы сваё *сонца*. На доўгі дзвярны стогн і маё з'яўленне знямела паварочваецца амаль патухлымі свечкамі вачэй...

Я дома.

* * *

Сёння (нядзеля) заманулася паездзіць на ровары, прычым па лясных дарогах... Наважыўся, увайшоў у смак, дык неўпрыкмет адным махам даў кругаля кіламетраў дваццаць (лесам — 8 км да Заельні, шашой да Грыцэвіч, да малодшага брата, — 4 км, ад яго зноў да Вароніна асфальтам і часткова лесам — таксама 8 км)... Круціў шустра, спацеў, але, выехаўшы ў 13 гадзін і пабыўшы ў брата хвілін дваццаць, заявіўся назад апалове на трэцюю.

Задыхаўся і надыхаўся — атрымаў задавальненне. Ёсць яшчэ моц у нагах — і дзякаваць Богу.

У Мінску скрушна, для мяне гэта катарга, самавольная ссылка. Хачу па выхадзе на пенсію вярнуцца ў вёску... Пабачым як атрымаецца.

* * *

Мама павыносіла на сонца з шафаў і з куфра старое адзенне, яшчэ чыстае, не рванае, але ўжо даўно нікім не ношанае...

— Мама, што ты робіш? Яго ж ужо ніхто насіць не будзе...

— Ай, сынок, раптам яшчэ якое ліха?! Ты, дзякаваць Богу, не заспеў, а я наглядзелася і сама нагаравалася... Голыя былі, дзецям не было што адзець-абуць... Дзяўчаты тканыя фарбаваныя спадніцы насілі... О-о-о, гора гонарам не адолееш. Памру, тады спаліце ці што захочаце з ім зробіце, а пакуль жыву, хай пад бокам будзе, есці ж не просіць...

* * *

Касіў... Тры гады як запусцілі наш вялікі агарод, бо ўжо ніхто нічога тут рабіць не можа. Зарос ён. Соромна, кажа мама, скасі, сынок. Касу кляпаў месяц таму дзядзька Міша (сам не ўмею), да таго ж нядаўна ёй пакарыстаўся падвыпіўшы сусед, мой равеснік... Мянці-не мянці, а косіць яна ўжо няроўна і рвана. Пісаць значна лягчэй...

Не, пісаць лаўчэй. Але задавальненне ад касьбы больш поўнае... Яго ўсім целам адчуваеш, усёй істотай....

* * *

Учора першы раз па прыездзе пайшоў на могілкі, — дык хоць ты не варочайся адтуль — усе ўжо там, апроч мамы і... мяне...

* * *

Хадзіў па траве босым... Па выгане. Успамінаў дзіцячыя адчуванні. Пасля дакошваў агарод... Рукі і спіна соладка нылі: бадыллё і лапухі падалі да маіх ног...

* * *

У лесе — сыраежкі ды бабкі з лісічкамі... Дажджы лілі, а цяпер — суш. А трэба, каб лес угрэўся, упарыўся пад сонцам. Шмат машкары, але паветра хвойнае, з *елкім* прысмакам. Дыхаецца лёгка і глыбока, целу прыемна і раскошна...

* * *

Заспеў мыш у каморцы. Хата паўгода пуставала, нежылой была, вось даўтахвостыя і заявіліся на пакінутае людзьмі месца. Некаму ж трэба.

У чужым доме гэта магло б выклікаць агіду, а ў бацькоўскай хаце — і мыш *свая*.

* * *

Падымаюся на вяршыню даволі стромай горкі, да капліцы на могілках, — і ўся вёска як на далоні, і ўсё тая ж яна — хаты, як птушаняты ў гняздзе, — але людзей і колішняга рухлівага жыцця ў тых хатах ужо няма...

Перад вачыма — дэкарацыя Бацькаўшчыны.

І дуб старажытны шырока навісае над магільнымі помнікамі (гадоў яму, кажуць, за дзвесце), ён усё яшчэ зялянее і шуміць пад ветрам сваёй густой кронай, але гэта толькі вонкавае адчуванне яго магутнасці, бо ўнутры дрэва — адно вялізнае пустое дупло, у якім магло б схавацца некалькі чалавек ад непагадзі-нягоды, але... не ад смерці, бо ён і сам канае...

* * *

Самыя "недалёкія" хлопцы, што ў Вароніне засталіся, ці то спіліся ці то пайшлі працаваць свінарамі на ферму (там цяпер усё аўтаматызавана). Заробкі добрыя, а працы не надта каб шмат, таму *мужыкі* ў прамым сэнсе ваююць за штатнае месца "свінаркі". Калі такое было!

Гэткія пашавэлкі ў Мінску з віна на піва перабіваюцца, а большасць увогуле валацужнічаюць. А яны пакуплялі сабе танныя патрыманыя іншаркі, трымаюць па 2-3 каровы, цялят, поўныя катухі свіней, дык — не паверыце — жонак сваіх, цёмных, не раз бітых, возяць на край вёскі на дойку (выган і выпас якраз за нашай хатай)...

З пылам і гулам праносяцца яны паўз нашу хату апалове на другую; дзверцы машыны насцеж — і адтуль на ўсю моц Пугачова ці "Любэ" равуць немымі галасамі пакуль дзябёлыя жонкі гэтых свінароў не выдаяць вымя сваім каровам да апошняй кроплі...

Пацеха з гэтых сучасных вясковых маладзёнаў. Але хаты яны чамусьці ў Клецку будуюць, жадаюць жыць цывілізавана — і самі, пэўна, і галоўнае, дзяцей хочуць як найдалей ад свайго *свінства* адвесці...

* * *

На заходзе жнівеньскага сонца сядзім з мамай у двары на лаўцы і ямо спелыя грушы з алюмініевай вялікай міскі. Як для мяне — яны мяккія і смачныя, як для мамы — цвёрдыя і кіславатыя...

Мама стомлена, але хораша пасміхаецца майму апетыту.

І можа, якраз гэтая яе ўсмешка ўспыхне некалі ў маёй памяці ў апошні міг жыцця...

* * *

Сустрэў на лясной сцежцы Петрыка Захаровага.

87-гадовы каржакаваты сівы дзядок нёс на плячы дзве даволі важкія, сечаныя жэрдзіны. Вітаючыся,ыы нават не зняў іх з пляча, толькі рукі перамяніў. За пазухай у кашулі яшчэ і грыбоў некалькі. Перакінуліся словамі. Я аднагодак і сябар яго сына-нябожчыка. Загінуў пад камбайнам, не дажыўшы і да сарака... Дачка ж Петрыка пайшла замуж у Нясвіж і там з мужам спілася-развялася. Усе чатыры ўнукі (дзеці дачкі і сына) — на ім. Жонка гадоў пятнаццаць як памерла...

А ён усё па гаспадарцы сноўдае, увесь час у рабоце, у клопатах... І во цяпер, нібыта крэпкі восеньскі баравічок, нечакана для мяне з-пад елачкі на сцежку вытыркнуў...

Бадзёры, усмешлівы, гаваркі, ветлівы, добразычлівы. Гора яго не сагнула. Як бы пад анёльскім крылом жыве і цёмнымі думкамі пра смерць галаву сваю сіва-светлую не забівае. Ясны чалавек.

* * *

Пайшоў вечарам на ўзгорак за хатай, каб патэлефанаваць жонцы з мабільнага тэлефона, бо з двара не заўжды "цягне". Цёпла, перадтуманна, мяккая, яшчэ не абросшая трава, пахне сырадоем... Здаецца, зараз бы ў рукі лусту жытнёвага хлеба — і еў бы яго запіваючы густым настоем малочнага паветра...

* * *

У мамы ногі баляць. Але з кійком, сагнуўшыся, сюды-туды па хаце і двары яна яшчэ рупіцца...

Абедаем. Ёй трэба смятаны ў лядоўні ўзяць да капусты. Устае і пры мне спрабуе тэпаць... Апярэджваю.

"Мама, няўжо нельга папрасіць, каб я падаў. Дай ты хворым нагам сваім спачын..."

"Ай, сынок, трэба ж *трывожыцца*, бо седзячы на адным месцы ў зямлю ўрасцеш..."

Мне ўпадабалася яе слова "трывожыцца", у разуменні "варушыцца, рухацца", а бадай і шырэй — жыць напоўніцу...

* * *

Слівы спеюць. Іх цяпер многа, паўз платы нежылых двароў так і віснуць над вузкай пустой вясковай вуліцай... Уся ваколіца пахне слівамі. Гэта невыказны жнівеньскі пах — сакавіта-саладжава-ліпкі. Пах плоднага стану прыроды.

* * *

Па маміных сонечных сенях бегаюць маладыя маленькія павучкі... І тут, і на ганку, і ў падворку наснавалі яны павуты, як вясельнага вэлюму...

* * *

Віця паштальёнаў з маладой жонкай, абсеўшы вымя з двух бакоў, дояць адну карову ў мяне за хатай на выгане... Падыходжу да іх машыны, хвалю маладзёна за "бабскае ўменне", а ён кажа, што і жонку навучыў, бо не ўмела. Тая пасміхаецца, як быццам так і трэба. Ідылія. Пастух і пастушка, сучасныя Дафніс і Хлоя...

* * *

Сёння — Спас. Асвячэнне садовых пладоў.

У былы будынак бібліятэкі "прывезлі канцэрт" — свята сяла. Прыехала калгаснае начальства і невялікі гурт самадзейных артыстаў. З публікі — дзевяць чалавек: пяць пенсіянераў і чатыры даглядчыкі свінакомплексу. Адным словам, артысты пераважылі працаўнікоў калгаса. Усім з гэтай прычыны было трохі ніякавата. Начальства з гонарам "адчыталася" за выкананы і перавыкананы план па ўраджайнасці і намалоце... Папляскалі ў ладкі. Добра. Але напрыканцы слова папрасіў пенсіянер і падняў пытанне пра добраўпарадкаванне мясцовых, знутры запушчаных, могілак. "Новы плот паставілі. Дзякуй. Пафарбуеце яго некалі — пачакаем. Але ж трэба спілаваць старыя здуплелыя дубы і бярозы, што вось-вось могуць рухнуць на надмагільныя помнікі... Ды ямы і кустарнік трэба бульдозерам ссунуць ды зараўняць, давесці да ладу..."

(Тут, дарэчы, і бацька цяперашняга старшыні сельскага савета спачывае... непадалёк ад тых самых ям.)

Адным — план намалоту і перспектыва на будучае, другім — іх сённяшні дзень і заўтрашняе месца... Адным — захаваць дажатае, другім — пахаваць дажытае...

* * *

Памерла маміна сяброўка, Воля Ваньчыкава. Цяпер у Вароніне ўсе толькі паміраюць. Нараджаць няма каму і няма ад каго... Баба Надзя (яна баптыстка, а яны Волю адпяваць будуць) з чаканым роздыхам (нябожчыца хварэла не ўстаючы больш года) паведаміла, не раўнуючы як некалі ТАСС: "Памерла Воля. У чатыры хаваць будзем..."

Для вяскоўцаў і хаўтуры цяпер — падзея больш урачыстая, чым жалобная...

* * *

Адпявалі Волю хор і прэсвітэр. Ён напаказ саліраваў ненатуральным, нейкім не сваім, нежывым фальшывым голасам, — выходзіла гундосна і немілагучна. Чалавек яўна тужыўся паказаць сябе на публіку, вылузваўся з уласнай натуры ледзь не да хрыстовага пакутнага вобраза. Гучала амаль парадыйна...

Але справа ў тым, што, калі адпяванне скончылася, і ён "даў каманду" закрываць вечка труны і засыпаць "гроб землёй" (калі чытаў па Біблii, — казаў па-руску, а калі збіваўся на ўласную рыторыку — то па-вясковаму), то як прыклалі вечка да труны і пачалі іх сашрубоўваць — прэсвітэр раптам загарэўся ўсёй сваёй, добра знаёмай вяскоўцам, натурай, стаў сам сабою, і цокаючы языком, пацягнуўся да бліжэйшай бакавой шрубоўкі, крутнуў нават раз-другі, выдыхнуўшы да паствы: "О, як файна прыдумана, і забіваць-грукаць не трэба, ай ты, бач..."

(Ён быў вельмі працавіты і гаспадарчы чалавек.)

З усяго таго жалобнага абраду абасобленыя рыданні ўчарнелай дачкі нябожчыцы і вось гэты прэсвітэрскі жэст і былі самымі шчырымі і сапраўднымі...

* * *

На пахаванні труна адразу не пайшла ў яму. Яе выкапалі глыбокую, але кароткую на даўжыню. Давялося вымаць дамавіну назад, дакопваць бераг пад "ногі" і жыўцом прапіхваць труну з нябожчыцай у зямлю, якая ўсё яшчэ не хацела прымаць яе, а можа, і сама нябожчыца хацела як мага даўжэй затрымацца на вачах сваіх дзяцей і родзічаў...

* * *

Бацька пасадзіў колісь у двары пры весніцах маладзенькую елачку і ядлоўцавы куст...

Яны яшчэ пры ягоным жыцці (памёр у 1991-м, пражыўшы 67 гадоў) вымахалі ўровень з хатай. Ядловец — на рэдкасць высокі і стройны, як у батанічным садзе. Ён і цяпер стаіць вартавым пры нашым спусцелым двары — вечназялёны і калючы... А вось елку спілавалі браты — надта ж цень на сцяну хаты адкідвала, "засціла сонца ў вокнах і сырасць наводзіла", як мама казала.

А ядловец расце сабе! Гледзячы на яго, я заўжды ўспамінаю бацьку — натуру самотную, унутрана ганарлівую, а падчас і гнеўную, але найперш — творчую і спагадлівую. Бацька быў адмысловым цеслям і столярам. Калі што рабіў, то даводзіў да вытанчанасці і дасканаласці. Доўга, занудна прымяркоўваўся да працы, нерваваўся, замерваў, вычэрчваў, адбіваў вуглём... Затое рэч заўжды была зроблена — камар носа не падточыць — гожа, па-самабытнаму. "Міша Філарэтаў рабіў" — гэта ў нашай вёсцы і ў яе ваколіцах было знакам якасці і адабрэння.

Ды вось і куст гэты — таксама яго задумка нейкая (хата ж стаіць за сто метраў ад лесу!), а цяпер яшчэ і памяць...

Па асацыяцыі прыпомніўся даўні зборнік вершаў Міхася Стральцова "Ядлоўцавы куст". Арыгінальная паэзія "чыстай красы" — вытанчаная, запамінальная — своеасаблівая "пячатка майстра".

Кожны чалавек нешта павінен пакінуць па сабе — хату, кнігу, дрэва, куст...

* * *

Выйшаў перад абедам за вароты на вуліцу. Гляджу, на электрычных правадах паміж слупамі — гурма ластавак. Больш за тое, у сапсаваным ліхтары на адным са слупоў яны звілі гняздо і выкормліваюць птушанят...

Дзіўна, але пад дахамі вясковых хат, як раней, цяпер яны гнёздаў не ўюць.

Ці то селянін зайшоў надта далёка ў цывілізацыі свайго жыцця, ці то ластаўкам сталі нізкімі і небяспечнымі падстрэшшы іх дамоў?

Парадокс. Але ў адносінах паміж чалавекам і птушкай, як паміж хадой і палётам, утварылася поле высокага напружання...

* * *

Баба Надзя пасля зімы ў горадзе бясконца корпаецца ў сваім гародзе. Садзіць, аполвае, выбірае, соліць, закатвае, носіць трохлітровікі ў прахалодны глыбокі пограб...

Дачцы, унукам, праўнукам...

І назапашана ў яе гэтага дабра на гады наперад... Бо асабліва ніхто і не карыстае, цяпер маладзейшыя да ўсяго крамнага пазвыкалі...

А баба ўсё квохча з-за плоту: "Вой-вой-вой, сёлета лета якое няўдалае, усё збуцвела, не зацвіло, не ўрадзіла... што ж то будзе, ай-яй-яй... Божа, Божа..." Сама сабе як бы, але і для мяне, бо я бяру ваду з калонкі, што поруч з яе гародам, і вядома ж, усё чую...

Не, не пасміхаюся. Спачуваю, бо ў гэтым яе клопаце і як бы на сёння пустым рачкаванні — уся сутнасць яе зямнога жыцця, усе яе 86 летаў, урадлівых і неўраджайных...

Пазбавіць яе гэтага — тое самае як пакінуць мяне пасярод жыцця без асадкі, паперы, кніг і камп'ютэра...

* * *

Тэлефануюся з мамай на трэці дзень па вяртанні ў Мінск і яна плачучым голасам кажа: "Ты ўжо *калі* паехаў, а кветкі твае на стале ўсё яшчэ стаяць і не вянуць... Пры іх і ты мне, сынок, хораша ўспамінаешся. Засохнуць — зусім адна застануся..."

в.Вароніна,
жнівень 2009.

Пакуты ўзнясення

Народны артыст Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР Тадэвуш Кокштыс адзначыў сваё 75-годдзе і 50 гадоў творчай дзейнасці на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа. Яго асноўныя акцёрскія работы ўвайшлі ў скарбонку нацыянальнага мастацтва. Сярод іх: Труфальдзіна ("Слуга двух гаспадароў" К. Гальдоні), Благае ("Доктар філасофіі" Б. Нушыча), Жабрак ("Сымон-музыка" Якуба Коласа), Расплюеў ("Вяселле Крачынскага" А. Сухаво-Кабыліна), Шаргай, Гастрыт, Салянік ("Парог", "Вечар", "Радавыя" А. Дударава), Жамгуліс ("Клеменс" К. Саі), Блазен ("Кароль Лір" У. Шэкспіра), Качкароў ("Жаніцьба" М. Гогаля), Гаўк Шэндарф ("Рэцэпт Макропуласа" К. Чапека), Сганарэль ("Лекар мімаволі" Ж. Б. Мальера), Іосіф Трэці ("Кракаўскі студэнт" Г. Марчука).

Тадэвуш Антонавіч нямала здымаецца ў кіно, на тэлебачанні: "Знак бяды", "На сыходзе дня", "Агонь у жылах тваіх", "Круіз на кані", "Маленькі баец", "Зорка Венера", "Людзі на балоце", "Новая зямля", "Тэатральны раман", "Фабрыка мрояў"…

У гэтых нататках знакаміты артыст распавядае нам пра тое, што блізка і дорага яго сэрцу.

У маленстве, яшчэ да вайны, я лётаў у снах. З лёгкасцю адрываўся ад зямлі, узносіўся высока і плыў… Мог прызямліцца дзе заўгодна: на вершаліне дрэва, на даху, а ўзлятаў з пагорка над Хоўхлам, недзе між Валожынам і Маладзечнам.

На свет я з'явіўся ля касцёла, на плябаніі, дзе некаторы час кватаравалі Настасся Міхайлаўна і Антон Антонавіч — мае будучыя бацькі. Пасля на пагорку з'явілася хатка, усімі вокнамі на сонейка. Бацька сталярнічаў, займаўся фатаграфіяй, маляваў "відочкі". Шмат пазней, калі спатрэбілася "сацпаходжанне", хтосьці разумны мне параіў: пішы "из крестьян".

У свой час Хоўхла было местам — значыць, горадам. Як падае краязнаўца Генадзь Кахановскі, тут на некалькі год "прызямліўся" рэлігійны вальнадумец і вялікі асветнік Сымон Будны. Але чарговая навала зруйнавала горад, высекла людцаў, і Хоўхла пачало адпавядаць сваёй літоўскай назве "высечаная паляна".

Я заспеў вёску Хоўхла, дзе быў панскі маёнтак з паравым млынам, пільняй, электрычнымі ліхтарамі, возерам з "каруселяй", а таксама Сорчынай крамай з "карасінай" і французскімі булкамі.

Помню, як з'явіліся байцы ў будзёнаўках і вызвалілі нас… У краме з'явіліся вобла і адэкалон "Тэ-жэ". Бацьку даручылі пісаць шыльды. На адной з іх ён напісаў: "Колесообозный цех". Сэнс гэтай назвы я спасцігаў праз усю вайну, бо шыльду ў бацькі забраць не паспелі: з-за гарушкі паказаліся нямецкія танкі…

Едкі дым, што слаўся па нізінах, прынёс жахлівую вестку: "У Дорах у царкве гарэлі людзі".

Тады і надышлі трывожныя ночы з чырванню ў вокнах, выццём ваўкоў і сабак, начным грукатам у шыбы і пачварнымі снамі. Сны стралялі, кусалі, душылі. З апошніх сіл я напружваўся, адрываўся ад зямлі і ўзносіўся, як мага вышэй, каб не дасталі…

Радасць другога вызвалення ў сорак пятым адчулі тады, калі "з таго свету" пасля цяжкага ранення пад Кёнігсбергам вярнуўся бацька. Мама за гэта падаравала яму дачушку, а нам, траім даваенным хлопцам, — сястрычку.

У школу пайшоў яшчэ ў акупацыю, чыталі і пісалі лацінкай. Помню, з чацвёртага ў пяты клас перайшла толькі адна выдатніца.

Аднойчы летнім ранкам нанялі фурманку, і мама адвезла мяне ў Валожын у восьмы клас. Дырэктару шапнула, што я добра малюю. І мяне "нагрузілі". Я афармляў насценгазеты, пісаў святочныя "Да здравствует!.."

Дырэктар вёў біялогію, ён адзіны, хто ставіў мне пяцёркі, бо я яму намаляваў увесь пакутлівы шлях чалавека, пачынаючы з той самай малпы, а закончыў партрэтам Якуба Коласа для школьнай бібліятэкі. Пасля гэтага дырэктар Антон Станіслававіч Паныш сабраў школьную лінейку між зменамі, а класная Марыя Фрыдрыхаўна Націнг узяла мяне за руку (відаць, каб не ўцёк), высунула наперад. Я тросся. Дырэктар на сакавітай беларускай мове чытаў загад: "За ўзорныя паводзіны, (ну, думаю, — гэта не пра мяне, бо мае "ўзорныя" паводзіны межавалі з "ўзорнай" вучобай), — за актыўную грамадскую работу аб'явіць Тадэвушу Кокштысу падзяку і аказаць грашовую дапамогу ў памеры ста рублёў". Мне захацелася ўзнесціся сярод белага дня.

На развітанне са школай дырэктар уручыў мне аб'яву пра набор у Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут: "Паспрабуй", — і тыцнуў пальцам у мастацкі факультэт…

Калі ў прыёмнай камісіі спыталі, якія работы, у якой тэхніцы і якога памеру я прывёз для прагляду, я доўга не мог уцяміць, пра што гаворка.

…Са слязьмі я перапісваў заяву на акцёрскі, бо там не трэба было ніякіх "памераў" і ніякай "тэхнікі"…

Палёт з хутара на гарушцы ў тэатральна-мастацкі, на курс Дзмітрыя Арлова!.. Вытанчаны майстар, цудоўны педагог, ён "не ўціскваў" у сістэму, а раскрываў творчыя індывідуальнасці сваіх выхаванцаў. Чатыры гады чароўных палётаў у сне і наяве!..

У верасні 58-га я рэальна прызямліўся ў Віцебску, дзе мой адзіны на ўсё жыццё тэатр імя Якуба Коласа, у якім я заспеў знакамітых пачынальнікаў коласаўскай сцэны, што валодалі магутнай творчай энергетыкай. Я браў ад іх, колькі мог, ды ішоў сваім шляхам, таямніцы тэатра спасцігаючы па-свойму.

Праз усё сцэнічнае жыццё ў Віцебску мяне адольваюць трывожныя, пакутлівыя сны ўзнясення ў дзень сённяшні, каб адпавядаць… каб не застацца адрынутым у маім калектыве, каб быць зразумелым, быць патрэбным майму чуламу і спагадліваму гледачу.

Тадэвуш КОКШТЫС

Акенца ў свет зачараваных

Году роднай зямлі і людзям гэтай зямлі прысвячаецца персанальная выстаўка Аксаны Аракчэевай, разгорнутая ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча.

Многім з нас гэтая прадстаўніца шаноўнай творчай дынастыі, паслядоўніца рэалістычных традыцый беларускай мастацкай школы знаёмая найперш як паэтэса мінскіх вокнаў. Вядома ж, у сваіх работах яна не рыфмуе словы, не шукае для іх адмысловую рытміку. Аксана стварае і "рыфмуе" паэтычныя выяўленчыя вобразы, натхняючыся зменлівымі ў розны час года і дня краявідамі старога горада, за якімі любіць назіраць з вышыні вокнаў бацькавай майстэрні, размешчанай на 7-м паверсе жылога дома. Менавіта з гэтых рамантычных і крышачку філасофскіх назіранняў нарадзіўся жывапісны цыкл Аксаны Аракчэевай "Мінскія вокны", над якім яна працавала з надзеяй, што кожны глядач знойдзе тут сваё акенца. Цяпер жа мастачка прачыняе перад гледачамі чарадзейнае акенца ў цудоўны, загадкавы, зменлівы свет жаночых вобразаў.

Сваю нізку графічных ды жывапісных жаночых партрэтаў, прадстаўленых у музеі, Аксана Аракчэева назвала "Зачараваныя...". Тры месяцы працавала мастачка над асноўнай часткай гэтай адмысловай падборкі твораў, якую можна было б назваць сур'ёзным дэбютам у партрэтным жанры, аднак...

Аднак, у экспазіцыю ўвайшлі таксама ранейшыя работы: 1979 — 81, 1986, 1989, 1992 — 94 гадоў, і нават кранальныя выявы блізкіх людзей, намаляваныя Аксанай ва ўзросце ад пяці да трынаццаці. Так што назавём гэта прэм'ерай, бо выстаўка "Зачараваныя..." сталася першым публічным паказам пераважнай большасці прадстаўленых тут работ і да таго ж — сюрпрызам для тых людзей, над чыімі вобразамі апошнім часам "чарадзейнічала" аўтарка партрэтаў.

У чарадзе зачараваных, чароўных, чарадзейных — і абліччы яе сябровак, добрых знаёмых, родных людзей, і аўтапартрэты. Розныя твары. І розныя творы: манахромныя і ў дакладна прадуманай колеравай гаме, прывабныя імпульсіўнасцю і дынамічнасцю ліній або высокай тэхнікай прапрацоўкі дэталяў, эскізнай лаканічнасцю малюнка ці густоўнай дэкаратыўнасцю кампазіцыі з выразным і невыпадковым фонам. Часам А. Аракчэева засяроджваецца толькі на партрэтным падабенстве, часам аддае перавагу стварэнню пэўнага псіхалагічнага вобраза сваёй мадэлі. Ды ў кожным партрэце ўражвае трапны, арганічны выбар тэхнікі: мяккасць усмешкі, задуменнасць позірку перадаецца з дапамогай сангіны, вугалю або мяккіх штрыхоў простага алоўка; энергіі маладых вачэй, шчодрасці эмоцый "пасуюць" вясёлкавая гуаш або сакавіты алей ці яркі акрыл.

На вернісажы прысутнічалі прадстаўнікі сталічнай інтэлігенцыі, замежныя дыпламаты. Выступілі старэйшына творчай дынастыі — заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Барыс Аракчэеў, Пасол Сербіі ў Рэспубліцы Беларусь Срэчка Джукіч... Некалькі новых работ Аксана Аракчэева падаравала прататыпам сваіх жывапісных вобразаў, а таксама Літаратурнаму музею Максіма Багдановіча.

"Свіцязянка", "Лясунка", "Дзяўчына з вёскі Свір", "І толькі надпіс — Вераніка", "Мая Белая Русь", "На лецішчы", "Мастачка з Сербіі Вера Джукіч", "Іна Наркевіч", "Мастачка Марта Шматава", "Восень на 1-м", "Вольга Ваніна і часопіс "Рюкзачок""... Можна працягваць гэты пералік назваў, але ж яны нічога не скажуць пра самі творы Аксаны Аракчэевай — хіба толькі тое, што варта пабачыць іх на ўласныя вочы, зазірнуўшы ў Літаратурны музей Максіма Багдановіча. Выстаўка "Зачараваныя..." прабудзе тут да 22 лістапада. Між іншым, завітаўшы сюды, можна пераканацца і ў лёгкім "тэматычным адступленні", якое мастачка дапусціла пры фарміраванні экспазіцыі: у яе партрэтнай галерэі апынуліся не толькі жаночыя твары…

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

На здымках: Аксана Аракчэева і госці яе вернісажа; партрэт Веры Джукіч; "Лясунка".

Фота Кастуся Дробава

Заслужанаму дзеячу мастацтваў і заслужанаму дзеячу культуры Рэспублікі Беларусь, прафесару Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, члену праўлення БСМД Міхасю Солапаву споўнілася 85 гадоў. Даўні аўтар “ЛіМа”, ён з энтузіязмам адгукаецца ў друку на адметныя падзеі музычнага жыцця, піша натхнёна і грунтоўна. А сёння мы звярнуліся да Міхася Рыгоравіча з просьбай расказаць чытачам... пра сябе.

Да музыкі любоў...

Я ганаруся сваім пакаленнем, якое пасталела дачасна. Людзі майго пакалення хранаметруюць сваё жыццё на тры этапы: даваенны час, вялікая агульначалавечая памяць пра вайну і час пасляваенны. Гэта тры эпохі, тры складнікі...

У даваенны час, памятаю, мне вельмі-вельмі хацелася вучыцца — чытаць, пісаць і асабліва музіцыраваць. Як расказвала маці, Настасся Іларыёнаўна (народжаная Югава), я нарадзіўся за тыдзень да Пакрова — 7 кастрычніка 1924 года ў сяле Пакроўскім Цербунскай воласці ЦЧВ (Цэнтральная чарназемная вобласць). Але ж запісалі мяне толькі 15 кастрычніка, памаладзілі на 8 дзён. З трох гадоў я з задавальненнем іграў на пяціклапанным гармоніку “чарапашка”, які зрабіў для мяне дзядуля Іларыён Паўлавіч Югаў. Вясковы самародак, таленавіты ўмельца (музычных і гадзіннікавых спраў майстар, слесар, цесля, пячнік, шкляр, каваль). У Пакроўскім не было такога, чаго б не ўмеў зрабіць Ларок (дзядулева мянушка). Акрамя ўсяго, дзед быў маім першым настаўнікам музыкі. Ён сапраўды любіў музыку і імкнуўся абудзіць гэтую цягу ўва мне.



Прыкладна ў шасцігадовым узросце я ўжо валодаў усімі разнавіднасцямі гармонікаў, якія прыносілі дзядулю на рамонт, а таксама вывучыў амаль увесь дзедаў рэпертуар. А менавіта — народныя песні, танцы, скокі, напевы: “Барыня”, “Матаня”, “Маскоўская”, “Бычок”, розныя “Страдания” і мая ўлюбёная “Камарынская”. Для мяне было сапраўдным задавальненнем іграць у ансамблі з дзядулем. У вольныя ад працы хвіліны ён запрашаў мяне музіцыраваць: “Мішутка, хадзі да мяне, давай зладзім”. “Ладзіць” азначала іграць разам, дуэтам: я на сваёй “чарапашцы”, дзед — на “лівенцы” (разнавіднасць гармоніка дыятанічнага строю, на расціск і сціск аднолькавыя па вышыні гукі). Матуля мая, як і дзядуля, валодала ўсімі разнавіднасцямі гармонікаў, але ж утойвала гэта, бо да жаночай ігры на гэтым інструменце было прадузятае стаўленне. Музіцыравала яна толькі ў хаце, зачынялася ў каморы. А часам запрашала мяне таксама “зладзіць”. У яе быў добры музычны слых і чароўны голас, яна спявала ў царкве. Рэгент знаёміў пеўчых з нотным пісьмом, якое яна, як умела, стаpалася данесці да мяне. Аднак я любіў іграць па слыху. Усялякую мелодыю я адразу, пачуўшы, паўтараў.

Самае вялікае і радаснае свята музыкі было, калі прыязджаў з горада мой бацька — Рыгор Васільевіч Солапаў. Ён свабодна валодаў усімі разнавіднасцямі гармонікаў, якія былі распаўсюджаныя ў нашай мясцовасці. Аднак аддаваў перавагу раяльнаму-ялецкаму. Кожны дзень у нашай сям'і гучаў хатні квартэт: бацька граў на “раяльнай”, маці — на двухрадцы венскага строю, дзядуля — на “лівенцы”, а я на сваёй улюбёнай “чарапашцы”. Самы цяжкі час быў для мяне тады, калі мне не дазвалялі іграць, асабліва ў перыяд вялікага сямітыднёвага посту. Мае бацькі, дзед, абедзве бабулі, цёткі прытрымліваліся ўсіх постаў, прывучалі да гэтага дзяцей і ўнукаў. Так адбывалася выхаванне духоўна-маральных якасцей. Як цяпер я разумею, старэйшыя імкнуліся сфарміраваць у нас паняцце, што сорам, грэх — першааснова сумлення. Як часта паўтарала мая бабуля, бацькава маці Пелагея Міхайлаўна, калі чалавек імкнецца падманваць іншых, ён, у першую чаргу, падманвае сябе.

♫♫♫

Летам 1931 г. маці ўдзельнічала ў будаўніцтве новай школы і брала мяне з сабою, каб я, адпаведна магчымасцям, дапамагаў. У мае абавязкі ўваходзіла вазіць у бочцы ваду, якую жанчыны набіралі з калодзежа. А я, як той някрасаўскі мужычок, адвозіў яе да месца працы. Аднойчы пасля дажджу, калі я сцябнуў дубцом каня па крыжы, ён знянацку рвануўся, а я, босы, паслізнуўся і паваліўся пад капыты. Некалькі метраў конь працягнуў мяне па гразі, а потым пераехаў, здзёр скуру з твару, шыі, грудзей. Амаль суткі я ляжаў непрытомны. Больш як год не вучыўся ў школе. Аднак самае страшнае для мяне было тое, што я не мог іграць на музычных інструментах. Магчыма, у арганізме была парушана каардынацыя, у руках пры спробе актыўнага руху ўзнікаў моцны і рэзкі боль. Медыцынскай дапамогі ў вёсцы не было, усе спадзяваліся на маё выжыванне. Гадоў у дзевяць я пачаў ачуньваць.

У 1933 — 1934 гады ў Чарназемнай паласе Расіі здарыўся жудасны голад. Каб уратаваца ад яго, бацька завербаваўся на будоўлю Макееўскага металургічнага завода, і мы пераехалі на Украіну. Хаця сытага жыцця ў нас не было, але ж сям'я выжыла. У Макееўцы я авалодаў азамі нотнага пісьма. Пры Доме піянераў дзейнічалі аркестр духавых інструментаў і класы навучання ігры на фартэпіяна, якія я з цікавасцю наведваў. Навучанне вялося паводле фармалізаванага падручніка, які мне не падабаўся, таму што быў разлічаны на вырашэнне рамесніцкіх задач. А я на гэты час іграў па слыху народныя песні, танцы, скокі на раяльным-ялецкім гармоніку, дык і ўзнавіў гэты рэпертуар на фартэпіяна таксама па слыху. Чытка ж нотаў давалася праз сілу. Аднак тыя два гады адыгралі ў маім жыцці лёсавызначальную ролю. Упершыню я сутыкнуўся з класічнай музыкай у канцэртных залах, вынікам — у маім сэрцы ўзышлі парасткі любові да музычнай класікі.

Пры канцы 1934 года я вярнуўся ў родную вёску, адчуўшы, што сапраўднае музычнае мастацтва грунтуецца на дзвюх апорах — народнай і класічнай. Тады ўжо сёетое змянілася і ў жыцці вяскоўцаў. Старшыня Пакроўскага вясковага савета Р. Воранаў даручыў былому пеўчаму царкоўнага хору В. Калініну (які спяваў з маёй маці) арганізаваць калгасны хор, у якім я стаў акампаніятарам. У маі 1935 г. у рэпертуары хору было ўжо 7 твораў — народныя песні і песні таго часу.

У 1936 і 1937 гг. я разам з бацькам зноў апынуўся ва Украіне. Музыкай не займаўся — не было інструментаў, з прычыны чаго вельмі пакутаваў. Аднак я наведваў харэаграфічны гурток: там заўсёды гучала разнастайная музыка і мне вельмі падабаліся народныя танцы, асабліва цыганскія і стэп.

♫♫♫

У ліпені 1937-га я вярнуўся ў родныя пенаты. У нашай вёсцы з'явіліся два новыя інструменты: хромка і баян, пра які я марыў з таго часу, як пачуў яго гучанне ў Макееўцы. Аднойчы, не ведаю з якой прычыны, уладальніка гэтага чароўнага інструмента І. Цяраева мой бацька запрасіў да нас у госці. Калі ён добра, як гавораць у народзе, “узяў на грудзі” і заснуў, я адважыўся на авантуру: узяў баян і непрыкметна прашмыгнуў у камору. Бабуля думала, што я ляжу на печы, прыбрала посуд са стала і легла адпачываць. Для мяне ж, напаўапранутага і босага, цэлая ноч у каморы сталася райскім сном, як адно імгненне. За ноч я падабраў на правай клавіятуры ўвесь рэпертуар Івана Сцяпанавіча.

Ранічкаю бабуля пайшла ў камору і, пачуўшы гукі, пажагналася: “Свят, свят, хто тут?” Я прызнаўся ў сваім “граху”. Аднёс баян у хату, пакуль гаспадар яго не прачнуўся. Бабуля была вельмі сумленным чалавекам і ўсё расказала. Іван Сцяпанавіч не паверыў, папрасіў “грэшніка” ўзнавіць музыку, асвоеную за ноч. Калі я гэта зрабіў, І. Цяраеў быў вельмі здзіўлены і сказаў: “Ён абавязкова будзе музыкантам”.

Чатыры гады запар падчас летніх канікул мяне запрашалі ў раённы цэнтр Цербуны ў якасці музыканта. Адзін вечар я іграў танцы, другі — быў тапёрам на кінасеансах, калі дэманстраваліся нямыя фільмы.

Паспяхова скончыўшы Пакроўскую няпоўную сярэднюю школу, я паступіў у Боркаўскую СШ, дзе працягваў сумяшчаць паспяховую вучобу з заняткамі ў школьнай мастацкай самадзейнасці. У 1940 годзе мяне прыкмецілі на раённым аглядзе і рэкамендавалі на вучобу ў музычнае вучылішча. Праўда, я ўжо спазніўся на тры дні: набор па ўсіх спецыяльнасцях быў завершаны. Аднак, дзякуючы маім адметным дадзеным і добраму валоданню мандалінай, мяне залічылі ў Курскае музычнае вучылішча па класе домры. Маё імкненне апраўдаць аказаны давер і вялікае жаданне стаць паўнавартасным музыкантам паспрыялі таму, што я займаўся на “выдатна” па ўсіх прадметах і ўдзельнічаў у чатырох аркестрах: народных інструментаў (домра-пікала), духавым (тэнар), баянным (я па слыху іграў на ўсіх танцавальных вечарах і ведаў амаль увесь рэпертуар гэтага калектыву), а таксама — у сімфанічным аркестры (літаўры, тарэлкі, вялікі барабан). У гэты ж час я працаваў кіраўніком струннага аркестра школы ФЗН.

Нягледзячы на тое, што пры росце 175 см важыў толькі 44 кг, я,

акрамя музычнага вучылішча, працягваў наведваць сярэднюю школу і курсы лётнага складу. Працаваў, як апантаны, каб ажыццявіць запаветную мару — стаць музыкантам. Зарукай была “святая да музыкі любоў”...

Міхась СОЛАПАЎ

На здымках: аўтару нататак —5, 16 і 85 гадоў.

Фота Святланы Берасцень і з архіва аўтара

Імя Глебава — абавязвае

У цэнтры Мінска ёсць гістарычны двухпавярховы будынак, у якім кожны дзень гучыць музыка. Гэта — Дзіцячая музычная школа № 10 імя Я. А. Глебава. Тут робяць свае першыя крокі будучыя музыканты. Многія з навучэнцаў гэтай школы з часам становяцца прафесіяналамі, для якіх Яе Вялікасць Музыка робіцца сутнасцю жыцця.

З 1976 года школу ўзначальвае заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, член прэзідыума праўлення Беларускага саюза музычных дзеячаў Тамара Куніцкая, якая за гэты час стварыла ў школе атмасферу творчасці, добразычлівасці, пошуку новых шляхоў выхавання. У 2001 годзе школе нададзена імя народнага артыста СССР, вядомага нашага кампазітара Яўгена Аляксандравіча Глебава. І гэта невыпадкова. Ён часта сустракаўся з вучнямі школы, пісаў для іх творы, прысутнічаў на канцэртах.

Адным з напрамкаў дзейнасці педагагічнага калектыву з'яўляецца супрацоўніцтва з беларускімі кампазітарамі. У зале ДМШ № 10 адбываліся канцэрты пленумаў Беларускага саюза кампазітараў, прысвечаныя музыцы для дзяцей і юнацтва, творчыя сустрэчы беларускіх кампазітараў з настаўнікамі і вучнямі.

Традыцыйнымі сталі справаздачныя канцэрты школы ў Вялікай зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Апошні з іх адбыўся сёлета пад дэвізам “Музыка беларускіх кампазітараў у сэрцах нашых дзяцей”. У праграме былі прадстаўлены разнастайныя творы беларускай музыкі — ад народнай і старадаўняй, XVI стагоддзя, да сучаснай розных напрамкаў. У стварэнні багатай гукавой палітры канцэрта ўдзельнічалі як педагогі — прафесійныя выканаўцы, сярод якіх лаўрэаты міжнародных конкурсаў, стыпендыяты спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі, так і іх вучні, якія ўжо маюць уласныя творчыя перамогі, а таксама мастацкія калектывы.

Значнай падзеяй у творчым жыцці калектыву стаўся канцэрт, прысвечаны 80-годдзю з дня нараджэння Яўгена Глебава, які адбыўся 10 верасня. Незвычайны формай і зместам, канцэрт прайшоў на свежым паветры ва ўнутраным дворыку школы. Само надвор'е спрыяла гэтай імпрэзе: было вельмі цёпла, свяціла сонейка і здавалася, што недзе ўвышыні, на нябёсах, сам кампазітар уважліва слухае сваю музыку.

А ў праграму ўвайшлі як арыгінальныя творы Я. Глебава, так і пералажэнні яго аркестравых партытур для ансамбляў і сольных інструментаў. У канцэрце бралі ўдзел педагогі школы, вучні, інструментальныя ансамблі, хоры. Упрыгожылі гэтую сустрэчу з музыкай нашага класіка выступленні ансамбля народных інструментаў пад кіраўніцтвам Н. Ручымскай і квартэта драўляных духавых інструментаў “Рыўера” пад кіраўніцтвам М. Расохі.

І сёння ў школе віруе актыўнае творчае жыццё. Наперадзе — новыя праекты, сустрэчы з беларускімі кампазітарамі, канцэрты класічнай і сучаснай музыкі.

Ларыса МУРАШКА,
кампазітар

На здымку: дырэктар ДМШ № 10 імя Я. А. Глебава Тамара Куніцкая і госць школы — народны артыст СССР старшыня Беларускага саюза кампазітараў Ігар Лучанок.

Сябры! На вашы пытанні, якія датычаць падрыхтоўкі матэрыялаў для гэтай старонкі, адказа першы намеснік старшыні праўлення Беларускага саюза музычных дзеячаў Наталля Васільеўна ВІТЧАНКА. Тэлефоны:
(017) 222-37-33 — працоўны;
(029) 507-55-05 — МТС;
(029) 699-32-00 — Velcom.

Кніга не мае граніц

9 кастрычніка 2009 года кіраўнікі дзяржаў — удзельніц СНД падпісалі Дэкларацыю аб падтрымцы кнігі.

Кніга прызнана прадметам першай неабходнасці. Адначасова — неад'емнай часткай адукацыі, навуковага, культурнага, сацыяльнага і эканамічнага развіцця. І абвешчана: развіццё кнігавыдання, кнігараспаўсюджвання і паліграфіі — дзяржаўная задача кожнай краіны. Ад гэтага часу краіны — удзельніцы Дэкларацыі будуць імкнуцца да вынішчэння адміністрацыйных, фінансавых, гандлёвых і іншых бар'ераў у працэсах экспарту і імпарту кніжнай прадукцыі.

— Па сутнасці, ідзе шырокая размова пра абмен друкаванай прадукцыяй, — патлумачыў "ЛіМу" намеснік міністра інфармацыі краіны Ігар ЛАПЦЁНАК. — Я лічу, што гэта адна з першачарговых праблем, якую нам неабходна было вырашыць — каб кніга не мела граніц. Прынцып, які цяпер запісаны ў Дэкларацыі — "Кніга без межаў" і які мы агульнымі намаганнямі нарэшце ажыццявілі, быў у аснове іншых папярэдніх міжнародных дакументаў. Мы маем так званае Фларэнтыйскае пагадненне, пастанова паводле якога прынята ў 1994 г. у Санкт-Пецярбургу. Тады было прынята рашэнне аб далучэнні да міжнароднага "Пагаднення аб увозе матэрыялаў адукацыйнага, навуковага і культурнага характару", падпісанага ў 1950 годзе ў Фларэнцыі. Далучэнне да Пратакола стварала спрыяльныя ўмовы для захавання і ўмацавання адзінай культурнай прасторы СНД і пашырала магчымасці абмену выданнямі.

Маецца таксама Балонскае пагадненне (1999 г., Балонья). Яго асноўная мэта — стварэнне адзінай еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі. Калі чалавек вывучае які прадмет, ён павінен ведаць, што выкладанне ідзе на агульнаеўрапейскім узроўні, з выкарыстаннем тых ведаў, якія назапасіла чалавецтва. Калі маецца з'ява літаратурная, то і яна павінна быць для нас агульнай. Такім чынам, мы атрымалі дакументы, паводле якіх здымаюцца абмежаванні па культурным абмене ў Еўропе. Менавіта ў культурным асяроддзі не павінна быць аніякіх перашкод і бар'ераў.Таму гэтай Дэкларацыяй абвяшчаюцца мэты і задачы, выкананне якіх органамі дзяржаўнай улады, грамадскімі аб'яднаннямі, прадпрыемствамі і арганізацыямі будзе садзейнічаць падтрымцы кнігі і развіццю супрацоўніцтва ў гэтай сферы ў рамках Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

— Ігар Мікалаевіч, чаму, нягледзячы на відавочны станоўчы эфект, узаемадзеянне краін СНД у галіне літаратуры і кнігавыдання актывізавалася толькі цяпер?

— Згадваю, яшчэ ў 2002 годзе ў Германіі прайшла сустрэча міністраў культуры Еўропы. І там прагучала цікавая думка з вуснаў прадстаўніка Румыніі. Які сказаў, як дэмакрат я вітаю, што з камуністычным рэжымам пакончана. Але... Калі існавала тая сістэма, рухаліся насустрач адзін аднаму і два культурныя патокі: з Захаду на Усход і з Усходу на Захад. Яны былі прыкладна аднолькавыя. А сёння ёсць вялікі акіян на Захадзе і маленькія ручайкі на Усходзе, якія гінуць у агульнай плыні.

Вось тое добрае, што было напрацавана, нам трэба цяпер нейкім чынам вярнуць. Відаць, у гэтым таксама сутнасць нашай Дэкларацыі. Неабходна, каб быў абмен, які існаваў паміж усімі рэспублікамі былога Саюза і паміж Саюзам — і краінамі Захаду. Мы перакладалі адзін аднога, абменьваліся кнігамі, навінкамі літаратуры. Ездзілі дэлегацыі, сустракаліся творцы. Культурнае асяроддзе насычалася! Яно станавілася больш багатым. А ў 1990 гады мы нейкім чынам парушылі сувязі. І цікавыя з'явы, якія адбываюцца ў нашым літаратурным працэсе, умоўна кажучы, не даходзяць да таго ж Казахстана. Нядаўна быў я ў Туркменіі — там з задавальненнем разглядалі нашы кнігі. І гатовыя былі купіць. Але такія сустрэчы — эпізадычныя. Асноўныя стасункі ў нас захаваліся і падтрымліваюцца, бадай, толькі на ўзроўні дзейнасці літаратурных часопісаў. Літаратары хоць і засталіся ў сяброўскіх адносінах, ды толькі няма паміж імі стасункаў на ўзроўні творчых саюзаў, і — галоўнае — на ўзроўні дзяржавы. Як выдаваць у нас кнігі з іншай дзяржавы? Але і пераклады — гэта той самы невялікі ручаёк. Праблему ж неабходна вырашаць комплексна. Дзякуй Богу, людзі зразумелі: менавіта кніга духоўна ўзбагачае, садзейнічае захаванню гісторыі народаў і дзяржаў. Без разумення значэння кнігі і неабходнасці яе падтрымкі немагчымыя развіццё адукацыі і навукі, а значыць, сацыяльна-эканамічны прагрэс і асваенне сучасных тэхналогій. Усе ўдзельнікі нашага дыялога прызнаюць важкім замацаванне праз кнігу і літаратуру вышэйшых духоўных і маральных каштоўнасцей і разглядаюць яе абавязковай умовай як агульнай адукацыі, так і ўсебаковага развіцця чалавека. Менавіта з улікам гэтага прапануюць садзейнічаць прапагандзе чытання ў сваіх дзяржавах, распрацоўцы і прыняцця на дзяржаўным узроўні нацыянальных праграм падтрымкі чытання.

Найперш у аснове культурнага абмену — кніга! Яна вучыць, гэта спадчына аднаго пакалення іншаму. Хто не чытае кніг, той спыняецца ў сваім развіцці! Чалавек праз кнігу атрымлівае веды...

— Але даследчыкі занепакоеныя: на постсавецкай прасторы знікаецца ўзровень адукаванасці насельніцтва, кнігу сталі менш чытаць і якасць засваення матэрыялу цяпер не тая. У СНД 2008-ы аб'явілі Годам чытання. Пра неабходнасць распрацоўваць і рэалізоўваць агульнадзяржаўныя і рэгіянальныя праграмы развіцця чытання згадваецца і ў Дэкларацыі аб падтрымцы кнігі. Ёсць для краін такі паказчык: колькасць людзей, якія чытаюць больш 8 кніг у год (сучасныя так званыя "інтэлектуалы"). Дык вось, у Расіі ён на ўзроўні прыкладна 23 працэнтаў...

— Мы робім іншыя сацыялагічныя даследаванні. І аказваецца, каля 50 працэнтаў насельніцтва кніг не чытаюць, больш 25 працэнтаў — чытаюць 2 — 3 кнігі ў год. З тых, хто цікавіцца літаратурай, 30 працэнтаў — людзі ад 14 да 30 год, якія чытаюць навучальную, ад 60 гадоў і вышэй — мастацка-гістарычную, літаратуру для адпачынку, а пасярэдзіне — тыя, хто чытае ўвесь спектр літаратуры. Але больш як 57 працэнтаў увогуле не купляюць кніг! Усё менш у нас хатніх бібліятэк. Праўда, тут увогуле можна па-іншаму падысці. Да прыкладу, навошта мне кнігі, калі я магу на CD мець усю Нацыянальную бібліятэку?

Але ў тым і справа, што кніга патрабуе працы, сатворчасці. Калі ты і кніга — непарыўнае цэлае. А калі кнігу выводзіш на манітор камп'ютэра — губляецца такі фактар, як эстэтыка, мастацтва кнігі. Толькі яднанне трох складнікаў дае магчымасць стварыць шэдэўр: гэта аўтарская задума (змест), мастацкае аздабленне і паліграфічнае выкананне.

У нас у Беларусі вельмі добрая паліграфічная база. Яна ствараласяў савецкія часы і была разлічана на Прыбалтыку, Расію і Беларусь. Тыражы, напрыклад, Друона, Дзюма даходзілі да 5 млн. асобнікаў. І гэту кнігу трэба было данесці да кожнага. Таму людзі, якія займаюцца кнігавыданнем прафесійна, клапоцяцца, каб кніга праходзіла праз межы...

— Але не ўсё так гладка. Нягледзячы на тое, што ў краінах СНД гуманітарны напрамак дзейнасці даўно вылучаны прыярытэтным і перыядычна праходзяць форумы творчай інтэлігенцыі, што не першы год вядуцца дыскусіі аб падтрымцы кнігі, рашэнне прынятае толькі цяпер...

— Яшчэ ў 2001 годзе для абмеркавання надзённых праблем быў створаны Міждзяржаўны савет па кнігавыданні, паліграфіі і сродках масавай інфармацыі. Беларусь — сяród яго сузаснавальнікаў. Збіраліся мы ўсе гэтыя гады. Выбіраліся старшыня Міждзяржсавета — прадстаўнік пэўнай краіны, і сустаршыня, які пасля некалькіх год возьме кіраўніцтва. Праект Дэкларацыі быў прапанаваны супольна расійска-беларускай дэлегацыяй. Першапачаткова гэта быў зусім іншы дакумент. Раней у ім было каля 10 старонак. Давалася азначэнне — што такое інфармацыйная прастора, кніга, інш. Абмяркоўваўся літаральна кожны радок. Расіяне больш вопытныя, з улікам таго, што ў іх ёсць буйныя арганізацыі, дапрацавалі матэрыялы і на адно з наступных пасяджэнняў прывезлі Дэкларацыю аб кнізе. Яе абмяркоўвалі на працягу 2 — 3 гадоў. Аказвалася, што ў розных дзяржавах маюцца розныя погляды. Нам трэба было знайсці падмурак, на якім можна было б такія сувязі наладжваць і развіваць. Спачатку ўвогуле яна гучала як Дэкларацыя праў кнігі. Але юрысты нас паправілі. У 2006 — 2007 гадах у Міждзяржсавеце старшынствавала Беларусь, мы актыўна працавалі, каб Дэкларацыя была падпісана кіраўнікамі дзяржаў. Але існавала вельмі шмат бар'ераў. Супраціўляліся мытнікі: кожная краіна многае страчвала.

— Гэта зразумела: у нас існуе падатак на дабаўленую вартасць 18 працэнтаў, у Расіі — 10. Мы ў розным становішчы! І калі расійская кніга ідзе да нас і мае меншы кошт, мы сутыкаемся з неверагоднымі цяжкасцямі, гэта не на карысць нашай кнізе. Расія, магчыма, шукала такім чынам рынкі збыту сваёй прадукцыі...

— Але калі расійская кніга трапляла ў іншыя дзяржавы, таксама стрымлівалася падаткамі. Наша ж кніга, калі трапляла ў Расію, зразумела, была ўжо неканкурэнтаздольная. Вось мы і хацелі выраўняць умовы...

Між тым, ідэя аб неабходнасці дакумента паступова крышталізавалася. Азербайджан лічыў, і яны цяпер пазначылі сваю асабістую думку, што няма неабходнасці ў фарміраванні інфармацыйнай сістэмы ўліку прадукцыі кнігавыдання краін СНД — сістэмы "Books in Print" — каб кніга запісвалася на электронныя носьбіты і ўводзілася ў агульную прастору для рэгістрацыі. Магчыма, гэта выклікана тым, што на такую сістэму патрэбны вялікія выдаткі. На жаль, у краінах Закаўказзя кнігавыданне страціла найбольш. Азербайджан, прыкладам, пераходзіў з кірыліцы на лацініцу. Старэйшае пакаленне там чытае на кірыліцы, малодшае ведае лацініцу. А кнігі ў бібліятэках у асноўным на рускай мове. У Грузіі не існуе сістэмы распаўсюджвання кнігі — ні дзяржаўнай, ні прыватнай. Яны вельмі цікавяцца, як жа ўсё захавалася ў нас. Расія ў сувязі з тым, што кнігарні сталі прыватнымі, таксама перагледзела падыходы. У Маскве ў сярэдзіне 90-х гадоў былі толькі тры кнігарні. Потым нейкім чынам у кожным раёне зрабілі. Гэта непрыбытковая справа! Затое ў Расіі буйныя выдавецкія цэнтры, якія распаўсюджваюць кнігу.

У пачатку гэтага года мы давялі Дэкларацыю да лагічнага канца. Падпісаны яе варыянт, пэўна, ужо дзесяты. Галоўнае ў ім — клопат пра кнігу, пра развіццё навуковага, культурнага патэнцыялу краіны. Разбуральныя тэндэнцыі ў культуры, магчыма, не так відавочныя, як у эканоміцы, прамысловасці. Але наступствы іх абавязкова праяўляюцца — праз дзесяцігоддзі. Мы падкрэсліваем: менавіта дзяржава павінна займацца пытаннямі развіцця кнігавыдання. І прапануем, каб усе ўзаемаадносіны былі выгаднымі. Гэта зняцце мытных бар'ераў, магчымасць свабоднага абмену інфармацыяй і прывядзенне заканадаўства ў адпаведнасць з гэтым дакументам.

Ёсць для краін такі паказчык: колькасць людзей, якія чытаюць больш 8 кніг у год (сучасныя так званыя "інтэлектуалы"). Дык вось, у Расіі ён на ўзроўні прыкладна 23 працэнтаў...

* * *

Каля 50 працэнтаў насельніцтва кніг не чытаюць, больш 25 працэнтаў — чытаюць 2 — 3 кнігі ў год. З тых, хто цікавіцца літаратурай, 30 працэнтаў — людзі ад 14 да 30 год, якія чытаюць навучальную, ад 60 гадоў і вышэй — мастацка-гістарычную, літаратуру для адпачынку, а пасярэдзіне — тыя, хто чытае ўвесь спектр літаратуры. Але больш як 57 працэнтаў увогуле не купляюць кніг!

Дэкларацыя падпісана кіраўнікамі 8 краін: гэта Азербайджан, Арменія, Беларусь, Казахстан, Кыргызстан, Малдова, Расія і Таджыкістан. У бліжэйшы час будзе дадзена распараджэнне Савета Міністраў для распрацоўкі адпаведнага заканадаўства.

Ірына ТУЛУПАВА
Фота Кастуся Дробава

ЦІ ЁСЦЬ ПАДСТАВЫ ДЛЯ ДЭПРЭСІІ?

«Полымя» № 10

Бясспрэчным пераможцам у негалосным "гамбургскім" спаборніцтве трох часопісаў па выніках кастрычніка трэба назваць "Полымя". Гэткай шчыльнасці выдатных матэрыялаў даўно не было.

Перадусім — проза.

У. Сцяпан, актыўны блогер і рупліўца pocket-book індустрыі, прапануе чытачу акварэльныя малюнкі пад назваю "Дзед". Зразумела, аўтабіяграфічныя. Топасам сучаснай філалогіі стала выказванне Льва Талстога пра тое, што калі-небудзь пісьменнікі будуць проста апісваць уласнае мінулае ды штодзённасць, і гэтага будзе дастаткова. Магчыма. Але, шчыра кажучы, сумую па навелах Сцяпана — вострасюжэтных, містычных... Стыль малюнкаў — медытатыўны. Аўтар імкнецца да цэласнасці фрагмента, нават даючы загаловак кожнай мініяцюры (здаецца, глобусаўская традыцыя). Дзякуючы назвам, занатоўкі жорстка размяжоўваюцца міжсобку. Не на карысць успрыманню — як быццам штыкеціны ў плоце лічыш, стамляешся пасля трэцяга дзесятка. Пра што гаворыць пісьменнік? Вядома, пра мудрасць, вёску, старыя беларускі лад, пра дзяцінства. Калі б не мастакоўскае майстэрства Сцяпана паказваць *найдаражэйшае* для яго, твор мог бы "не загучаць".

Здзівіў і В. Гапееў. Апавяданне альбо, згодна з аўтарам, сямейная драма "Развітальная вячэра" — нетыповы для яго твор. Сюжэт "завастраецца" з кожнай старонкай, у выніку чаго традыцыйная сітуацыя адведзін дзецьмі старога бацькі амаль ператвараецца ў крывавы баявік. Узорам падобнай экспрэсіўнасці з'яўляюцца некаторыя апавяданні Ю. Станкевіча. Героі ў выніку вымалёўваюцца нейкімі хваравітымі, утрапёнымі асобамі. Яны больш агульнага маюць з нейкімі дэманамі, чым з рэальнымі людзьмі. Разам з тым, інтанацыя ў апавяданні ўвесь час змяняецца, і гэта ўзмацняе неадназначнасць успрымання. Усё ж такі я бы сказаў, што В. Гапееў "перанапружыў" твор, перанасыціў яго экспрэсіяй. Зважаючы на эксперыментальнасць тэксту — прынамсі, выглядае ён яркa і, безумоўна, арыгінальна.

Тэме сям'і, можна сказаць, прысвечаная ўся проза кастрычніцкага "Полымя". Следам за В. Гапеевым эксплуатуе яе і А. Якімовіч — у мілай дыдактычнай казцы "Сляды".

Працягваецца публікацыя рамана У. Гаўрыловіча "Цяпло маладзіка". Сюжэтныя калізіі твора ўсё больш нагадваюць сямейна-бытавую драму з элементамі старой добрай сацрэалістычнай эстэтыкі.

Паэзія нумара прадстаўленая падборкамі В. Яраца, Г. Аўласенкі, М. Ляшчуна і Ю. Новік. Медытатыўнасць — вось асноўны настрой і лад, які пануе ў кастрычніцкім "Полымі". Яно і зразумела — восень... Адзначыць жа хацелася б паэзію наймаладзейшай — Юлі Новік. Шкада толькі, што часам "бачыш", як яна падбірае рыфму. Па-мойму, дык лепш недакладная рыфма, чым змысленая. Ну, але гэта пройдзе. Радуе арганічнасць вобразаў паэзіі Ю. Новік, спакой, стрыманасць, *бясшумнасць* яе лірыкі.

Багатым з'яўляецца і аддзел перакладаў. Змешчаныя творы двух таджыкскіх паэтаў Зіё Абдуло і Мухтарам Хатам у перакладзе У. Марука і М. Мятліцкага адпаведна. Тут жа ў перакладзе Н. Рашэтнікавай друкуецца твор чэшскага пісьменніка XIX ст. Ю. Зэйера "Інултус" (праўда, на пачатку тэкст перакладу мае шэраг стылістычных хібаў). Вельмі добра, што публікацыі папярэднічае невялікая біяграфічная даведка пра Юліуса Зэйера. Пажадана, каб гэта стала пастаяннай практыкай.

Асобнай размовы заслугоўваюць пераклады "выклятага" паэта В. Сахарчука. У РВУ "Літаратура і Мастацтва" даўно рыхтуецца да выхаду кніга яго перакладаў з балгарскай паэзіі. Мяркуючы па выдрукаваных радках, зацягваць публікацыю гэтых твораў — амаль злачынна. Мы тут маем справу з паэзіяй найвышэйшай пробы, а хаваць такое ад чытача было б недаравальнай памылкай.

З крытычных матэрыялаў трэба адзначыць артыкул (хочацца сказаць "мікраманаграфію") І. Шаўляковай "Правілы адасаблення", прысвечаны творчасці А. Казлова. Акадэмічнае літаратуразнаўства прадстаўляе М. Мікуліч, у працы "Мудрага шчасце — веры шуканне..." ён аналізуе паэзію Казіміра Сваяка. Звяртае на сябе ўвагу таксама эсэ-ўспамін А. Марціновіча "Пад небам вечнасці" пра І. Чыгрынава. Трэба адзначыць і грунтоўную рэцэнзію С. Цыбаковай на пазалеташні раман А. Бароўскага "Спакушэнне" (друкаваўся некалі ў "Нёмане"). Тут жа У. Паўлаў распавядае пра эвакуацыю Полацкага дома дзіцяці ў час ВАВ. М. Шамякіна ў артыкуле "Скарбонка добрушскай зямлі" вядзе гутарку пра Добрушскі раённы краязнаўчы музей, у фондах якога з'явіліся асабістыя рэчы І. Шамякіна, перададзеныя роднымі пісьменніка. І. Ціткоўскі знаёміць чытачоў са зместам сатырычнай паэмы пачатку XX ст. "Файнбергада", а таксама з лёсам слуцкага краязнаўцы Р. Родчанкі.

«Нёман» № 10

Лірычная частка нумара складаецца з падборак А. Аўруціна (трэба вылучыць яго адметныя вершы "Откуда свеченье?..", "Ты смотришь сквозь меня...", "Как тихо!.. Подойди... Испей..."), перакладаў вершаў А. Звонака на лагерную тэматыку, а таксама постшасцідзесятніцкай і постсімвалісцкай паэзіі С. Яўсеевай.

Кожнага, хто піша нешта аўтабіяграфічнае, можа перамагчы адна спакуса. Адразу відаць, дзе — нарцыс, а дзе краскі палявыя. Так і тут: запісы 20-гадовай Людмілы Шумскай з першых жа радкоў адсылаюць да вядомага антычнага міту. Да таго ж, неадступна нагадваюць яны неабдымнае і легкаважнае блогерскае lj-пісьменства (нягледзячы на пэўную гладкасць і прычасанасць a la Глобус). Але, прабачце, ці варта перадрукоўваць гэтае *благоцце*? Тым не менш, прэцэдэнт створаны, і рэдакцыя рызыкуе быць заваленай допісамі інфантыльных сталічных суб'ектаў. Зусім іншая справа з мініяцюрамі Я. Сіпакова: гэта ўжо не акынства, а падштурхоўванне да роздуму над пытаннямі сапраўды сур'ёзнымі. Добра і тое, што густая, *шчыльная* манера пісьма Сіпакова цалкам захаваная ў перакладзе Д. Шабалінай.

З буйнейшых за мініяцюры эпічных жанраў часопіс прапаноўвае аповесць С. Трахімёнка "Пятля Морбут, ці Спадар Ніхто". Твор раскрывае перыпетыі лёсу трэнера па мастацкай гімнастыцы. Ці то дэтэктыў, ці то спартыўная біяграфія. Напрыканцы прыведзеная падзяка заслужанаму трэнеру СССР Рэнальду Кнышу за прадастаўленыя матэрыялы. У прыватнасці, вершы, якія шчодра цытуюцца ў аповесці, таксама належаць трэнеру, а не С. Трахімёнку.

У раздзеле "«Всемирная литература» ў «Нёмане»" надрукаваны пераклад аповесці англійскага пісьменніка Віктара Содана Прытчата "О, калі б заўсёды так было". Лёгкі, чыста англійскі гумар, немудрагелісты, але займальны сюжэт — "вагонная" проза, карацей. Чаму ў нас такога не пішуць, вось пытанне? Тут жа — падборка новых вершаў Яўгенія Еўтушэнкі. Адчувальна наступства гутаркі з рускім паэтам, што друкавалася ў мінулым нумары "Нёмана". Паводле памеру гэта хутчэй малыя паэмы, а не вершы (зрэшты, я проста забыў — для шасцідзесятнікаў такі падыход быў звычайнай практыкай). Еўтушэнка пазнавальны ў сваім грамадзянскім пафасе і ўласцівай яму лірычнасці. Без сумневу, найлепшы твор падборкі — верш "Матч СССР—ФРГ 1955".

А. Сульянаў прапануе расшыфроўку магнітафонных запісаў з творчых вечарынаў Васіля Быкава, а таксама іх сумеснай з Алесем Адамовічам сустрэчы з чытачамі. У матэрыяле можна яшчэ раз (у нечым па-новаму) асэнсаваць стаўленне пісьменнікаў да вайны, да ваеннай літаратуры, да нацыі, да чалавека, урэшце.

У артыкуле І. Чароты "Косаўская бітва: праз 620 гадоў" пададзены вельмі падрабязны аналіз вядомай балканскай праблемы. Аўтар прыводзіць надзвычай дакладную храналогію падзей, меркаванні вучоных і аналітыкаў, дзеліцца асабістымі ўражаннямі ад паездак па былой Югаславіі. З артыкула можна ўзнавіць рэальную карціну трагічных зрухаў у Сербіі, якая, на жаль, хутка выветрываецца са свядомасці пад ціскам усё новых і новых інфармацыйных "выбухаў".

"Ці могуць быць неяк звязаныя міжсобку кілбаса, што ляжыць у халадзільніку, і Цэнтральны батанічны сад НАН Беларусі? Выяўляецца, могуць... Пра гэта распавядзе загадчык сектарам лекавых і араматычных раслінаў Л. Кухарава" — так інтрыгуе чытача рубрыка "Крыніцы здароўя" (у ёй таксама — артыкул Я. Шмярко пра фітатэрапію і мікраэлементы). Мяне вось іншае хвалюе — ці могуць быць неяк звязаныя міжсобку гэтыя матэрыялы з літаратурным часопісам? Хаця, пэўна, і "Нёману" трэба шукаць чытача рознага.

«Маладосць» № 10

Палітра кастрычніцкай паэзіі "Маладосці" яркая, нібы жменя кляновых лістоў. У нізцы К. Дарагонькі вылучым вельмі някепскі верш "Мне — восеньскай..." з добрым гукапісам і наогул нязмушанасцю. Астатняе — "сырыя" карацелькі і два трыялеты (мусіць, не варта было Багдановічу пераймаць гэтую форму, але адкуль жа яму ведаць!..) да паэзіі маюць ускоснае дачыненне. Тры вершы ў напеўнай Броўкавай манеры прапануе намеснік старшыні Зэльвенскага райвыканкама В. Семянюка. Добра зробленыя і вершы М. Аляшкевіч з нізкі "Срэбныя ўспаміны". Вось жа, трывалая канструкцыя — таксама нямала. Нешта, праўда, ёсць у караценькім вершыку "Глядзі, як працуе маё механічнае сэрца". Але што? Таксама ў аддзеле — прэзентацыя літаратурнага клуба "Ветліца" пры кафедры беларускай мовы БДТУ. Клуб выдае свой альманах "AVE". Адзначым творы К. Клімовіч, бо У. Сцебурака (надрукаваныя 4 яго вершы) ужо больш ці менш паэт вядомы.

Друкуецца і заканчэнне рамана П. Васючэнкі "Дванаццаць подзвігаў Геракла". Чытач знойдзе тут і алюзіі на нацыянальную класіку, і дабротны беларускі гумар, а таксама пэўныя перагукі з сучаснымі тэмамі — напрыклад, эмансіпацыі. На мой погляд, вельмі мілая дзіцячая кніжка атрымалася (праўда, кніжка ж яшчэ *не выйшла*!). Стыль бездакорны, васючэнкаўскі. Такое адчуванне, што гэта адзіны літаратар, якому невядомае пачуццё дысгармоніі.

Фантастычнае апавяданне С. Белаяра "Фатальная памылка" адлюстроўвае чарговую касмаганічную версію падзей. Зрэшты, думка пра тое, што жыццё на Зямлю занеслі іншапланецяне — не новая. Але канфлікт у аповедзе абыграны цікава і нестандартна. Хоць я не вялікі знаўца фантастыкі. Магчыма, гэты сюжэт ужо выкарыстоўваўся. Ад С. Белаяра — дэбютанта "Маладосці" — чакаем працягу.

"Чаму моладзь не чытае беларускую літаратуру?" — такім пытаннем заклапочаныя аўтары-(удзельнікі) дыскус-клуба "Маладосці". Пытанне не новае і якое, можна сказаць, пакрысе робіцца рытарычным. Маю на ўвазе, спараджае пустыя размовы. Не засцерагліся ад іх і ўдзельнікі дыскус-клуба: паразважаўшы на тэмы гламуру і бізнесу, яны прыходзяць да высновы, што літаратуру трэба лепш рэкламаваць і ўсё будзе добра. Цікавая думка. Трэба і святарам параіць павесіць бігборды: "Толькі ў нас! Цела і Кроў Гасподнія — бясплатна! Адчуй смак вечнасці!" Калі адкінуць блюзнерства, то, мяркую, чалавек свабодны сам рабіць свой выбар, менавіта ён — актыўны бок, асоба, а не гамункул, і навязаць яму нешта немагчыма. Варта кожнаму зрабіць крок — і яго літаральна заваліць беларускай літаратурай. Чалавек сам абірае "женщину, религию, дорогу", не трэба нікога браць за цугундзер. А таленавітага — заўсёды надрукуюць, заўважаць, а часам і захваляць так, што...

Таксама ў аддзеле — нарыс А. Марціновіча "Новыя справы старога горада" пра культурніцкую працу ў Нясвіжскім раёне. Падключаецца часопіс і да святкавання юбілею А. Сыса: А. Федарэнка робіць невялікую сенсацыю, друкуючы побач з фрагментам рамана "Рэвізія" свой даўні верш, прысвечаны аўтару "Агменя". Нарыс І. Клімковіч "Ад каралеўскага палаца да "Пружанскага палацыка" распавядае пра гісторыю ўзнікнення вядомага архітэктурнай адметнасці Пружанаў, яго былых гаспадароў і сучасны стан (сёння там знаходзіцца раённы краязнаўчы музей). В. Шур аналізуе вершаваныя зборнікі В. Рагаўцова "Адмыслоўцы" (2007) і "На роскрыжы дарог" (2008) у артыкуле "Ад вершаванага радка — да залацінак народнай мудрасці". Г. Серэхан дае агляд маладосцеўскай паэзіі за 2008 год. Д. Крывашэй і А. Мальдзіс друкуюць працяг краязнаўчага даведніка "Літаратурныя мясціны Беларусі".

Ціхан ЧАРНЯКЕВІЧ

Гусіным пяром

Аляксандр МАТОШКА. Нарадзіўся ў 1956 годзе ў вёсцы Дунілавічы Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці. Маленства прайшло ў Расонскім раёне. Скончыў Янкавіцкую сярэднюю школу і Боркавіцкае СТВ № 33 па спецыяльнасці трактарыст-машыніст. Служыў у Савецкай Арміі. У 1979 годзе скончыў Смальянскі сельскагаспадарчы тэхнікум па спецыяльнасці аграном-арганізатар. Працаваў у саўгасе "Янкавічы" брыгадзірам, аграномам. У 1985 годзе быў выбраны на пасаду старшыні Янкавіцкага сельскага Савета дэпутатаў, дзе працаваў да 2001 года. Завочна скончыў Велікалуцкі сельгасінстытут па спецыяльнасці вучоны аграном. З 2001 года працуе ў Расонскім раённым вузле электрычнай сувязі на пасадзе электраманцёра. Друкаваўся ў раённых, абласных і рэспубліканскіх газетах. "Дзеяслоў жыцця" — яго першы вершаваны зборнік (рэдактар Алег Салтук, слова на дарогу Навума Гальпяровіча).

«Выпіць лёсу келіх свой да дна»

Ці мала хто з нас у маладосці не спрабаваў пісаць вершы! Але мала хто пранёс гэтае творчае захапленне праз усё сваё жыццё. І цяжка сказаць, што стала таму прычынай — выхаванне, характар, стрэс ці нейкае выпрабаванне лёсу...

У паэта з Расоншчыны Аляксандра Матошкі ёсць такія радкі:

Цяжка бачыць мне,
сэрца не ранячы,
Як жыццю жыцця не стае.

Гэта адметная шматмерная метафара, у сферах якой і схаваны прычыны нашага творчага свербу і гарэння, натхнення, прасцей кажучы.

Жыццё складваецца такім чынам, што ўрэшце прыводзіць кожнага з нас да мяжы паміж *выбарам* (у бытаванні, якое выбіраем самі) і *абранасцю* (талентам, якім нас надзяляе Прырода).

Аляксандр Матошка пачаў пісаць вершы яшчэ са школы. Аднак філалогія не сталася яго абранніцай, хоць і пераследуе ўсё жыццё, нібыта раўнівая палюбоўніца. А захаваць да сівой галавы, калі не закаханасць, то хоць бы жарсць да "аб'екта" сваёй даўняй спакусы — "каштуе не малой крыві". Безумоўна, варта адзначыць, што і паэзія выратоўвала жыццё Матошкі ў дэпрэсійных сітуацыях і напаўняла яго духоўны свет новымі фарбамі і вычуваннямі. Адным словам, яны квіты — Муза і Матошка. Таму і з'яўленню патрыятычна-рытарычных матываў у яго вершах не варта асабліва здзіўляцца, хоць вядома, што чытач чакае ад вершатворцы найперш самога факта паэтычнага здзіўлення.

Знаёмая і зблізу, і здаля,
Квітней у шчасці,
не гаруй у скрусе,
Свабодная бацькоўская зямля
Свабоднай нашай маці-Беларусі.

Узвышаныя, правільныя ў сваім пасыле радкі, але пагадзіцеся, як для прэтэнзій на паэзію, ужо занадта знаёмыя і другарадныя. Зрэшты, гартаючы старонкі нашых часопісаў, можна нават у адным нумары натыкнуцца на іх некалькіх клонаў. Не навіна, як кажуць. Але што для правінцыйнага вершаскладальніка прабачальна, тое сталічным "мэтрам" не да твару. Гэта я да таго, што вялікай розніцы ў талентах і літаратурных здольнасцях пераважнай большасці нашых паэтаў і пісьменнікаў (сталічных профі і правінцыйных аматараў) я, да прыкладу, амаль не адчуваю. Аднак вернемся да жыццёвага лёсу А. Матошкі.

Аграрная "сцязя" паступова вывела яго, маладога хлопца, на кіраўнічую сцежку... Ён быў абраны старшынёй Янкавіцкага сельскага Савета на Расоншчыне і працаваў на гэтай пасадзе ажно шаснаццаць гадоў. Авалодаўшы агранамічнай навукай і пастаянна будучы ў блізкім кантакце з простымі вясковымі людзьмі, А. Матошка як асоба афіцыйная не касцянеў і не звужваўся да кабінетнай працы, а набіраўся зямнога чалавечага вопыту ў варунках, якія патрабавалі як валявых рашэнняў, так і душэўнай спагадлівасці. Ён добра разумеў словы з вершаказа Алеся Разанава: *"Дробнае зробіца буйным, але застанецца дробным... (...) Буйнае зробіцца дробным і застанецца дробным... (...) Час перамен на дварэ, і яма вышэйшая за гару"*.

І, пэўна, неаднойчы разважаў ён пра важкасць кожнай, хай і малой, але добрай справы. У вясковай паўсядзённасці тое пастаянна адчуваецца. Адсюль і такія філасафічныя спробы выйсці з зацему на шырокі светлы прасцяг:

Вялікай дарозе — вялікая слава,
Ваколіц шляхі да сталіц нітаваць,
Дзяржаву павесці
сабой да дзяржавы...
Сцяжынцы малой
паміж купін блукаць.
.....
Мне дума заўсёды
прыходзіць паціху,
Калі я ідуу, не шкадуючы ног:
Без гэтых сцяжынак зазналі бы ліха
Дзесяткі і сотні шырокіх дарог.

Гэты паэтычны троп гаворыць нам і пра высокія мастацкія набыткі нашай літаратуры, якія наўрад ці былі б магчымыя без доўгай і цяглай працы яе шараговых ратнікаў, агульнымі намаганнямі якіх і ствараецца сучасны літаратурны працэс... Ды і свой паэтычны плён, я так думаю, недзе падсвядома А. Матошка таксама тут меў на ўвазе, не выпінаючы яго, як гэта сёння любяць некаторыя, навідавок...

У пяцідзесяцітрохгадовага Аляксандра Матошкі чацвёра дарослых дзяцей. Гаспадарка на плячах. Нядаўняя страта жонкі змушае яго зберагаць любоў і памяць...

Светлы воблік твой мне бачыцца
Ў лёгкай хустачцы між дрэў.
І спяваецца, і плачацца,
І ад суму сэрца мрэ.

За адно толькі спрадвечна-беларускае слова *"мрэ"* я не пашкадаваў бы для паэта прыметніка *таленавіты*. Не памірае яго сэрца, а замірае ў чаканні вялікага ўзрушэння, бо:

Яшчэ дыміць бацькоўскі комін,
Спявае певень у двары.
І люба ўсё і ўсё знаёма,
Хоць ты жыві, хоць ты памры!

Але ўжо згаданы вышэй разанаўскі "час перамен" нясе з сабой і вялікі смутак, і расчараванне, бо вёска пусцее на вачах, вымірае, — знікае з далягляду памяці яе светлы і святочны абрыс:

Мне б па вёсачцы гэтай прайсці,
Сенам колісь духмяным затрэсенай.
Толькі тут яе больш не знайсці —
Ветрам часу з зямлі яна знесена.
У самоце лугоў яркаквець,
Успаміны нязбыўныя веючы,
Прымушаюць душу анямець,
І наросхрыст стаяць, сірацеючы.

Калі казаць шчыра, то ў гэтым зборніку А. Матошкі няшмат вершаў, якія мяне ўразілі б па-сапраўднаму, але ёсць шэраг твораў, строф і асобных радкоў, якія супынялі беглы ход чытання, змушалі да роздуму, будзілі ў душы прыспаныя чалавечыя пачуцці (любові, радасці, крыўды і расчаравання). Ну вось хоць бы гэты вобраз нашай сучаснай рэчаіснасці:

Вось і ўсё.
Двор апошні спусцее:
То клады, а то дом-інтэрнат...
Па-над лугам туман сірацее,
Як дзіця, ля вярбовых прысад.

Без асаблівага жадання павучаць ці папікаць аўтара, а толькі з разлікам на тое, што зробленыя заўвагі ў далейшым будуць улічаныя, прывяду некалькі няўдалых версіфікацый. Скажам, пішучы пра цяжка-правіслыя над полем правады лініі электраперадач высокага напружання, Матошка ў паэтычным парыве неўсвядомлена павяртае тэхнічную эвалюцыю назад — ад электраэнергіі да звычайнага кола:

А вы пад чыісьцім наглядам
усё валачэце свой воз.

Альбо (сам аграном па адукацыі) Аляксандр піша, на імгненне затулены аўтарскай глухатой, на першы погляд, неаспрэчную спрадвечную тэзу:

І адчуваю, як з зямлі
Ўзыходзіць зерне каласамі.

Хіба з зямлі — і адразу каласамі, а не ўсходамі?! Не зусім ясным робяць вобраз памяці, заблытваючы яго ў чытацкіх вачах, "слязінка" і "расінка" і ў гэтых вось радках:

І памяць слязінкаю льецца,
На вейцы расінкай дрыжыць...

Не надта мілагучна выпісаны і вобраз нашай беларускай мовы:

Чуе вуха крывіцкія словы,
Што, як моцныя латы, звіняць.

Уносіць аўтар непаразуменне ў мой чытацкі *розум* і такім пасажам:

Душы прыдасца клёку.

Зрэшты, усё гэта "словы, словы, словы". І гэта папраўна. Самім жыццём і радкамі іншых паэтаў. А Аляксандру Матошку давайце пакінем сваё. Такім як ёсць. Зямлю, убачаную ягонымі вачыма, людзей ім знаных, іх будні, мроі і спадзяванні.

Усё — ад народзін
На гэтай зямлі:
І людзі, і травы, росы...
З паэтам я згодзен,
Сказаў ён калі,
Што нам яна
Дадзена лёсам.
Сыходзяць заўсёды
Навечна ў зямлю
І травы, і росы, і людзі...
Шкадую ўсё гэта
І шчыра люблю,
І хай яно вечна так будзе!

А калі мець на ўвазе канкрэтна паэзію, то не думаю, што А. Матошка бяссонна дбае пра гэты "німб" над галавой, без якога не могуць уявіць сваё жыццё тыя, хто, апроч "гульні ў слоўныя перліны", нічым іншым на гэтым свеце асабліва не пераймаюцца. Ім, вобразна кажучы, за шараговую версіфікацыю рукі б паадсякаць! А Матошку нельга — у яго рукі на шмат што яшчэ здольныя. Больш за тое, ён, у крайнім разе, як пісаў рускі класік, і "без слоў сказацца" можа:

Успомню шчырасць добрага стала,
На ім акраец хлеба на абрусе.
І на святло радзіннага жытла
Спяшаю і без слоў яму малюся.

ЛеГАЛ



Старэйшына літаратуразнаўства

7 лістапада на 97-ым годзе жыцця памёр акадэмік НАН Беларусі, замежны член Расійскай акадэміі адукацыі, доктар філалагічных навук, прафесар, член Саюза пісьменнікаў, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны Васіль Уладзіміравіч Івашын.

Буйны вучоны-гуманітарый і яркі, цікавы чалавек, ён нёс у сваёй асобе шматгранны і ў многім павучальны, жыццёвы і высокапрафесійны вопыт. В. У. Івашын нарадзіўся ў 1913 годзе і выхоўваўся ў сялянскай сям'і. У 1933 г. заканчвае Мінскі транспартна-эканамічны тэхнікум і год працуе тэхнікам-эканамістам. Скончыў Мінскі педагагічны інстытут, аспірантуру пры Акадэміі навук БССР, працаваў старшым навуковым супрацоўнікам, загадчыкам сектара ў Інстытуце літаратуры Акадэміі навук БССР. У 1967 — 1978 гг. — дырэктар НДІ педагогікі Міністэрства асветы БССР. З 1978 г. — старшы навуковы супрацоўнік-кансультант, а з 1995 г. — галоўны навуковы супрацоўнік Нацыянальнага інстытута адукацыі. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам Айчыннай вайны 2-ой ступені, Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР.

Займаючы кіруючыя пасады, В. У. Івашын імкнуўся і ўмеў спалучаць адміністрацыйную працу з творчай. Яго пяру належаць такія грунтоўныя манаграфіі, як "Янка Купала. Творчасць 1905 — 1907 гг. і развіццё беларускай літаратуры", "Да вышынь рэалізму", "З пазіцый гуманізму" і інш. Большасць з гэтых даследаванняў вытрымала выпрабаванне часам. Сумленнасць і высокі літаратурна-тэарэтычны прафесіяналізм надзейна засцерагалі даследчыка ад пагрозы трапіць у палон спрошчанасці і схематызму.

В. У. Івашын быў цвёрда перакананы, што чытача-вучня і чытача-студэнта трэба ўмела і прафесіянальна заахвочваць і далучаць да лепшых мастацкіх каштоўнасцей нацыянальнай і сусветнай культуры, бо менавіта на гэтай аснове найперш і магчыма выхаванне творча актыўнага, духоўна багатага, эстэтычна развітога чалавека-патрыёта, грамадзяніна, гуманіста.

На працягу многіх гадоў В. У. Івашын быў актыўным працаўніком на адукацыйна-педагагічнай ніве. На гэтай дзялянцы павінны працаваць, безумоўна, людзі з асабліва чуйным сэрцам, чыстым сумленнем і маштабным патэнцыялам ведаў. Як чалавек і вучоны, В. У. Івашын адпавядаў і гэтым высокім патрабаванням.

Чынны ўдзел прымаў акадэмік і ў стварэнні падручнікаў па беларускай літаратуры. Некаторыя з іх у добрым сэнсе гэтага слова можна назваць "доўгажыхарамі". На высокім узроўні аналітыкі і дэмакратызму мыслення выявіла сябе думка В.У.Івашына на шляху вызвалення школьных праграм і літаратуразнаўчых даследаванняў ад самых розных дэфармацый: празмернай палітызацыі і сацыялагізатарства літаратуры, скажэння самога разумення агульначалавечай прыроды мастацтва і яго эстэтычнай спецыфікі.

Акадэмік В. У. Івашын — аўтар чатырох паэтычных зборнікаў: "Слова", "Покліч памяці", "З надзеяй і верай", "Прызванне". Аднак і тут ён раскрываецца як цікавая, таленавітая і арыгінальная творчая асоба. Характэрным з'яўляецца ў гэтым сэнсе яго верш "Прыцягненне роднае зямлі", дзе аўтар у кантэксце сваіх разважанняў паўней і глыбей раскрывае падтэкставую думку верша пра тое, што мы, як самастойная нацыя і суверэнная краіна абавязаны свята захоўваць і засцерагаць сваю ўласную ментальнасць і закліканы ў той жа час самім гістарычным лёсам падтрымліваць, развіваць і расшыраць мнагавектарную і дружалюбную духоўную сувязь з усёй супольнасцю народаў і нацый.

Разнастайная, багатая на мудрую думку і сур'ёзную праблематыку праца акадэміка НАН Беларусі Васіля Івашына ў галіне крытыкі і літаратуразнаўства, мастацкай літаратуры і педагогікі мае трывалы запас навуковай, інтэлектуальнай і духоўна-маральнай энергіі. Верыцца, што памяць пра гэтага высакароднага, неардынарнага чалавека і глыбокага, фундаментальнага вучонага-гуманітарыя будзе доўгай і ўдзячнай.

Васіль ЖУРАЎЛЁЎ,
доктар філалагічных навук

Калектыў РВУ "Літаратура і Мастацтва" глыбока смуткуе з выпадку смерці вядомага пісьменніка-гумарыста Мікалая Пятровіча ВЯРШЫНІНА і выказвае шчырае спачуванне яго родным і блізкім.

Калектыў РВУ "Літаратура і Мастацтва" выказвае шчырыя спачуванні старшыні Беларускага фонду культуры Гілепу У. А. у сувязі з напаткаўшым яго горам — смерцю маці.

«Даруй, што варушу твой боль»

Друга самага лепшага
апускаючы ў жвір
Час пазначым. Праверым сябе.

Я. Янішчыц

Так, нам жыццё не адзін раз дае магчымасць праверыць сябе і ў свята, і ў будні на годнасць называцца чалавекам. Асабліва ў сумныя хвіліны — "апускаючы ў жвір" сябра. І не толькі. А ці робім мы гэта? Ці задумваемся над сваімі ўчынкамі і словамі? Жэня задумвалася і правярала сябе па тых, каго не стала. Можа быць, таму вершы-прысвячэнні ў яе атрымаліся такімі шчымлівымі, па-мастацку бездакорнымі. Напрыклад: "Ружы Купалы", "Салаўі. Памяці Лёні Якубовіча", "Памяці Ёзаса Янішчыца", "Рыгору Семашкевічу", "Затушуйце руку", "Памяці Еўдакіі Лось" і іншыя.

Добра ведала Жэня і цану сказанаму слову. Яна адчула на сабе ўсе адценні яго значэння, што па-мастацку вобразна, па-філасофску глыбока і эмацыянальна дакладна перадала ў вершы "Роздум над недасяжным словам":

Расло увысь і вырастала ўшыр.
Цвіло на вуснах. Тлела пад нагамі.
Не раз кідала з вышыні у вір
І пад вачмі сыходзіла кругамі.

Для паэта Яўгеніі Янішчыц, чалавека духоўнага і нераўнадушнага, іншага не было дадзена, чым наступнае:

Адно я знаю, што пустога слова
Не выцерпіць глыбінная душа.

Так атрымалася, што Жэню дакаралі пры жыцці і працягваюць дакараць цяпер за кнігі, адзначаныя прэміямі, якія, дарэчы, не прынеслі ёй ні асаблівага матэрыяльнага прыбытку, ні маральнага задавальнення.

Анатоль Казловіч у сваёй хроніцы "Беларусы паміж небам і зямлёй" у раздзеле "23. Жэня Янішчыц" знайшоў добрыя словы аб творчасці Жэні, але ж перакрэсліў усё, навесіўшы ёй ярлык "ущербной калины". Мяне растрывожыў гэты матэрыял пра Жэню, і ўжо некалькі гадоў не дае спакою, асабліва абразлівыя выказванні пра амерыканскі цыкл вершаў. Цытую: "Писатели, награждённые посещением ООН, по возвращении сочиняли очерки о стране "жёлтого дьявола". Подчиняясь выезднóму инструктажу, авторы отключали в себе зрение, слух, ум. Властвовали гордость, чванство, невежество. Американский стихотворный цикл Янищиц не был исключением. В Америке Женя увидела "золото и тлен", а вместо человека — "Каина как феномен прогрессивных перемен". В Вашингтоне заметила, как кружатся листья осени, но насладиться красотой не захотела, потому что красота была чужая, исходящая не от домашней берёзки. Американские стихи Женя включила в книгу "Пара любові і жалю" (1983), за неё получила Госпремию БССР. Советский патриотизм получил достойную оценку фарисейского государства. Пой, Женя, дальше..."

А цяпер звернемся да амерыканскага цыкла Яўгеніі Янішчыц з упомненай кнігі. Яна мае чатыры часткі. Усяго — 187 вершаў.

Зрэшты, калі нават пагадзіцца з А. Казловічам, што амерыканскі цыкл вершаў прасякнуты савецкім патрыятызмам, я не думаю, што камісія па прысуджэнні дзяржаўных прэмій кіравалася толькі ідэалогіяй. У кнізе шмат высокамастацкіх вершаў, якія маюць права на ганаровае месца не толькі ў беларускай, але і ў сусветнай літаратуры. Гэта "Роздум над недасяжным словам", "Нескарыстаны патрон", "Інтэлігенты ад зямлі", "Сынок і маці", "Добры вечар, землякі!", "Правяраючы час і сябе", "Прыгаршчы святла", "Баюся я няславыказаных слоў", "Дзе ты прапала", "Ты той, каго няма са мной", "Якая я?", "То цёмны бор, то рэдзенькі лясочак", "Дзе згубіліся Вы...", "Любоў мая", "Калі спяваць прытоміцца душа". Спіс можна працягваць, але ў мяне іншая мэта.

У Амерыку Я. Янішчыц як паэт "з сабой прывезла толькі ліру" і адчувала сябе пасланніцай сваёй краіны:

Светла міру
мне даваць прысягу.
Не бунтуй, шалёны акіян.
Я сама стаю, як дрэўка сцяга
Перад уваходам у ААН.

Дарэчы, А. Казловіч у гэты час знаходзіўся ў Англіі. Цікава, кім жа ён сябе адчуваў за межамі Радзімы? Зразумела, што задачы і адказнасць у іх былі не аднолькавыя. Фарысейства ўлады і Радзіма — паняцці таксама розныя. У Амерыцы Жэня ўбачыла не толькі "золата і тлен", але і "зоркі брацкіх абеліскаў", пачула "галасы жывых і мёртвых". А як жа іначай? Праблема міру востра стаяла ў пачатку 80-х гадоў XX стагоддзя (яна і сёння не страціла сваёй актуальнасці), таму прызыў паэта і маці: "Людзі свету, дайце згоды рукі // Перад уваходам у ААН!" быў нязмушаным і лагічным.

Тэму вайны і міру Я. Янішчыц працягвае ў вершы "Прагулка па Мэдзісон":

Між галубоў гуляюць дзеці
(Хай абміне іх горкі плач!).
О, страшна мне ўявіць, што ў свеце
Зямля ўзляціць, як лёгкі мяч.

Ёй цяжка паверыць тым, хто ўчыніў бесчалавечае злачынства ў Хірасіме і Нагасакі, хто вёў агрэсарскую вайну ў Індакітаі, не спыняў гонку ўзбраення:

У Амерыцы Жэня ўбачыла не толькі "золата і тлен", але і "зоркі брацкіх абеліскаў", пачула "галасы жывых і мёртвых". А як жа іначай? Праблема міру востра стаяла ў пачатку 80-х гадоў XX стагоддзя (яна і сёння не страціла сваёй актуальнасці), таму прызыў паэта і маці: "Людзі свету, дайце згоды рукі // Перад уваходам у ААН!" быў нязмушаным і лагічным.

Гляджу на ўдумны подзіў,
Адкрыты ўсім вятрам.
Але, мадам Бартольдзі,
Як мне паверыць Вам?

Жэня па сваёй сутнасці — чалавек прыроды, чалавек зямлі. Ёй і ў Мінску не заўсёды было ўтульна. Няцяжка ўявіць, як сябе магла адчуваць Я.Янішчыц у Вашынгтоне і Нью-Йорку. І яна шчыра прызнаецца:

О, рытмы краю, вас я не адразу
Успрымаю (ды — ці і магу ўспрыняць?)
...А вуліцы, адкрытыя, як язвы, —
Хоць і вітрыны золатам зіхцяць.

Цяжка Жэні было ў Амерыцы псіхалагічна, яна не адчувала сябе свабоднай. Добра ведала, што пільнае вока пэўных службаў сочыць за кожным крокам і кожным словам.

Амерыканскія службы таксама не спалі. Таму і пісала:

Акно маё прашчупвае лакатар
Чужога і нядрэмнага акна.

Таму і "Бяссоння ноч. Драбочак анальгіну. // Пражэктара іголка, як шпрыца". У Жэні вельмі нізкі "болевы парог", таму так тонка яна ўспрыняла ўсё, што адбывалася не толькі ў яе жыцці, але і ў свеце. Яна, можа, і хацела па-іншаму, але ў яе не атрымлівалася:

Я чорных слоў не маю на прыкмеце,
Запісвайце, лавіце тонкі нерв...
І ў неспакойным горадзе — і ў свеце! —
Спрабую напісаць спакойны верш.

Пачуцці эмігрантаў Жэня перадала праз прызму сваіх пачуццяў. Гэта добра бачыцца ў вершах "Разбітае сэрца ці скрыпка", "Ціхая песня". Апошні напісаны пад уплывам канцэрта эмігрантаў у Нью-Джэрсі:

Дыяменцікі глебы... — бы з сотаў
Мёд струменіць да донца каўша.
Эмігруе розум. І ўсё-такі
Застаецца балючай душа.

Жэня змагла ўбачыць вытокі гэтага болю:

Хто ж, душа, цябе так развярэдзіў?
А крынічка з-пад кораня б' е.

А. Казловіч папракае Я. Янішчыц за тое, што яна ў Амерыцы "насладиться красотой не захотела, потому что красота была чужая, исходящая не от домашней берёзки". Скажыце, калі ласка, у каго павінна была пытаць Я. Янішчыц — у Казловіча — як ёй успрымаць вашынгтонскую восень? Дарэчы, верш "Энергія апалага лістка" лічу адным з самых лепшых вершаў амерыканскага цыкла:

Як Вашынгтон мяняе пазалоту:
Сярэбрана-ружова-медны бляск!
...Няма маёй рабіны каля плота
Няма бярозкі зорнага святла!
Заманьвае вітрына лаўкі «Pizza».
І дождж паставіў дрэва парасон.
А дзе ж мая празрыстая крыніца?
Дзе ціхая мелодыя лясоў?

Прыгажосць вашынгтонскай восені Жэня бачыла, але сумавала па роднай прыродзе. Няўжо ў гэтым яе віна, шаноўны?

Гуляе дзіўны ліст па тратуары,
А нахіліцца не хачу я, не.
Няма маёй каліны светлатварай,
А значыць, тут яшчэ няма й мяне!

Жэня ніколі не пісала, каб дагадзіць уладам. Яна была паэтам сваёй краіны ў самым высокім сэнсе. Радзіма для яе, як і маці, адна. Многія вершы паэта не маюць тэрытарыяльных межаў, таму вечныя і належаць сусветнай літаратуры. Яны перакладаліся на рускую, балгарскую, польскую, англійскую, нямецкую і іспанскую мовы. І яшчэ, Жэня як паэт і чалавек заўсёды заставалася сама сабой. У вершы "Трывожным клінам позні вырай..." з чацвёртай часткі кнігі "Пара любові і жалю" яна і другіх заклікае:

"Не сотвори себе кумира":
Не бойся быць самім сабой.

Жэня не мае ніякага дачынення да «чванства и невежества». Гонар быў, і дзякуй Богу, што быў.

А. Казловіч паставіў Жэню ў адзін шэраг з "чирикающими птичками", якіх улада з ахвотай выпускала "на идеологические орбиты". Няўжо шаноўны спадар забыўся ці не ведаў, што ў гэтай "птички" да 1981 года былі ўжо чатыры кнігі глыбокай лірыкі, была паэма "Ягадны хутар", было тры жыццёвыя трагедыі (дачасная смерць бацькі, расстанне з мужам і аварыя ў Магілёве), якія не кожны мог перанесці з такой мужнасцю і зберагчы пры гэтым унутранае святло ў сабе і ў паэзіі.

Жэня ніколі не пісала, каб дагадзіць уладам. Яна была паэтам сваёй краіны ў самым высокім сэнсе. Радзіма для яе, як і маці, адна. Многія вершы паэта не маюць тэрытарыяльных межаў, таму вечныя і належаць сусветнай літаратуры. Яны перакладаліся на рускую, балгарскую, польскую, англійскую, нямецкую і іспанскую мовы. І яшчэ, Жэня як паэт і чалавек заўсёды заставалася сама сабой.

А. Казловіч, прачытаўшы «Роздум на Арлінгтонскіх могілках», вызначыў для сябе толькі другую страфу:

На мулкіх вулках выстылых ускраін
І ў цэнтры — тут, дзе золата і тлен,
Заросшы валасамі
ходзіць Каін —
Феномен прагрэсіўных перамен.

І чамусьці не звярнуў увагі на пятую страфу:

Мо лепей быць жалезным, чорным робатам,
Не ведаць праўды і не прагнуць крыл?
...Як лебедзь —
мармуровы крыж над Робертам.
Над Джонам — расстраляны небасхіл.

Трагедыя ў тым, што Жэня ведала гэтую праўду і ўсё ж прагнула крыл. Але, каб зразумець паэта Яўгенію Янішчыц і патрапіць у яе паэтычную танальнасць, трэба мець такі ж камертон душы.

Жэня вярнулася з Амерыкі і пазваніла мне. Радасці ў голасе я не пачула, хутчэй наадварот. На мае пытанні адказала, што раскажа ўсё пры сустрэчы. Такая магчымасць выпала тыдні праз тры. Ужо ў Мінску я пазваніла Жэні — тэлефон маўчаў. Праз некаторы час яшчэ і яшчэ набірала нумар, Але зноў — маўчанне. Уладзіўшы свае справы, я накіравалася на Ульянаўскую, 4. На званок у дзверы мне зноў ніхто не адказаў. Я напісала запіску і апусціла ў паштовую скрынку. У мяне былі для Жэні сувеніры. Я абышла дом вакол у надзеі знайсці адчыненай фортку. На маё шчасце такая аказалася на кухні. Я закінула пакецік з сувенірамі. З-за фіранкі выглянуў спалоханы твар Жэні. Убачыўшы мяне, яна абрадавалася, адчыніла: на стале ляжалі недапалкі ад цыгарэт. Заўважыўшы, куды скіраваны мой погляд, сказала: "Толькі нічога не гавары", — і пачала свой сумны аповед аб тым, як нялёгка было ёй у Амерыцы. Усе выступленні даваліся ў гатовым выглядзе, ад сябе яна не мела права сказаць ніводнага слова. Уразілі яе і амерыканскія бамжы (сваіх навідавоку яшчэ не было), якія спалі на вуліцах і капаліся ў сметніках. Падзейнічала на яе, канечне, і выязная працэдура, пра якую пісаў А. Казловіч, і пра якую я таксама ведаю. Але і гэта было не ўсё. Жэня мне паведала аб тым, як яе "выпрабоўвалі" ў Амерыцы. Аднойчы ў нумар гасцініцы зайшоў незнаёмы чалавек, мужчына, і папрасіў перадаць на Радзіме долары па адрасе, які быў пазначаны на канверце. Яго прыход і просьба былі такімі імгненнымі і нечаканымі, што Жэня не паспела нават апомніцца, як візіцёр паклаў канверт і знік, пакінуўшы Жэню ў разгубленасці і страху. Каб везці ў Саюз гэтыя долары, Жэня не дапускала і думкі. Яна была ўпэўнена, што ў нумары ёсць камеры і праслушнікі, чаго баялася больш за ўсё. Расказаць каму-небудзь яна таксама не асмелілася. Таму канверт з доларамі парвала на дробныя шматкі, не прачытаўшы адраса і не палічыўшы грошы, і спусціла ва унітаз. Магчыма, гэтая сітуацыя пралье свет на душэўны стан Я. Янішчыц у Амерыцы і пасля Амерыкі, а таксама на вершы, якія не змог зразумець А. Казловіч.

"Зводдаль" ясней бачыцца тое, чым чалавек даражыць:

І ў цішыні, што дыхнула марозна,
Скрозь ледзяную, празяблую сінь —
Свеціцца кожная сынава слёзка,
Луг журавінавы, ў полі — бярозка,
Ціхая, ў чорнай хусцінцы — Хатынь.

Такія думкі для Жэні былі натуральнымі, таму што:

Да чужога не звыкліся вочы,
Сэрца цепліць гаючы ўспамін.
Можа, свет перамеціца тройчы —
Келіх роднага неба адзін!

Жэня была чалавекам закрытым, тонкім і далікатным у адносінах з людзьмі. Яна даверала сваёй інтуіцыі. Яшчэ не бачыўшы Амерыкі, Жэня прызнавалася: «душа прымоўкла на трывожнай ноце». Прадбачачы папрокі з боку творцаў па пяру, Я.Янішчыц амерыканскі цыкл адкрывае вершам "Лячу у найсучасным самалёце":

Лячу у найсучасным самалёце,
Дачка любові, жалю і святла.
Нясуць тугія крылы у палёце
У край, дзе я ніколі не была.

І пэўна ж, нехта здзівіцца маркоце,
І за маркоту стане дакараць.

Жэня тлумачыць, чаму яна маркоціцца:

А я зжылася з ластаўкай на дроце,
Са сцежкай,
што лягла праз сенажаць.
А я зжылася з тым, чаго чакаю,
Пра што вядома спорнаму пяру.
...І цяжка небу крылы давяраю.
...І лёгка я
з зямлёю гавару.

У амерыканскі цыкл увайшло чатыры вершы-прысвячэнні: "Мэрлін Манро", "Эн Сэкстан", "Эрнэст Хемінгуэй", "Мальба Дункан, ці Сяргей Ясенін у Амерыцы". У апошнім ярка адчуваецца душэўная роднасць аўтара з паэтам С. Ясеніным. Усе вершы-прысвячэнні Я. Янішчыц уваходзяць у паэтычную скарбонку. Лёс кожнага, каму Жэня іх адрасавала, хваляваў яе і меў адпаведнае ўздзеянне на яе думкі, паэзію і ўвогуле жыццё. Спыніцца хачу на адным — "Эн Сэкстан". У вершы столькі перажыванняў і болю самой Янішчыц, што многія радкі сёння ўспрымаюцца як тлумачэнне яе апошняга палёту. Тут лёсы паэтаў пераплятаюцца. Радкі: "Паэт з'яўляецца на свет, // Як ластаўка, як выстрал!" гучаць афарызмам і ў аднолькавай меры адносяцца як да Эн Сэкстан, так і да Янішчыц. Жэня "адчула гнеў" гордай Эн Сэкстан, "зразумела адчай" трывожнай Эн Сэкстан. Заканчвае верш страфой:

Не ў самагубстве сілы соль,
Хоць ёсць тут знак пратэста.
Даруй, што варушу твой боль,
Спакойная Эн Сэкстан.

Сапраўды, "даруй, што варушу твой боль", шчымлівая Жэня Янішчыц.

Тамара АЎСЯННІКАВА

Орша — гэта Уладзімір Караткевіч. Менавіта ён у XX стагоддзі прынёс вядомасць гораду. І сёння тут ледзь не кожная вулачка прасякнута любоўю да вядомага земляка. Але ёсць і яшчэ адзін горад, які ў жыцці Уладзіміра Сямёнавіча быў не менш важным. Гэта Рагачоў. Наведаўшы абодва гарады, быў здзіўлены кантрастам, які пануе ва ўшанаванні Караткевіча.

Пад знакам Уладзіміра Караткевіча

Музей-радзільня

Пачынаць знаёмства з караткевічаўскай Оршай трэба з музея пісьменніка. Гэты двухпавярховы будынак — былы раддом. Менавіта тут 26 лістапада 1930 года на свет і з'явіўся хлопчык Уладзімір. І цяпер у памяшканні радзільні размяшчаецца адна з экспазіцыйных залаў. Калі вы не пазбаўлены фантазіі, то паспрабуйце затаіцца на хвіліну і ўявіць той лістападаўскі дзень. Мо нават пачуеце крык немаўляці, якому наканавана было сваімі творамі адкрыць Беларусь для беларусаў.

Музей Уладзіміра Караткевіча прасторны. Тут узноўлены яго працоўны кабінет, з рэчамі з мінскай кватэры. Нават помнікі пісьменніку ёсць. Толькі, праўда, невялікіх памераў. Асобны пакой прысвечаны Караткевічу ў кіно і тэатры. Дэкарацыі, касцюмы, афішы, фотаздымкі...

Вуліца Савецкіх касманаўтаў

На вуліцы Караткевіча захаваўся дом, у якім пісьменнік жыў. Пра гэта сведчыць і адпаведная шыльда. У двары, побач з хатай, стаіць невялікі хлявок. Яго падстрэшша і стала першым працоўным кабінетам для Уладзіміра Сямёнавіча. Менавіта на гэтым падстрэшшы ён і напісаў першы варыянт "Дзікага палявання караля Стаха". Было тое ў 1950 годзе, пасля сканчэння першага курса філалагічнага факультэта Кіеўскага універсітэта імя Тараса Шаўчэнкі. А ўжо праз год у аршанскай раёнцы "Ленінскі прызыў" былі надрукаваны вершы "Здесь будет канал" і "Якубу Коласу". Так пачыналася літаратурнае жыццё маладога таленту.

Цікавая гісторыя існуе наконт надання вуліцы імя пісьменніка. Раней яна насіла назву Савецкіх касманаўтаў. І калі ў 1980-х гадах грамадскасць звярнулася з ініцыятывай перайменавання да мясцовага начальства, то атрымала адмову. А на пытанне: "Ці бывалі савецкія касманаўты ў Оршы?" ім адказалі — "Яны над Оршай праляталі". Пазней вуліца ў гонар пісьменніка ўсё роўна з'явілася.

Яшчэ адзін адрас, звязаны з Уладзімірам Караткевічам, — парк. Тут знаходзіцца помнік яму. Ужо большы, чым у музеі.

У сярэдняй школе № 3 пад музей земляка-літаратара адведзены асобны пакой. Наведаць яго, на жаль, не атрымалася — знаходзіцца на рамонце. Але музейшчыкі запэўніваюць, што прыехаць пасля адкрыцця сюды абавязкова трэба. Бо і там вітае дух Уладзіміра Сямёнавіча. У гэтай школе, між іншым, ён і вучыўся.

Аршанцы шануюць слыннага ўраджэнца іх роднага горада. І памятаюць яго пранікнёныя радкі:

...Як толькі цёмнаю ноччу
Вочы свае закрываю,
Адразу я Оршу бачу
З яе няяркай красой,
З бярозамі над Аршыцай,
З вясёлым сонейкам мая,
З блакітам першых пралесак
У косах каханай маёй.

Зямля дзядоў

У Рагачове Уладзімір Караткевіч напісаў "Сівую легенду", "Зямлю дзядоў", "Ладдзю роспачы". Горад, якому належаў Караткевіч, сёння забываецца на пісьменніка. Няма тут вуліцы яго імя. Захаваўся дом, у якім ён працаваў над сваімі кнігамі, але няма на доме ніякага мемарыяльнага знака. Нават у мясцовым музеі стэнды, прысвечаныя Уладзіміру Караткевічу, туляцца ў невялічкім пакойчыку побач са стэндамі іншых літаратараў...

Не кожны аматар дэтэктываў Уладзіміра Караткевіча і ведае, што яго радзіна па лініі маці паходзіць з Рагачова. На мясцовых могілках захавалася магіла бабулі пісьменніка. Самі вы тое пахаванне ніколі не знойдзеце. Бо няма на ім ніякай шыльды, нават імя чалавека не падпісана, які тут спачывае. Вінавата ва ўсім наша абыякавасць да памяці продкаў. Мінскі журналіст Глеб Лабадзенка пачаў збор сродкаў для ўпарадкавання магілы. Спадзяёмся, прыватную ініцыятыву падтрымае і мясцовае кіраўніцтва. Надта хацелася б у тое верыць.

У рамане "Нельга забыць" пісьменнік апісаў забойства паўстанцкага камандзіра ў Рагачове. Менавіта каля могілак, як сведчаць краязнаўцы, паўстанцкі атрад пад кіраўніцтвам Томаша Грыневіча быў расстраляны царскімі вайскоўцамі. Пасля з'яўлення рамана адшукаліся дакументы, якія пацвярджаюць сваяцтва Томаша Грыневіча з пісьменнікам.

Тут павінен быць музей

Замкавая гара ў Рагачове. У XVI стагоддзі тут быў пабудаваны замак, які мясцовыя музейшчыкі называюць замкам каралевы Боны. Гэтае месца натхніла пісьменніка на напісанне "Ладдзі роспачы". Усе падзеі з твора адбываліся менавіта на гэтай гары.

Што сабой уяўляе найбольшую цікавасць у Рагачове, дык гэта дом, у якім працаваў пісьменнік. Знаходзіцца ён на вуліцы Чкалава. Дом быў пабудаваны дзедам пісьменніка ў 1914 годзе. Сёння ў ім жыве стрыечны брат Сяргей з сям'ёй. Ён не ахвочы паказваць гасцям братаў пакой. Жонка гаспадара Тамара аказваецца больш гасціннай.

У пакоі, дзе некалі пісаў Караткевіч, захаваўся стол, за якім Уладзімір Сямёнавіч працаваў і над "Каласамі пад сярпом тваім". Тут было б варта зрабіць музей пісьменніка. Але на гэта не ідзе гаспадар. Узамен сям'і прапаноўвалі кватэру з усімі выгодамі. Але ці параўнаецца тая "каробка" са сваёй хатай? Мо ўдасца рагачоўскім урадам падшукаць раўнапраўную замену.

На наступны год ля дома запланавана паставіць памятную шыльду.

Груша над абрывам

"Груша цвіла апошні год.

Усе галіны яе, усе вялікія расохі, да апошняга пруціка, былі ўсыпаны бурным бела-ружовым цветам. Яна кіпела, млела і раскашавалася ў пчаліным звоне, цягнула да сонца сталыя лапы і распасцірала ў яго ззянні маленькія, кволыя пальцы новых парасткаў..." Гэта радкі з рамана "Каласы пад сярпом тваім". На беразе Дняпра каля вёскі Азярышча знаходзіцца месца, дзе пісьменнік убачыў тую грушу. Дрэва, праўда, ужо няма. Падкасіў падмыты бераг. Знаёмая журналістка, з якой разам наведвалі тое месца, заўважыла, што яна тут не змагла пісаць ці хаця б натхняцца. Маўляў, боязь сарвацца ўніз з абрыва адштурхоўвае іншыя думкі. Але гэта надае месцу толькі адметнасць. Тут надта прыгожа.

Ці ёсць сэнс адзначаць гэтае караткевічаўскае месца памятным знакам? Дастаткова яго ўнесці на турыстычныя карты і ўключыць у турыстычныя маршруты. Хаця камень з адпаведным надпісам мо і не пашкодзіў.

У 2010 годзе Беларусь будзе адзначаць юбілей Уладзіміра Караткевіча. У Кіеве да гэтай даты павінен паўстаць помнік беларускаму пісьменніку. Паўстане помнік і ў Мінску. Няхай бы тады працягам святкавання стала і з'яўленне, калі не вялікага манумента, то хаця б бюста пісьменніку ў Рагачове. Пакуль не атрымліваецца мемарыялізаваць пакой у доме, дзе ён жыў, то, можа, у краязнаўчым музеі з'явіцца асобны пакой, у якім размясцілася б экспазіцыя, прысвечаная Уладзіміру Караткевічу? І, зразумела, вуліца Чкалава мусіць насіць імя пісьменніка.

Сяргей МАКАРЭВІЧ

На здымках: узноўлены кабінет пісьменніка ў аршанскім музеі У. Караткевіча; дом, у якім жыў Караткевіч у Оршы; магіла бабулі Караткевіча ў Рагачове.

Фота аўтара

У наступным нумары «ЛіМа»

Чытайце справаздачу з "круглага стала" на тэму "Роля крытыкі ў сучасным літаратурным працэсе". У зацікаўленай гутарцы па надзённых праблемах літаратуры ўдзельнічаюць супрацоўнікі аддзела крытыкі штотыднёвіка "ЛіМ" Л. Галубовіч, І. Шаўлякова, Л. Алейнік, а таксама галоўны рэдактар часопіса "Маладосць" Р. Баравікова і старшыня секцыі прозы СПБ Я. Конеў.

З глыбінкі

Вось вяселле дык вяселле!

У рамках абрадавага кірмашу "З рога ўсяго многа", які праходзіў у Лельчыцкім раёне, у Сінпольскім сельскім клубе была паказана частка вясельнага абраду.

Дзейства разгарнулася ў памяшканні, якое было пераўтворана ў вясковую хату. Кідаліся ў вочы руская печ, ложак, убраны вышытымі падузорнікамі і накідкамі, на якіх вадзілі карагоды валошкі, ружы і іншыя кветкі. Ды і навокал было шмат прыгажосці: вышытыя карціны з разнастайнымі сюжэтамі, тканыя ручнікі, пакрывалы, коўдры ды іншае. А на сцяне ікона — абавязковы атрыбут вясковых хат.

Госці завіталі ў дом маладой. Быў прадэманстраваны крок за крокам першы дзень вяселля. А пачалося — з чакання і прыезду сватоў. Вось момант, калі дзяўчыны-сяброўкі ўбіралі, прыхарошвалі нявесту і апраналі ёй вэлюм. А як цікава прайшоў выкуп "елкі"! Чаго толькі не прапанавалі пры гэтым сваты — сваякі і сябры маладога! А нявесту, як і ў былыя часы, выводзіў да гасцей з суседняга пакоя родны брат, ён жа заводзіў яе за стол і спачатку сядзеў побач. Пры сустрэчы на парозе дома маладой свахі павінны былі знесці свечкі. І гэты рытуал вясельнага абраду таксама быў паказаны.

Нельга не сказаць і аб тым, што самадзейныя артысты, а гэта работнікі лясніцтва, агра-прамысловага комплексу, настаўнікі і вучні мясцовай школы, вельмі артыстычна выконвалі свае ролі. Прычым, усе былі ў касцюмах, вышытых мясцовымі рукадзельніцамі з вялікім густам. На працягу вясельнага абраду гучалі народныя песні ў цудоўным выкананні ўдзельнікаў вакальнага ансамбля "Снічаначка".

Па словах загадчыцы Сінпольскім сельскім клубам Надзеі Івашкевіч, вялікую дапамогу ў падрыхтоўцы і правядзенні абрадаў, а таксама іншых мерапрыемстваў, заўсёды аказвае мясцовая жыхарка Валянціна Паўлаўна Шукаловіч. Гэта жанчына — актыўная ўдзельніца мастацкай самадзейнасці, рукадзельніца, ведае шмат розных звычаяў і абрадаў, песень і прыпевак, сама піша вершы. Яе, вобразна кажучы, можна назваць сапраўднай хадзячай энцыклапедыяй тутэйшага фальклору.

Святлана ЛІПСКАЯ

ЛіМ

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Алесь КАРЛЮКЕВІЧ

Рэдакцыйная калегія:

Анатоль Акушэвіч
Лілія Ананіч
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Святлана Берасцень
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Уладзімір Дуктаў
Анатоль Жук
Вольга Казлова
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Мікола Станкевіч
(намеснік галоўнага рэдактара)
Юрый Цвяткоў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19

Тэлефоны:
галоўны рэдактар, намеснік — 284-66-73

Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі — 284-44-04
мастацтва — 284-82-04
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: lim_new@mail.ru

Адрас у Інтэрнэце: www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку" г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3009
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 19.11.2009 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 7
Заказ — 6286

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686